ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№09 (1044), ВЕРАСЕНЬ, 2020
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка. Эканоміка. Культура

ISSN 0320-7544




Міхаіл Карпечанка, галоўны рэдактар Бялыніцкай газеты «Зара над Друццю»

# ГОНАР СЛОВУ, ПАВАГА КНІЗЕ, ВЕДЫ — УСІМ!

ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАННЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» — НА САЙЦЕ ZVIAZDA.BY

## Газета для суайчыннікаў, якую ведаюць і чытаюць па ўсім свеце



# ЗМЕСТ




БЕЛТА

**3** **Узаемадзеянне будзе доўжыцца**

Стан і перспектывы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва, тэматыку саюзных адносін, міжнародную праблематыку і сітуацыю ў рэгіёне, а таксама пытанні сумеснага рэагавання на ўзнікаючыя выклікі абмеркавалі на нядаўняй сустрэчы ў Сочы Аляксандар Лукашэнка і Уладзімір Пуцін




БЕЛТА

**10** **Дарожная карта для навукоўцаў**

Сучасны свет уступіў у эпоху імклівых інавацыйных перамен. Трансфармацыі ва ўсіх сферах эканомікі патрабуюць ад навукі актыўнага пошуку, прарыўных ідэй і хуткай матэрыялізацыі задумі

**12** «**Святло стваральнага пісьменства…»**

У пярэдадзень XXVII Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах Міністр інфармацыі Беларусі Ігар Луцкі адказаў нашаму карэспандэнту на некалькі пытанняў

**20** **«Тут усё аказалася на вышыні»**

Як беларускія неўролагі ратуюць жыцці ў самых няпростых выпадках

**23** **Дом «электрычнага чалавека»**

Маляўнічыя руіны на беразе Нёмана, за восемдзясят кіламетраў ад Мінска, — родавы маёнтак беларускага вучонага Якуба Наркевіча-Ёдкі, чые даследаванні апярэдзілі свой час. Папулярнасць прафесара Наркевіча-Ёдкі ў навуковых колах сучаснікі параўноўвалі з папулярнасцю Луі Пастэра, а значнасць яго доследаў — з навуковым значэннем адкрыццяў Вільгельма Рэнтгена

**29** **Жыццё без ліміта**

Калі зазірнуць у сябе, разумееш: так, усе мы родам з дзяцінства. Часам крыўдлівыя больш меры, часам не лагічна ўпартыя, наваг зайздросныя... Тым не менш, мы — жыццёвы прыклад для нашых дзяцей




SB.BY

**Беларусь. Belarus**

Грамадска-палітычны часопіс

**№ 09 (1044), верасень, 2020**
Выдаецца з 1930 года.
Адноўлены ў 1944 годзе.

**Заснавальнік:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

**Галоўны рэдактар**
Харкоў Віктар Міхайлавіч

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Б. Хмяльніцкага, 10а,
г. Мінск, Беларусь, 220013.
Тэл.: +375 (17) 287-19-19,
+375 (17) 292-66-92.
Тэл./факс: +375 (17) 287-15-26.

**www.zviazda.by**
**E-mail:** belarus.mag@mail.ru

**Падпісны індэкс** — 74820.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 8, выдадзена 16.07.2018 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Дызайн і вёрстка:**
Таццяна Старажэнка
Любоў Малышава

**Карэктар:**
Аліса Гюнгер

**«Беларусь.Belarus»** выходзіць на беларускай, англійскай і кітайскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **«Беларусь. Belarus»** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

Падпісана да друку 22.09.2020.
Фармат 60x84 ⅛.
Афсетны друк.
Папера крэйдаваная.
Ум.-друк. арк. 6,51
Ул.-выд. арк. 7,96

Агульны наклад — 1622 асобнікаў (на беларускай мове — 427).

**Заказ**

Друкарня:
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «БудМедыяПраект»
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014,
вул. В. Харужай, 13/61, Мінск,
Рэспубліка Беларусь, 220123.

© Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"», 2020

*На першай старонцы вокладкі фота sb.by*

# ЯШЧЭ Ў НУМАРЫ





**32 Парадак. Бяспека. Добрыя людзі...**

Былы масквіч, выпускнік МДІМА, кандыдат сельскагаспадарчых навук і па складзе розуму сістэмны аналітык Уладзімір Патакаў год таму пераехаў на сталае жыхарства ў Мінск. Не адзін — разам са сваёй шматдзетнай сям'ёй. Як жывецца грамадзянам Расіі ў Беларусі?




SB.BY

**38 Мітрапаліт Алма-Ацінскі і Казахстанскі Іосіф нарадзіўся ў Магілёве**

Магчыма, і сённяшнія пакаленні беларусаў ці казахаў, увогуле жыхароў постсавецкіх краін, памятаюць такую фразу, якую сказаў адзін з праваслаўных святароў: «Юрый Гагарын у космас лятаў і Бога не бачыў... А Бог яго бачыў! І блаславіў!..» Магчыма, гэта адбылося на службе ў праваслаўнай царкве, а словы належаць архіепіскапу Іосіфу (Чарнову Івану Міхайлавічу). Такое вось судакрананне веры і новых касмічных прастораў!..

**46 Малая радзіма**

Камедыя Аляксея Дударава ў дзвюх дзеях. Заканчэнне

**49 Свята народнае, свята з душой**

Звыш 3 000 удзельнікаў і больш за 20 000 гасцей з Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы сабралася на V Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельшчыны





ВЕНІЯМІН МІХЕЕЎ

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ БУДЗЕ ДОЎЖЫЦЦА

**Стан і перспектывы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва, тэматыку саюзных адносін, міжнародную праблематыку і сітуацыю ў рэгіёне, а таксама пытанні сумеснага рэагавання на ўзнікаючыя выклікі абмеркавалі на нядаўняй сустрэчы ў Сочы Аляксандар Лукашэнка і Уладзімір Пуцін**

## У межах саюзніцкіх адносін

Як падкрэслівалася пазней паводле розных крыніц інфармацыі, у самым пачатку размовы Прэзідэнтаў Беларусі і Расіі на сустрэчы ў Сочы Аляксандар Лукашэнка выказаў расійскаму калегу словы падзякі за падтрымку ў поствыбарчы перыяд:

— Вы паступілі вельмі прыстойна, па-чалавечы. Таму я асабіста вам дзякую і ўсім тым расіянам, хто спрычыніўся да таго, каб падтрымаць нас у гэты поствыбарчы час.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ў сваім уступным слове расійскі лідар адкрыта і досыць поўна закрануў усе важныя пытанні сустрэчы:

— Гэта правільна. Таму што як ніколі раней, у сілу пэўных абставін, я вельмі старанна адсочваю цяпер публікацыі ў розных СМІ: столькі канспіралагічнага было напярэдадні нашай сустрэчы… Усё, што вы сказалі, вельмі важна. І яно, увогуле, адказвае на тыя выклікі і настроі ў СМІ.

Аляксандр Лукашэнка падрабязна праінфармаваў Уладзіміра Пуціна аб тым, што адбывалася:

— Яно, вядома, не так бачыцца на самой справе, як гэта дэманструюць у СМІ. Вы — чалавек дасведчаны, не горш за мяне ведаеце, як можна паказаць, распавесці і гэтак далей. І потым, у наш час інфармацыйных супрацьстаянняў і войнаў вы ведаеце, як гэта падаецца.

Прэзідэнт нагадаў вядомае выказванне аб тым, што сябар пазнаецца ў бядзе:

— Я гэта шчыра кажу. Гэта нам урок — не толькі Беларусі і Расіі, але і нашым постсавецкім рэспублікам. Аб гэтым мы будзем яшчэ гаварыць на сустрэчы ЕАЭС, АДКБ, так і ў рамках СНД ёсць аб чым пагаварыць. Думаю, вам цікавая будзе мая заява ў гэтых структурах… Як мы з вамі па тэлефоне размаўлялі яшчэ на ў пачатку гэтых падзей у Беларусі, што трэба здабываць урокі з усіх падзей. І для нас таксама вельмі сур’ёзны ўрок, які мы з вамі, спадзяюся, вытрымалі.

У далейшым у ходзе гутаркі Аляксандр Лукашэнка не аднойчы засяроджваў увагу на важнасці разумнага ўзаемадзеяння. Ён, у прыватнасці, адзначыў:

— Мы сапраўды па дамове АДКБ ішлі роўна, і, улічваючы адносіны паміж брацкімі народамі, фактычна адным народам, мы так і паступілі. Не ваявалі, не стралялі, не кідаліся

*Нашы дзяржавы і нашы народы заўсёды будуць сяброўскімі*




нават палкамі. Але прадэманстравалі сваю рашучасць. Што калі там, за межамі, камусьці хочацца пачасаць рукі, мы можам пачасаць у любы момант. І што мне вельмі прыемна, я вам вельмі за гэта ўдзячны, — вы прадэманстравалі, што беларускія межы — гэта межы Саюзнай дзяржавы. І нікому не дазволена бразгаць там зброяй.

Прэзідэнт Беларусі таксама падкрэсліваў тую акалічнасць, што пры стварэнні і развіцці дамовы аб Саюзнай дзяржаве бакі ішлі планамерна, паступова.

— Нашы дзяржавы і нашы народы заўсёды будуць сяброўскімі, — заўважыў Кіраўнік беларускай дзяржавы.

## Важныя акцэнты

Аляксандр Лукашэнка таксама пацвердзіў непахіснасць беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы:

— Па абароне мы заўсёды прытрымліваліся з вамі, як людзі ваенныя, адной тактыкі. Я, можа быць, груба сказаў нядаўна расійскім журналістам: сабачыцца мы можам па любых пытаннях, спрачацца і гэтак далей, але абарона і бяспека ў нас ніколі не выклікала ніякіх спрэчак і сумненняў. Мы ні ў каго не павінны пытацца, праводзіць ці не праводзіць у нас вучэнні. Мы праводзілі і будзем праводзіць. Хто хоча, хай далучаецца да гэтых вучэнняў, хто не хоча — хай не робіць гэтага. Я думаю, што, Уладзімір Уладзіміравіч, вы дасце каманду Міністру абароны Расіі, а наш Міністр ужо атрымаў такую каманду: мы спрануем на гады наперад гэтыя вучэнні, будзем іх канкрэтызаваць. І малыя, і вялікія вучэнні мы павінны праводзіць разам.

У сувязі з гэтым Кіраўнік дзяржавы зрабіў акцэнт на адным з урокаў сітуацыі ў Беларусі і вакол яе:

— Ну навошта лязгаць гусеніцамі ля межаў Саюзнай дзяржавы і Беларусі (гаворка аб ваенных манеўрах заходніх краін і НАТА. — **Аўт.**). Складаны перыяд, ну пацярпіце!

Аляксандр Лукашэнка казаў аб перакідцы на палігон Пабрадзе ў Літве ў 15 кіламетрах ад дзяржаўнай мяжы амерыканскага танкавага батальёна:

— Навошта гэта рабіць? Таму нам трэба не дапусціць памылак Вялікай Айчыннай вайны, калі ўсе уціхамірвалі, што правакацый не дапусцяць, вайны не будзе і іншае… І мы апынуліся ў пабітага карыта. Савецкая армія была, а прайшлі (нямецка-фашысцкія войскі. — **Аўт.**) Беларусь — нават практычна не паспелі сабрацца і супраціўляцца. Гналі нас ажно да Смаленска, і толькі там змаглі неяк супрацьстаяць гэтаму.

Прэзідэнт Беларусі цвёрда перакананы:

— Ні ў якім выпадку нельга азірацца на тое, што нам скажуць. Яны з намі не лічацца. Яны не глядзяць на нашы насцярожанасці, праводзяць вучэнні тады, калі хочуць. Таму мы таксама, калі вы падтрымаеце гэты тэзіс, не напружваючы абстаноўку вакол, будзем рыхтаваць свае арміі, каб калі, не дай бог, можна было гэтаму супрацьстаяць…

Вось як адрэагаваў прэзідэнт Расіі на гэтыя словы:

— Што тычыцца ваеннага складніка, вы добра ведаеце, у нас ёсць план. Ён будзе рэалізаваны. На працягу года ў нас і на тэрыторыі Беларусі, і на тэрыторыі Расіі практычна кожны месяц прадугледжаны нейкія мерапрыемствы. Як планавалі раней, так і будзем рабіць.

Дарэчы, у сваім уступным слове на пачатку перамоў Уладзімір Пуцін казаў пра неабходнасць працягваць узаемадзеянне Расіі і Беларусі ў абароннай сферы.

— Я маю на ўвазе перш за ўсё абаронныя прадпрыемствы. Тут у нас таксама вялікая кааперацыя, прычым у досыць адчувальных абласцях.

Што тычыцца непасрэдна ваеннай сферы, то Уладзімір Пуцін не прамінуў нагадаць пра тое, што менавіта ў дзень сочынскіх перамоў пачыналіся запланаваныя яшчэ ў мінулым годзе ваенныя вучэнні, якія павінны былі доўжыцца некалькі дзён:

БЕЛТА



*Мы дамовіліся аб тым, што Расія прадаставіць Беларусі ў гэты складаны момант дзяржаўны крэдыт ў 1,5 мільярда. І мы гэта выканаем.*

— Для ваенных людзей гэта ў вядомай ступені руцінная справа, яна звязаная з падрыхтоўкай войскаў. Паўтараю яшчэ раз, каб не было ніякіх спекуляцый: гэта мерапрыемства, якое было запланавана і нават анансавана яшчэ ў 2019 годзе. Пасля выканання праграмы сумесных вучэнняў расійскія падраздзяленні вернуцца да сваіх месцаў пастаяннай дыслакацыі.

## Дамоўленасці павінны выконвацца

Уладзімір Пуцін пацвердзіў на сустрэчы ў Сочы, што Расія разглядае Беларусь як бліжэйшага саюзніка і выканае ўсе ўзятыя на сябе абавязацельствы. Ён запэўніў беларускага калегу:

— Расія застаецца прыхільнай усім нашым дамоўленасцям, уключаючы тыя, што вынікаюць з Дагавора аб Саюзнай дзяржаве, АДКБ. Мы разглядаем Беларусь як нашага найбліжэйшага саюзніка і, безумоўна, як я ўжо вам казаў неаднаразова ў тэлефонных размовах, выканаем усе ўзятыя намі на сябе абавязацельствы.

Пры гэтым Уладзімір Пуцін адзначыў, што адпаведныя абавязацельствы былі ўзятыя краінамі ўзаемна і гэта адбылося яшчэ да яго прэзідэнцтва:

— Але гэта не мае значэння. Мае значэнне тое, што дзяржава Расія ўзяла на сябе пэўныя абавязацельствы. І незалежна ад таго, хто знаходзіцца ва ўладзе ў дадзены момант часу, краіна павінна гэтыя абавязацельствы выконваць. Мы неаднаразова заяўлялі, што мы так і будзем паступаць.

## Акрэслены новыя планы

На сустрэчы ў Сочы шмат гаварылася адносна развіцця эканамічнага ўзаемадзеяння дзвюх краін. Уладзімір Пуцін падчас перамоў зрабіў акцэнт на неабходнасці аднаўлення дакрызіснага ўзроўню таваразвароту. Ён звярнуў увагу, што Расія застаецца самым буйным інвестарам у беларускую эканоміку, і прывёў у прыклад шматмільярдны праект па будаўніцтве БелАЭС. Сапраўды, на Расійскую Федэрацыю прыпадае каля паловы знешнегандлёвага абароту Беларусі, у краіне працуе шмат прадпрыемстваў з расійскім капіталам. У сувязі з чым Кіраўнік расійскай дзяржавы заявіў:

— У нас вельмі ўстойлівая і глыбокая кааперацыя па цэлым шэрагу напрамкаў і галін. Каранавірус, на жаль, паўплываў на наш гандлёвы абарот у бок паніжэння ўзроўню. Гэта натуральна, так ва ўсім свеце адбываецца. У гэтай сувязі, я мяркую, нам трэба распачаць дадатковыя намаганні, каб не толькі аднавіць ранейшы дакрызісны ўзровень таваразвароту і эканамічных адносін, але і стварыць перадумовы для руху наперад.

Нездарма Прэзідэнт Расіі прапанаваў падчас перамоў засяродзіць на гэтым увагу:

— У мяне ёсць пэўныя прапановы. Мне здаецца, трэба і на ўзроўні ўрадаў, міністэрстваў, ведамстваў, і нават асобных прадпрыемстваў распачаць дадатковыя намаганні і крокі дзеля таго, каб ліквідаваць наяўныя праблемы і стварыць умовы для руху наперад.

Быў згаданы нядаўні візіт у Беларусь урадавай дэлегацыі на чале з Прэм'ер-міністрам Міхаілам Мішусціным, калі адбыліся сур'ёзныя вялікія перамовы:

— І яны былі паспяховымі па ўсіх кірунках нашага ўзаемадзеяння. У тым ліку і ў фінансавай сферы.

Акрамя таго, Уладзімір Пуцін паведаміў, што Расія плануе прадаставіць Беларусі крэдыт у суме 1,5 мільярда долараў. Ён, у прыватнасці, сказаў:

— Мы дамовіліся аб тым, што Расія прадаставіць Беларусі ў гэты складаны момант дзяржаўны крэдыт ў 1,5 мільярда. І мы гэта выканаем. Цяпер, наколькі вядома, нашы міністры фінансаў вядуць на гэты конт працу на прафесійным узроўні.

Прэзідэнт Расіі адзначыў, што крэдыт плануецца прадаставіць у бліжэйшы час.

Уладзімір **Веліхаў**

# ПРЫЯРЫТЭТЫ ДЛЯ БУДУЧЫНІ

## У Беларусі высока ацэньваюць ролю навукоўцаў і іх уплыў у грамадстве

Уласна кажучы, людзі інтэлектуальнай працы заўсёды маюць падтрымку дзяржавы. Гэта лагічна, бо асэнсаванае развіццё краіны без навуковага падыходу немагчыма. На гэтыя моманты звярнуў увагу і Прэзідэнт падчас нядаўняга наведвання Нацыянальнай акадэміі навук, калі абмяркоўваў з навукоўцамі многія актуальныя пытанні.

### Многае спазнаецца ў параўнанні

Трэба сказаць, што Аляксандр Лукашэнка сустракаецца з навукоўцамі рэгулярна. Ён пастаянны ўдзельнік іх з'ездаў. Мае зносіны з імі штогод напярэдадні прафесійнага свята — Дня беларускай навукі. Ды і ў працоўных паездках Прэзідэнта нязменна суправаджаюць прадстаўнікі адпаведных даследчых напрамкаў. Аляксандр Лукашэнка перакананы:

— Развіццё навукі вызначае будучыню. Прычым будучыню не толькі асобнай дзяржавы, але і ўсяго чалавецтва.

Няпростымі былі сустрэчы з навукоўцамі ў першыя гады станаўлення беларускай дзяржаўнасці. Людзі навукі больш наракалі як на прафесійную, так і на бытавую неўладкаванасць. Сёння ж яны з гонарам дэманструюць уражлівыя дасягненні. Нездарма наведванне Акадэміі навук Прэзідэнтам пачалося з агляду выставы распрацовак. Тут, напрыклад, дэманстраваліся ўнікальныя цвёрдацельныя лазеры з дыёднай накачкай. Спецыялісты ўдакладнілі: прыкладны кошт двух такіх установак супастаўны з коштам трактара. Гэта да пытання аб эканоміцы працы інтэлекту.

На віртуальнай экспазіцыі Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ужо ўкаранёнымі распрацоўкамі беларускіх навукоўцаў і навінкамі, якія хутка паступяць у вытворчасць. Гэта вырабы і тэхналогіі для аграрнага сектара, медыцыны, клетачнай інжынерыі, касмічных даследаванняў, атамнай энергетыкі. А таксама распрацоўкі ў сферах біялагічных, гуманітарных навук і мастацтваў, фізікі, матэматыкі, інфарматыкі, фізіка-тэхнічных навук, хіміі, экалогіі і навук аб Зямлі. Усяго на выставе была прадстаўлена інфармацыя аб больш чым шасцістах распрацоўках беларускіх навукоўцаў.

### Уплыў заснаваны на дасягненнях

Ва ўсе часы людзей навукі турбавала пытанне асваення навуковых распрацовак і ўкаранення іх у вытворчасць. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў нашай краіне гэтае пытанне вырашана адназначна каля пяці гадоў таму. Сутнасць у тым, што калі навукоўцы прыдумалі, распрацавалі і асвоілі на практыцы, паказалі, што гэта патрэбны для грамадства, рынку прадукт, а вытворца па нейкіх прычынах не спяшаецца ўкараняць яго, то апошняе слова ў такой спрэчцы будзе за кіраўніком Акадэміі навук.

— За гэты час не было ніводнай скаргі на тое, што не разабраліся з нейкім інавацыйным прадуктам або адкрыццём нашых навукоўцаў. І так будзе заўсёды, — запэўніў Прэзідэнт.

Так, у краіне высока ацэньваюць працу навукоўцаў і іх уплыў у грамадстве.

— Гэта вялікія людзі, таму што складаней і цяжэй працы няма, — адзначаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта не проста разумнейшыя людзі, якія глядзяць на ўсе падзеі, што адбываюцца, з вышыні сваіх глыбінных ведаў. Гэта людзі, якія валодаюць жыццёвай мудрасцю, якія шчыра любяць радзіму, таму што жывуць у служэнні навуцы і народу.

### Патэнцыял важна захаваць

На гэтай сустрэчы Прэзідэнтам яшчэ раз было падкрэслена, што ні адно важнае рашэнне ў краіне не прымаецца без удзелу прадстаўнікоў навуковай сферы, менавіта таму ён заўсёды раіцца з навукоўцамі. А пра тое, што навука вызначае будучыню, нагадаў Кіраўнік дзяржавы, не стамляючыся гаварыць і наш знакаміты зямляк — лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы Жарэс Алфёраў, дзякуючы адкрыццям якога планета ступіла ў лічбавую эру:

— Мы з гэтым чалавекам вельмі шмат размаўлялі, часта спрачаліся. Але мяне заўсёды захапляла, што ён — сусветнае свяціла — усё жыццё заставаўся найвялікшым патрыётам нашай Беларусі.

**Паводле міжнародных ацэнак, Беларусь сёння адносіцца да ліку краін з высокім узроўнем навуковага патэнцыялу. Аляксандр Лукашэнка прывёў дадзеныя рэйтынгу «добрых краін» (GOOD COUNTRY INDEX 2018), згодна з якім Беларусь займае 54-е месца сярод 153 дзяржаў.**

Хоць, на жаль, былі і іншыя прыклады. Нездарма Прэзідэнт заўважыў:

— Я вельмі цаню, што вы выстаялі ў той складаны пераломны момант, засталіся верныя сваёй сумлення і пакліканню.

### Час адказных рашэнняў

Так, беларуская навука прайшла няпросты шлях станаўлення.

— Старэйшае пакаленне можа расказаць, якім выпрабаваннем пасля

доўгіх гадоў росквіту сталі 1990-я. Тут нямала тых, хто перажыў гэты складаны час, — нагадаў прысутным Аляксандр Лукашэнка.

У няпросты час не было грошай на абсталяванне, на заробкі. Колькасць навукова-тэхнічных работнікаў скарацілася больш чым у тры разы. Многія навукоўцы памянялі прафесію ці з'ехалі за мяжу, многія стаялі на рынках. Выказваліся ўпадніцкія ідэі:

— Казалі аб тым, ці патрэбна невялікай незалежнай краіне свая Акадэмія навук. Ці, можа, прасцей усё разбурыць, распрадаць напрацоўкі, будынкі, фонды — прэтэндэнтаў было шмат. А затым, калі разбагацеем, купляць патрэбныя тэхналогіі і тавары за межамі краіны.

Прэзідэнт прызнаўся: рашэнне аб развіцці беларускай навукі стала для яго сур'ёзным выклікам. У той час было нямала лабістаў, якія лічылі, што Акадэмія навук павінна была быць «грамадскім клубам». Аднак у краіне ўсё ж вырашылі адрадзіць навуковую галіну, у далейшым прыйшлі яшчэ да адной высновы: неабходна ствараць сувязь паміж вытворчасцю і навукай. Рушыла ўслед рашэнне: навукоўцы займаюцца распрацоўкай, даследаваннямі і выпрабаваннямі, а Прэзідэнт дапаможа з укараненнем, калі прадукцыя будзе запатрабаванай на рынку. Так, па сутнасці, і выйшла, калі пытанне рашэння аб укараненні было па прамым распараджэнні Кіраўніка дзяржавы перададзена ў кампетэнцыю кіраўніка НАН.

## Яшчэ ёсць рэзервы

Сёння беларуская навука развіваецца стабільна. Але і падтрымкі не пазбаўленая. Аляксандр Лукашэнка запэўніў:

— Яна будзе з майго боку забяспечана, як і з боку ўсіх органаў улады і Ўрада... Дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы ўдалося не толькі захаваць дзеяздольнае ядро даследчых калектываў і важнейшыя навуковыя школы, але і пачаць пісаць найноўшую гісторыю беларускай навукі.

Акадэмія актыўна развівае экспарт сваіх распрацовак. Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў:

— Гэта была жорсткая лінія з майго боку і маё патрабаванне да кіраўніцтва Акадэміі навук. Вы, напэўна, заўважылі: любая мая паездка за межы краіны — побач са мной навуковец. Такім чынам, навука зарабляла для краіны, для вытворчасці, і зараблялі самі навукоўцы. Гэты шлях і гэты кірунак будзе адным з прыярытэтаў у будучай пяцігодцы.

Да месца ўдакладненне аб тым, што больш за трэць айчыннага экспарту сёння складае навукаёмістая і высокатэхналагічная прадукцыя. Летась сваім інтэлектам краіна зарабіла амаль 15 млрд даляраў. Прэзідэнт перакананы:

— Калі б мы да гэтых яркіх інавацыйных распрацовак дадалі трошкі якасці ў вытворчасці, мы б не проста павысілі сваю канкурэнтаздольнасць на рынках — мы былі б лідэрамі.



Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання Нацыянальнай акадэміі навук азнаёміўся з выставай навуковых дасягненняў

## Місія навукі — служыць людзям

Космас, атам, біятэхналогіі... Беларускія навукоўцы сёння ўпэўнена сябе адчуваюць у сферах, пра якія яшчэ чвэрць стагоддзя таму і марыць не маглі. Яны стварылі ўласную даследчую станцыю ў Антарктыдзе, працуюць на Вялікім адронным калайдары. Невялікая па тэрыторыі краіна нароўні з гігантамі ўвайшла ў лік касмічных дзяржаў і правяла Міжнародны кангрэс Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў. Кіраўнік дзяржавы параўнаў:

— Дадзеныя прыклады, вядома, падобны спорту высокіх дасягненняў. Яны, безумоўна, патрэбныя і важныя. Але сапраўдная навука павінна перш за ўсё служыць людзям і паляпшаць якасць іх жыцця.

Нездарма цэніцца плённая праца навукоўцаў у аграрным кірунку, харчовай прамысловасці. На слыху дасягненні беларускіх медыкаў. Дзякуючы ўласным канструктарскім бюро і ўзаемадзеянню з навукоўцамі з'яўляюцца яркія навінкі на брэндавых МТЗ, МАЗе, БЕЛАЗе.

— Усе гэтыя дасягненні красамоўна сведчаць аб тым, што абраная дзяржавай стратэгія комплекснай сістэмнай падтрымкі навукі была дакладнай. Так будзе і далей. У нашай краіны, не самай багатай прыроднымі рэсурсамі, няма іншага выйсця, як рабіць стаўку на інтэлект.

## Задача нумар адзін

Прэзідэнт прапанаваў разам падумаць, як зрабіць навуковы шлях больш прывабным для маладых людзей. Хоць і сёння створана нямала:

— У нас плённа працуе праграма «Універсітэт 3.0». У мэтах развіцця інавацыйнага прадпрымальніцтва функцыянуюць тэхнапаркі. Для падрыхтоўкі кадраў ва ўмовах рэальнай вытворчасці ствараюцца галіновыя лабараторыі ў прамысловых холдынгах і на прадпрыемствах. Гэтую практыку трэба працягваць.



На выставе навуковых дасягненняў

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што дзяржава штогод выдзяляе па 100 стыпендый Прэзідэнта аспірантам і таленавітым маладым навукоўцам, прызначаюцца гранты калектывам:

— Трэба — будзе больш. Але толькі за вынік.

Аднак, як падкрэсліў Прэзідэнт, не менш фінансавага стымулявання важны інстытут настаўніцтва:

— Я заўсёды казаў навукоўцам: вы толькі тады станеце вялікімі, калі пасля сябе пакінеце калі не школу, то дзясятак такіх, як вы. Якія працягнуць тое, што вы пачалі.

Ну і трэба трымаць вуха востра. «Паляўнічыя за галовамі» за мяжой не дрэмлюць. Гэта неабходна ўлічваць для захавання інтэлектуальнага патэнцыялу нацыі. Аляксандр Лукашэнка адзначыў:

— Многія краіны, арыентаваныя на тэхналагічнае лідарства, маюць падрыхтаваных спецыялістаў, якія выглядваюць на міжнародных алімпіядах і спаборніцтвах таленавітых юных матэматыкаў, хімікаў, праграмістаў.

На думку Кіраўніка дзяржавы, калі малады чалавек з'ездзіў, павучыўся і вярнуўся на радзіму, прывёз новы багаж ведаў, гэта будзе вітацца.

## Наперадзе шмат працы

Ключавой задачай будучай пяцігодкі Аляксандр Лукашэнка назваў развіццё рэгіёнаў. Значыць, у абласных і раённых гарадах павінны быць створаны добрыя ўмовы для працы навукоўцаў. Для падтрымкі навукі зроблена ўжо шмат: удасканалены ўмовы аплаты працы работнікаў бюджэтных навуковых арганізацый, павышаны памеры стыпендый аспірантаў і дактарантаў, устаноўлены даплаты да пенсій для тых, хто мае навуковую ступень.

— Мы будзем рухацца ў гэтым кірунку, наколькі дазволіць нам эканоміка, — запэўніў Прэзідэнт.

Прыярытэты навуковай працы будуць адлюстраваны ў рашэнні Усебеларускага народнага сходу. Прэзідэнт дае наказ навукоўцам:

— Чакаем ад вас прарыўных распрацовак і новых рашэнняў у розных галінах. Навука павінна задаваць трэнды будучыні. Ствараць і рухаць наперад новыя кропкі росту для ўсёй эканомікі.

Прэзідэнт прапанаваў навукоўцам актыўна ўключыцца ў працу над новай пяцігадовай праграмай для Беларусі, якая будзе абвешчана менавіта на Усебеларускім народным сходзе:

— Я вельмі хачу, каб вы не проста падключыліся да распрацоўкі новай пяцігадовай праграмы і прагнозу развіцця нашай дзяржавы. Я хацеў бы, каб прапановы нашых навукоўцаў сталі падмуркам гэтай праграмы. Каб яна была рэальнай і выканальнай.

## Права самім вырашаць свой лёс

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сярод навуковых прыярытэтаў выдзелена забеспячэнне бяспекі дзяржавы, у тым ліку і гуманітарнай. На навукоўцаў тут асаблівая надзея:

— Без перабольшання, скажу: вы мозг нашай нацыі. Памятаеце, што навукоўцы-гуманітарыі сваімі даследаваннямі і напрацоўкамі павінны кансалідаваць беларускае грамадства. Кожны з нас павінен усведамляць, якой працай беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць і права самому вырашаць лёс. Нельга гэта страціць.

Прэзідэнт патрабуе, каб грамадазнаўчыя дысцыпліны выключылі нават гіпатэтычную магчымасць падвойных стандартаў пры ацэнцы гістарычных падзей, паставілі трывалы заслон падтасоўцы або скажэнню фактаў, на якіх грунтуюцца традыцыйныя каштоўнасці:

— Ніхто, акрамя нас, не зацікаўлены ў тым, каб мы былі моцнай, суверэннай і незалежнай краінай. Краінай, дзе шануюць мінулае, цэняць сучаснасць і ўпэўненыя ў будучыні, таму што абапіраюцца на патрыятызм і айчынныя навуковыя школы.

## Асноўны прынцып — ісці наперад

З навукоўцамі абмяркоўваліся многія актуальныя пытанні. У тым ліку роля дзяржавы ў развіцці эканомікі. З улікам таго, што нават самыя ліберальныя краіны звяртаюцца да прылад адміністрацыйнага рэгулявання. Кажучы аб прыярытэтах на цяперашнім этапе, Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў:

— Эканамічная бяспека — гэта галоўная задача эканомікі.

Што тычыцца асноўных напрамкаў развіцця, то яны вызначаны даўно і ўсім вядомыя. Таму абмеркаванне гэтай тэмы Аляксандр Лукашэнка прапанаваў перавесці ў плоскасць рэформаў. Сваё бачанне Прэзідэнт акрэсліў наступным чынам:

— Пры цяперашняй уладзе і захаванні цяперашняга Прэзідэнта мы будзем сваім шляхам, як ішлі чвэрць стагоддзя, рэфармаваць нашу эканоміку.

Кіраўнік дзяржавы ўдакладніў, што з самага пачатку свайго прэзідэнцтва ён праводзіць выразную і ясную палітыку: нічога не ламаючы, развіваць тое, што маем. Стоячы, як ён выказаўся, на плячах гігантаў, якія дасталіся ад СССР:

— У нас ёсць і МАЗ, і БЕЛАЗ, і сельская гаспадарка, якая развіваецца.

Але і стварэнне новых вытворчасцяў, зразумела, вельмі важна. І выключна высокатэхналагічных, заўтрашняга дня. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў беларускую нацыянальную біятэхналагічную карпарацыю, якая ствараецца пры яго непасрэдным патранажы і дзякуючы даверлівым адносінам Беларусі з КНР. Падобныя тэхналогіі да нядаўняга часу мелі толькі тры краіны ў свеце. Беларусь стане чацвёртай у гэтым клубе.

Яшчэ адзін яркі прыклад — электратранспарт. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што 10 гадоў таму, калі ён настойліва рэкамендаваў развіваць гэты кірунак, хтосьці ідэю ўспрыняў скептычна. А зараз многія дзяржавы ставяць канкрэтныя тэрміны, калі адмовяцца ад рухавікоў унутранага згарання.

Аляксандр Лукашэнка падсумаваў:

— Абапіраючыся на тое, што ў нас ёсць, давайце ад гэтага адштурхоўвацца і ісці наперад. Дакладна так ва ўсёй эканоміцы. Гэта будзе асноўны прынцып.

Інстытуту эканомікі НАН Прэзідэнт прапанаваў актыўна ўключыцца ў гэтую працу.

## Попыт на смелыя рашэнні

Адно з апошніх дасягненняў — засваенне мірнага атама. Што, як вядома, стала адной з прычын ціску на краіну. Але, падкрэсліў Прэзідэнт, атамная станцыя — гэта не толькі танная энергія. Гэта бяспека. Кіраўнік дзяржавы перакананы:

— Атамная электрастанцыя — гэта прарыў, частка нашай незалежнасці.

Наяўнасць уласнай атамнай станцыі дазволіць краіне не закупляць 4–5 мільярдаў кубаметраў газу. Стаўка ў рэспубліцы будзе зроблена на электрычнасць: ад выкарыстання ў побыце да развіцця электратранспарту і розных тэхналогій у прамысловасці. Для гэтага прымаюцца і стымулюючыя меры. Кіраўнік дзяржавы таксама папрасіў навукоўцаў актыўна прапаноўваць ідэі па развіцці атамнай энергетыкі:

— Трэба смялей ісці. Прапануйце рашэнні. Рашэнні на будучыню, якія забяспечаць наш суверэнітэт і незалежнасць. У нас сапраўды бліскучыя навукоўцы, якія могуць цуды тварыць…

Прэзідэнт падкрэсліў:

— Мы гэтую атамную станцыю стваралі перш за ўсё для людзей, для народа. Для таго, каб было лепш, зручней. А я, Прэзідэнт, хачу, каб народ з часам ацаніў гэтую будоўлю, наш чарнобыльскі народ. Няпроста мне было прымаць рашэнне па будаўніцтву атамнай станцыі. У адзіночку ішоў. Сёння многія ўжо згодныя: правільна, што мы пабудавалі.

## Задачы для сучаснасці

У дыскусіі была паднятая тэма аб тым, што некаторыя людзі, асабліва маладое пакаленне, слаба арыентуюцца ў гістарычных каштоўнасцях беларускага народа. Адсюль і далёка не заўсёды канструктыўныя дыскусіі вакол белчырвона-белага сцяга. Прэзідэнт разважае на гэтую тэму так:

— Сцяг ні ў чым не вінаваты, што ў яго такія колеры. Але куды дзенешся, што яго выкарыстоўвалі самыя агідныя людзі, якія прыйшлі да нас з вайной на нашу тэрыторыю, — фашысты.

У краіне вельмі шмат жывых сведак той вайны, якія памятаюць, якія зверствы чынілі пад гэтым сцягам. І тым не менш яго на ўсю моц выкарыстоўваюць на вулічных акцыях.

— Мы вельмі дрэнна працавалі ў школе. А яшчэ горш працавалі ў ВНУ, — пазначыў вытокі праблемы Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што выдатную краіну, якую стварылі, не павінны страціць:

— Гэта наша задача — ідэолагаў, гісторыкаў і іншых. І калі вы бачыце, што нам трэба дзесьці (не дзеля новых гадзін для выкладчыкаў, яшчэ чагосьці) прайсціся па гуманітарных дысцыплінах і чагосьці дадаць, вы абгрунтавана скажыце, і мы прымем рашэнне.

…Развітваючыся з навукоўцамі, Аляксандр Лукашэнка сказаў, што гатовы прыязджаць часцей, сустракацца ў больш вузкім коле. Бо прадстаўнікі навукі заўсёды належалі да той катэгорыі людзей, якія фарміруюць грамадскую думку. А будуць вынікі на навуковай ніве, падтрымка дзяржавы не прымусіць сябе чакаць:

— Нават у гэты складаны перыяд мы знойдзем, як падтрымаць вялікія дасягненні і вынаходніцтвы. Для вялікага мы заўсёды знойдзем грошы.

Васіль **Ціхаміраў.**

Фота **БелТА.**

## Красамоўныя факты

***Уладзімір Гусакоў, старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:***

— Сёння Акадэмія навук не толькі выконвае комплекс прыярытэтных фундаментальных даследаванняў і прыкладных распрацовак, але і забяспечвае іх укараненне ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі і ўяўляе сабой буйную навукова-вытворчую карпарацыю. У яе складзе створана і функцыянуе ўжо больш за 100 уласных вытворчасцяў рознай памернасці — ад лабараторных да юрыдычных асоб па розных сферах дзейнасці.

Каэфіцыент эфектыўнасці навукова-тэхнічных праграм, дзяржаўным заказчыкам якіх з’яўляецца НАН, па выніках мінулага года склаў 43,7 — гэта суадносіны кошту рэалізаванай прадукцыі да аб’ёму затрачаных сродкаў. Інакш кажучы, на кожны рубель, укладзены ў навуку, выпускаецца прадукцыі ў шмат разоў больш.

***Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр Шумілін:***

— Калі ў мінулай пяцігодцы доля беларускіх распрацовак у дзяржпраграме інавацыйнага развіцця была 10 працэнтаў, то ў бягучай — ужо 36 працэнтаў, а ў наступнай пяцігодцы ставім задачу давесці гэты паказчык да 50 працэнтаў. На кожны бюджэтны рубель, патрачаны на распрацоўкі, рэалізавана навукова-тэхнічнай прадукцыі на суму больш за 16 рублёў. Аб’ём экспарту навукаёмістай прадукцыі дасягнуў у 2019 годзе 15 млрд долараў і павялічыўся ў 1,5 разы да 2015 года. Аб’ём навукаёмістай прадукцыі і тэхналогій, створаных у рамках дзяржпраграм, у бягучай пяцігодцы перавысіў 12 млрд рублёў. Яны пастаўляюцца ў такія краіны, як Кітай, Паўднёвая Карэя, Расія, ЗША, Японія, Германія, Ізраіль і іншыя. У краіне створана 17 тэхнапаркаў, якія за мінулы год забяспечылі выпуск інавацыйнай прадукцыі амаль на 149 мільёнаў рублёў, што ў 4,4 разы вышэй за ўзровень 2015 года.

# ДАРОЖНАЯ КАРТА ДЛЯ НАВУКОЎЦАЎ

**Сучасны свет уступіў у эпоху імклівых інавацыйных перамен. Трансфармацыі ва ўсіх сферах эканомікі патрабуюць ад навукі актыўнага пошуку, прарыўных ідэй і хуткай матэрыялізацыі задум. Сярод апошніх буйных сусветных дасягненняў беларускіх навукоўцаў варта асабліва вылучыць штучнае вырошчванне органаў і тканак для «рамонту» чалавечага арганізма, стварэнне наналекаў і мікраробатаў, якія выконваюць маніпуляцыі ва ўнутраных органах чалавека, з'яўленне штучнага інтэлекту, праўзыходзячага чалавечы, суперновых кампазіцыйных матэрыялаў і касмічных сістэм, электрамашын, якія кіруюцца з дапамогай сэнсорыкі і думак, разумных гарадоў і вытворчасцяў. Менавіта ў гэтых галінах беларуская навука знаходзіцца на перадавых пазіцыях, а дзесьці і лідзіруе.**

Сёння беларускія трансплантолагі займаюцца заменай органаў і тканак і аднаўленнем функцый чалавечага арганізма. Біёлагі і медыкі актыўна працуюць з ДНК і ўжо навучыліся рэдагаваць геном чалавека. Фізікі і інфарматыкі, якія працуюць над штучным інтэлектам, навучылі машыны размаўляць, чытаць, мець зносіны. Матэрыялазнаўцы ствараюць унікальныя шматфункцыянальныя кампазіцыйныя матэрыялы. Машынабудаўнікі распрацоўваюць найноўшыя электратранспартныя сродкі і кампаненты, якія змяшчаюць эксклюзіўныя ноу-хау. Электроншчыкі атрымліваюць высокаканкурэнтныя лазеры і схемы, запатрабаваныя і ў ЗША, і ў Японіі. Заслуга айцішнікаў і матэматыкаў — наймагутнейшыя суперкамп'ютары для апрацоўкі вялікіх масіваў дадзеных. Палярнікаў — айчынная база ў Антарктыдзе разам з вядучымі краінамі і даследаванні, якія не саступаюць па навізне прызнаным лідарам. Знакавай распрацоўкай з'яўляецца і наша касмічная сістэма дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі. Яна забяспечвае патрэбы многіх міністэрстваў і ведамстваў і дазволіла параўнальна невялікай Беларусі стаць касмічнай дзяржавай.

На думку старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзіміра Гусакова, сёння беларускія навукоўцы сталі раўнапраўнымі партнёрамі з сусветнай навукай. Яны ўдзельнічалі ў эксперыментах па стварэнні і выпрабаванні адроннага калайдэра ў Швейцарыі. Геаграфія сумесных даследаванняў і распрацовак — ад Японіі да ЗША, не кажучы ўжо пра Кітай, Расію і ЕС. Усе зацікаўленыя працаваць з Беларуссю, прызнаюць высокі ўзровень яе навукі. Тут не толькі захавалі навуку былога Савецкага Саюза, але аптымізавалі яе, стварылі шэраг новых прыярытэтных напрамкаў, забяспечылі базу ўстойлівага росту. Лідары шэрагу найноўшых школ і напрамкаў добра вядомыя. Напрыклад, у сферы найноўшых нанатэхналогій гэта акадэмік Сяргей Чыжык, квантавых даследаванняў і распрацовак — акадэмік Сяргей Кілін, геномных трансфармацый і экспрэсіі генаў — акадэмік Аляксандр Кільчэўскі, трансплантаалогіі органаў і тканак — член-карэспандэнт Алег Румо, анкахірургіі — член-карэспандэнт Сяргей Красны…

Цяпер цяжка ўявіць, што некалькі дзесяцігоддзяў таму сітуацыя была кардынальна іншая. Асабліва драматычным і разбуральным для айчыннай навукі быў перыяд пасля развалу Савецкага Саюза. Навукоўцы адразу пазбавіліся буйных савецкіх заказаў, а такім чынам, і фінансавання. Рэспубліканскі бюджэт папоўніць гэтыя страты быў не ў стане. Навукоўцы апынуліся ва ўмовах элементарнай адсутнасці сродкаў. Маладыя, здольныя і таленавітыя масава з'язджалі за мяжу. Многія сыходзілі ў камерцыю. Лабараторыі спынялі працу.

— Наваяўленыя рэфарматары прапаноўвалі айчынную навуку перабудаваць на заходні лад і нават Акадэмію навук — яе цэнтр і мозг — зрабіць клубам навукоўцаў, а інстытуты «раздаць», — успамінае Уладзімір Гусакоў.

— Гэта прывяло б да літаральнага знікнення не толькі інстытутаў, цэлых навуковых напрамкаў і школ, але і ў цэлым нацыянальнай навукі — паказвае прыклад краін, дзе такое адбылося. Кіраўнік НАН Беларусі ўпэўнены: калі б гэта мела месца ў Беларусі, мы ўжо ніколі не змаглі б адрадзіць айчынную навуку і па ўсіх ключавых інавацыях пляліся б у хвасце свету, спадзяючыся на куплю навукаёмістых замежных тэхналогій. Толькі вось невядома, за які кошт.

— Канец развалу быў пакладзены ў 1994–1995 гадах, калі абраны народам Прэзідэнт сказаў: беларускай навуцы і Акадэміі навук быць! Надаў Акадэміі статус нацыянальнай і забяспечыў прыняцце цэлага шэрагу законаў і ўказаў, якія ствараюць усе неабходныя ўмовы для ўстойлівага развіцця, — нагадвае цяперашні старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук.

Дарэчы, адной з першых, калі не самую першую, малады Прэзідэнт у 1994 годзе наведаў менавіта Акадэмію навук. Пасля працяглай размовы навукоўцы ўздыхнулі з палёгкай. Зразумелі: цяжкі перыяд прайшоў і можна далей актыўна працаваць на стварэнне, рэалізуючы свае задумы, выконваючы навуковыя праграмы, нарошчваючы кампетэнцыі. Прэзідэнт рашуча адхіліў усялякія радыкальныя рэформы навукі, якія прыводзяць да яе злому, калі ўсё трэба пачынаць з нуля. Прапанаваў шлях удасканалення, аптымізацыі і паэтапнага развіцця.

У адказ на давер дзяржавы і стварэнне спрыяльных умоў навукоўцы кардынальна павысілі сваю выніковасць.

Нацыянальная акадэмія навук Беларусі цяпер шчыльна ўзаемадзейнічае з вядучымі галінамі і прад-

***Сёння Нацыянальная акадэмія навук не толькі выконвае комплекс прыярытэтных фундаментальных даследаванняў і прыкладных распрацовак і забяспечвае іх укараненне ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, але і ўяўляе сабой буйную навукова-вытворчую карпарацыю. У яе складзе створаны і функцыянуюць ужо больш за сто ўласных вытворчасцяў рознага маштабу — ад лабараторных да юрыдычных асоб — па розных сферах дзейнасці.***



БЕЛТА

прыемствамі краіны. Прыняла на сябе абавязацельствы па шырокаму навуковаму абслугоўванню і забеспячэнню аграпрамысловага комплексу — асноўныя гатункі раслін, пароды жывел, найноўшая тэхніка, інавацыйныя тэхналогіі. Цесна супрацоўнічае з Міністэрствам аховы здароўя ў распрацоўцы электроннага рэцэпту, стварэнні адзінай камп'ютарызаванай сістэмы медперсаналу, праграмных комплексаў, пастаўцы ўнікальных лекаў, даследаваннях у галіне ствалавых клетак. Наладзіла кааперацыю з Міністэрствам адукацыі — распрацоўка электроннай карткі навучэнца, сумесная падрыхтоўка падручнікаў, адкрыццё шматлікіх філіялаў кафедраў у інстытутах НАН Беларусі, актыўны ўдзел вучоных Акадэміі навук у выкладанні ва ўніверсітэтах…

Уласна кажучы, канкрэтных прыкладаў у кіраўніка Нацыянальнай акадэміі навук нямала. У прыватнасці, актыўна працуе сумесны Навуковы савет з БЕЛАЗам — разлікі на трываласць і даўгавечнасць, спецыяльныя маркі сталі, сістэмы вібраманіторынгу і мадэлявання кіравання, з МАЗам — цэлая серыя сумесных здабыткаў: ад дызайну да праектавання і разлікаў, навукова-вытворчы цэнтр «БМЗ — НАН Беларусі» — новыя сталі і сплавы. З шэрагам прадпрыемстваў створаны сумесныя галіновыя лабараторыі.

Што тычыцца такой сферы як генерацыя найноўшых мікраэлектронных і опта-электронных тэхналогій, то тут адноўлена навукова-вытворчае аб'яднанне «Оптыка, оптаэлектроніка і лазерная тэхніка», дзе ўжо атрыманы ўнікальныя вынікі. Створаны міжгаліновы інавацыйна-прамысловы кластар па мікра-, опта- і ЗВЧ-электроніцы, куды ўвайшлі прадпрыемствы «Інтэграл», «Планар», навукова-даследчы інстытут радыёматэрыялаў, такія вышэйшыя навучальныя ўстановы як БДУ, БНТУ, БДУІР і шэраг іншых удзельнікаў. У рамках кластара з'явілася магчымасць інтэграваць навуковы патэнцыял і матэрыяльныя рэсурсы. Гэта дазволіла распрацаваць сістэму датчыкаў і модуляў рабатызаванага гледжання, стварыць ўзоры магутнай кропкавай крыніцы белага святла, атрымаць найноўшыя інтэлектуальныя сістэмы аўтаматызацыі і рабатызацыі шматмэтавага прызначэння.

У сферы развіцця касмічнай дзейнасці НАН Беларусі сумесна з навукова — вытворчым прадпрыемствам «Пеленг» і іншымі навуковымі арганізацыямі працуе над стварэннем найноўшага спадарожніка з субметровым дазволам, гэта значыць у 0,35–0,5 метра. А гэта на сёння лепшае сусветнае дасягненне.

У краіне створана база і для паспяховага росту біятэхналагічнай галіны. У Нацыянальнай акадэміі навук, у прыватнасці, дзейнічае дзяржаўнае навукова-вытворчае аб'яднанне «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі», куды ўвайшлі розныя зацікаўленыя прадпрыемствы. Заключаны дагавор і наладжана цеснае ўзаемадзеянне з беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыяй. Акадэмія навук узяла на сябе яе навуковае забеспячэнне. Толькі ў 2019 годзе выраблена біятэхналагічнай прадукцыі на суму каля мільярда рублёў.

У галіне геннай інжынерыі створаны цэлы кластар геномных даследаванняў, які распрацоўвае і ўкараняе ўнікальныя тэхналогіі для персаналізаванай медыцыны, крыміналістыкі, спорту высокіх дасягненняў, сельскай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя. Разгарнуў працу Цэнтр ствалавых клетак па дыягностыцы і лячэнні пацыентаў з сур'ёзнымі захворваннямі шэрагу органаў, у тым ліку ў галіне COVID-19. Пачата распрацоўка спецыялізаванай вакцыны.

Галоўнае, лічыць Уладзімір Гусакоў, павялічыць выніковасць, стварыць кампетэнцыі і лідзіраваць у свеце па ключавых прыярытэтах. Перад сусветнай навукай цяпер практычна няма перашкод, яна можа выконваць неймаверныя па складанасці даследаванні. Бліжэйшая рэальнасць — штучны інтэлект, які стане пранізваць ўсе сферы жыцця і дзейнасці. Ахопліваць не толькі вытворчасць, але і ўсю разнастайнасць паслуг.

— Мы таксама павінны тут быць у лідарах, — бачыць рэальную перспектыву старшыня прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. — У гэтым плане ў нас ёсць дарожная карта — Стратэгія развіцця навукі і тэхналогій да 2040 года, дзе пастаўлена мэта стварыць не толькі IT-краіну, але і «Беларусь інтэлектуальную». На практыцы гэта разумныя сістэмы ў любой галіне.

Як следства, далейшае ўдасканаленне і развіццё Акадэміі навук і ўсёй навукі краіны. Навукоўцы — за стварэнне і за ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Аляксей **Фядосаў**

# «СВЯТЛО СТВАРАЛЬНАГА ПІСЬМЕНСТВА...»

**У пярэдадзень XXVII Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах Міністр інфармацыі Беларусі Ігар Луцкі адказаў нашаму карэспандэнту на некалькі пытанняў**

***— Паважаны Ігар Уладзіміравіч, свята гэта адлічвае ўжо другую чвэрць стагоддзя. Вы — удзельнік і арганізатар не аднаго такога Дня пісьменства. Якімі адрозненнямі характарызуецца сёлетняе свята ў Бялынічах?***

— Найлепшая характарыстыка любой традыцыі, якая мае паважаны ўзрост, — стабільнасць, трываласць. Без гэтага нельга ісці наперад, развівацца. Вось і гаворачы пра чарговую сустрэчу медыйшчыкаў, кніжнікаў, усіх, каго хвалюе лёс асветніцтва, трэба тое падкрэсліць. Суадносіны друкаваных выданняў, кнігі, мастацкага і публіцыстычнага слова, выкладзенага ў электронных СМІ, сацыяльных сетках з грамадствам, яго сацыяльнымі і іншымі памкненнямі — вось галоўны клопат, галоўная тэма размоў і дзеяў. Канешне, штогод патрэбны навацыі. Наша галіновае міністэрства, якое так ці інакш судакранаецца з усёй краінай, разам з іншымі арганізатарамі свята, найперш — Магілёўскім аблвыканкамам, Бялыніцкім райвыканкамам — вызначыла і выпрацавала досыць шмат. Не буду каментаваць усю праграму свята, а звярну ўвагу толькі на некаторыя «пункты». Спадзяюся, што літаральна ўсім гасцям свята, усім яго ўдзельнікам цікава будзе пазнаёміцца з праграмай, якую арганізатары прадставяць на пляцоўках «Кнігі і прэса Рэспублікі Беларусь», «Друкарскі двор», «Слова пісьменніка». Калі мы складалі іх праграму, то ўлічвалі розныя акалічнасці. Па-першае, усе мерапрыемствы, усе дзействы на гэтых пляцоўках ладзяць людзі, нераўнадушныя да друкаванага слова, да мастацкай, публіцыстычнай, асветніцкай кнігі. А гэта выдаўцы, журналісты, пісьменнікі, краязнаўцы, бібліятэчныя работнікі. Вось як быццам някідкі адрас свята — у межах духоўна-асветніцкага праекта «Дакранучца да духоўнасці» будзе цэлы дзень 6 верасня будзе працаваць літаратурна-тэатралізаваная інтэрактыўная пляцоўка тэматычных экспазіцый бібліятэк Магілёўскай вобласці. Кожная з раённых цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, бібліятэкары Магілёва, вобласці прадэманструюць далучанасць да агульнабеларускіх здабыткаў у галіне прыгожага пісьменства ўраджэнцаў Магілёўшчыны.

***— І магіляўчанам ёсць чым ганарыцца...***


БЕЛТА

Ігар Луцкі

— Сапраўды. Прыгадаем паэтаў, празаікаў, якія дзесяцігоддзямі фарміравалі творчае аблічча гэтай унікальнай старонкі. Мяркуйце самі.

Народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў, якому належаць радкі пра лёс бацькі Міная, чыю баладу «Камсамольскі білет» чытаюць пакаленні беларусаў. Працуючы на тэлебачанні, я не раз слухаў удзельнікаў конкурсу «Жывая класіка». Дык калі дзеткі чыталі нешта з Куляшова — было вельмі шчымліва.

Народны пісьменнік Беларусі Іван Чыгрынаў. У яго раманах «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві» і фільмах, знятых па гэтых кнігах, столькі болю і народнага плачу, што іх не лішнім было б прачытаць сёлетнім мітынгоўшчыкам і разбуральнікам Беларусі. Любаванне хараством роднага слова вылучае яшчэ адну акалічнасць, а можа, і выключна сёлетнюю адметнасць Свята пісьменства. І мясцовыя арганізатары Дня беларускага пісьменства, і ўсе мы, хто далучаны да яго праграмы, думалі пра сацыялізацыю свята, пра тое, каб спалучыць «высокае і зямное». Таму і многіх мясцовых пісьменнікаў згадваем, таму і моладзь пастараліся ўключыць у квэстгульню «Скарбы князя Гальшанскага», прысвечаную жыццю і творчасці Уладзіміра Караткевіча. Мы стараліся так сфарміраваць праграму, так тэматычна вылучыць многія абсягі, каб усім было цікава. І самім пісьменнікам, і простаму чалавеку, які адарваўся ад важкіх восеньскіх клопатаў і ў выніку зразумеў бы, што не дарэмна патраціў час. І

сваімі роднымі Бялынічамі ў новых, скажам так, строях палюбаваўся, насыціўся добрымі, светлымі ўражаннямі.

***— Паколькі вы згадалі аўтара рамана «Каласы пад сярпом тваім», то хацеў бы запытацца, як у юбілейны год, у 90-годдзе з яго дня нараджэння, будзе заўважаны ў Бялынічах наш класік беларускай нацыянальнай літаратуры?***

— Я назваў бы Караткевіча не проста нацыянальным класікам, а пісьменнікам сусветнага маштабу, сусветнага гучання, літаратарам, чые творы асабліва дарагія славянскім прасторам, добра знаёмыя чытачам і Беларусі, і Расіі, і ўсіх краін-суседзяў, ды і многіх іншых далёкіх і не такіх далёкіх ад нас краін. Працуючы зусім нядаўна на тэлебачанні, я з калегамі выпусціў шэраг дакументальных, мастацка-публіцыстычных фільмаў, у якіх мы пастараліся расказаць пра многіх пісьменнікаў, імёны якіх на слыху ў многіх людзей. Зрабілі фільмы пра ластаўку з майго роднага Палесся Яўгенію Янішчыц. Зрабілі і фільм пра Караткевіча. Столькі чуў хвалюючых слоў ад людзей, якія следам за тэлевізійным знаёмствам з лёсам аўтара «Каласоў…», «Дзікага палявання караля Стаха» пабеглі ў кнігарні і бібліятэкі, каб хутчэй адкрыць кнігі пісьменніка.

***— І, несумненна, кнігі Уладзіміра Сямёнавіча з года ў год перавыдаюцца...***

— Прывяду вам статыстыку. Толькі за мінулае дзесяцігоддзе ў краіне на беларускай і рускай мовах выйшла амаль 50 (уявіце сабе: 50!) кніг класіка. Агульны тыраж склаў нават 100 тысяч экзэмпляраў. Падкрэслю: толькі за адно дзесяцігоддзе! Дарэчы, выдавецтва «Мастацкая літаратура» завяршае выданне 25-томнага Збору твораў Уладзіміра Караткевіча.

***— Бачна, да 90-годдзя Караткевіча рыхтаваліся…***

— І да 90-годдзя, і да свята ў Бялынічах. Рыхтаваліся ўсе кніжныя выдавецтвы краіны — і дзяржаўныя, і прыватныя. У нас, дарэчы, зарэгістравана каля 400 суб'ектаў гаспадарання, якія займаюцца выдавецкай дзейнасцю. І штогод у Беларусі выпускаюць каля 10 тысяч назваў кніг.

***— Лічбы ўражваюць…***

— Тут справа не ў лічбах. Хацелася б падкрэсліць, што да Дня беларускага пісьменства мы рыхтуемся загадзя, рыхтуемся цэлы год. Мяркуем, што будзем прэзентаваць, як ушаноўваць Яе Вялікасць Кнігу. Часам прыходзяць думкі, што мо і не да свята ў такі напружаны час. Але ж гэта — люстэрка і сацыяльных памкненняў грамадства, люстэрка дзяржаўнай увагі да беларускага пісьменства, да мовы, культуры, нацыянальнай літаратуры. Таму і ў Бялынічах мы шмат увагі аддаём традыцыям… Вось у гэтым кірунку нам і візуальнае мастацтва паспрыяе. Беларускае тэлеграфнае агенцтва арганізавала фотавыстаўку «Традыцыі суверэннай Беларусі». А летась, дарэчы, пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі БелТА і кнігу з такой назвай выпусціла. Пагартайце яе старонкі — і адкрыеце гэтулькі прыгожых здзяйсненняў, што характарызуюць развіццё нашай краіны! А канцэрт закрыцця свята якраз прысвечаны традыцыям.

***— Словам, сыходзяцца на свяце пісьменства розныя мастацтвы, розныя кірункі дзейнасці...***

— Так. Невыпадкова поруч з Міністэрствам інфармацыі арганізатарамі свята выступаюць не толькі мясцовыя ўлады, а яшчэ міністэрствы культуры, адукацыі, спорту і турызму. Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў… Усе гатовы праявіць суладнасць і з кнігай, і з прыгожым пісьменствам увогуле, а галоўнае — паспрыяць таму, каб было цікава магілёўчанам, жыхарам Бялыніч і ваколіц.

***— Ці будуць на свяце замежныя госці, улічваючы няпростую эпідэміялагічную сітуацыю?***

— Па традыцыі, пачынаючы з 2007 года, мы ладзім на Дні беларускага пісьменства міжнародны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго». За ўсю гісторыю гэтага творчага праекта са святам і з нашай краінай пазнаёміліся многія і многія пісьменнікі літаральна з дзясяткаў краін: з Вялікабрытаніі, Казахстана, Узбекістана, Таджыкістана, Сербіі, Чарнагорыі, Манголіі, Кітая, Польшчы, Індыі, Малдовы, Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі… Асабліва сяброўства склалася з Расіяй. Да нас прыязджалі паэты, празаікі, публіцысты, перакладчыкі, літаратуразнаўцы не толькі з Санкт-Пецярбурга і Масквы, але з Екацярынбурга, Астрахані, Томска, Новасібірска, з Чувашыі, Удмурціі, Татарстана, Башкартастана, Чачэнскай Рэспублікі, Кабардзіна-Балкарыі, Калмыкіі, Марый Эл… Сёлета шмат хто пацвердзіў свой удзел у бялыніцкім круглым стале «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго. Слова стваральнае і слова разбуральнае» віртуальна, з дапамогай сучасных электронных тэхналогій. Відавочная цікаўнасць да Беларусі, да спасціжэння беларускага характару мастакамі слова.

***— У назве круглага стала — пра разбуральнасць…***

— Але ж і пра стваральную, пазітыўную ролю мастацкага, публіцыстычнага слова. Насамрэч, не павінна існаваць ніякага разбуральнага слова. Мы завастрылі публіцыстычны характар мяркуемай гаворкі. Слова павінна насіць толькі стваральны характар!.. Пра гэта гаварылася, і калі мы праводзілі з уладыкам Веніямінам традыцыйную экспедыцыю «Дарога да святыняў», якая, дарэчы, фінішуе ў Бялынічах у час урачыстага адкрыцця Дня беларускага пісьменства.

***— Разумею, што шмат пра што яшчэ не расказалі, прэзентуючы бялыніцкі Дзень беларускага пісьменства…***

— Самы лепшы расповед — жывыя ўражанні. А наступны Дзень беларускага пісьменства пройдзе ў Капылі, на Міншчыне. Выбар зусім не выпадковы. З Капыльшчынай звязаны імёны такіх легендаў пісьменства, як Кузьма Чорны, чыё 120-годдзе з дня нараджэння мы, між іншым, згадалі ў Бялынічах, Алесь Адамовіч, аўтар вядомых свету кніг «Хатынская аповесць», «Карнікі», суаўтар надзвычай эмацыйнай «Блакаднай кнігі», збору пякельных аповедаў сведак драматычных падзей Вялікай Айчыннай вайны «Я з вогненнай вёскі». Наўмысна падкрэсліваю гэта, бо глыбока перакананы, што стваральнае слова павінна весці ўсё наша грамадства да высокіх гуманістычных ідэалаў дабрыні, справядлівасці, мірнага суіснавання. І Дзень беларускага пісьменства як даўняя дзяржаўная традыцыя гэтага руху — добрая пляцоўка для добрых спраў.

Гутарыў Кастусь **Ладуцька**




# ГОНАР СЛОВУ, ПАВАГА КНІЗЕ, ВЕДЫ — УСІМ!

**XXVII Дзень беларускага пісьменства ў Беларусі па традыцыі святкуецца ў хуткім часе пасля Дня ведаў, калі пачынаюцца заняткі ў школах, святкуецца ў першую нядзелю восені. Сёлета яго ўдзельнікаў прымалі ў Бялынічах Магілёўскай вобласці. Якраз там сустрэліся тыя, хто працуе дзеля зберажэння друкаванага слова, папулярызацыі нацыянальнай культуры і прымнажэння духоўнасці беларускага народа.**

Дзень беларускага пісьменства паяднoўвае тых, хто любіць Беларусь і жадае ёй далейшага росту і росквіту. Такім меркаваннем падзяліўся намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Андрэй Кунцэвіч падчас святкавання Дня беларускага пісьменства.

— Сённяшняе свята ў Бялынічах дае магчымасць аб’ектыўна ацаніць развіццё рэгіёнаў Беларусі за апошнія гады. І справа не толькі ў абноўленых вуліцах і новых аб’ектах. Тут большае — жаданне Прэзідэнта ўдыхнуць новае жыццё ў малыя гарады і пасёлкі, зберагчы сапраўдную Беларусь з працавітымі шчодрымі людзьмі.

Паводле яго слоў, такія святы трэба зберагаць.

— З 1994 года Дзень беларускага пісьменства традыцыйна прымаюць розныя гарады. І за гэты доўгі час свя-

та прайшло шлях ад звычайнага культурнага мерапрыемства да аднаго з найбольшых нацыянальных праектаў, без якога ўжо цяжка ўявіць духоўнае жыццё нашых грамадзян, — заўважыў Андрэй Кунцэвіч. — І ўвесь шлях мы прайшлі разам і змаглі пабудаваць мірную і прыгожую Беларусь.

Як пройдзе гэты дзень, мы ўжо ведалі раней. Пра асобныя яркія моманты Дня беларускага пісьменства яшчэ за тыдзень да яго пачатку вялася размова ў Нацыянальным прэс-цэнтры. Ды і друкаваная праграма, якая дасылалася нам, журналістам, красамоўна абяцала надзвычай насычаны дзень.

Вось як пра тое распавядаў Ігар Бузоўскі, намеснік Міністра інфармацыі:

— Дзень беларускага пісьменства ў Бялынічах дасць магчымасць акунуцца ў творчую кніжную атмасферу роднай зямлі. Нам хацелася б, каб гэта падзея закранула ўсіх жыхароў і гасцей краіны. Нараўне з вялікай колькасцю мерапрыемстваў, прысвечаных кнізе, кнігавыданню, пісьменніцкаму асяроддзю, творчым мерапрыемствам, свята варта наведаць у тым ліку і для таго, каб убачыць і іншыя яркія падзеі і славутасці гэтага краю. У прыватнасці, абраз Божай Маці Бялыніцкай, наведаць унікальны для Беларусі музей, у якім можна будзе паслухаць арганную музыку. Пагутарыць з цікавымі людзьмі, прадстаўнікамі навуковых, творчых колаў, пісьменніцкай сферы Беларусі. Акрамя таго, будзе арганізавана яркая канцэртная праграма адкрыцця і фінала мерапрыемства.

Намеснік Міністра адзначыў, што эстафету правядзення Дня беларускага пісьменства на свяце перададуць Капылю Мінскай вобласці. Акрамя таго, увечары 5 верасня прайшоў хрэсны ход удзельнікаў Рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў».

— Гэта не проста праезд па пунктах маршруту, гэта зносіны з людзьмі, размова на духоўныя тэмы, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускай культуры, — падкрэсліў ён.

Напярэдадні свята Ігар Бузоўскі яшчэ акцэнтаваў увагу на важнасці правядзення такога конкурсу, як Нацыянальная літаратурная прэмія:

— Трэба раскручваць сучасных пісьменнікаў, каб пра іх ведалі і гаварылі. Аўтарам варта шукаць агульныя падыходы з чытачамі падчас літаратурных сустрэч, прэзентацый і аўтограф-сесій.

Але ж, лепш адзін раз пабачыць самім, чым пра тое пачуць. У праграме было больш за 30 актыўнасцяў. Толькі паспявай усюды пабываць!

На падставе прапаноў паважаных членаў аргкамітэта асноўнымі «пунктамі» фэста сталі Год малой радзімы, 75-годдзе Вялікай Перамогі, 90-годдзе Уладзіміра Караткевіча. Былі падрыхтаваны шэраг выданняў, у прыватнасці, мастацкі альбом Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, кніга «І маці Божай памалюся» ды іншыя адметныя выданні. Усе найбольш маштабныя мерапрыемствы прайшлі 6 верасня. Сярод іх — урачыстае адкрыццё свята. Для стварэння яго мастацкай канцэпцыі былі выкарыстаны гістарычныя, краязнаўчыя звесткі пра Бялынічы, Магілёўшчыну.

У межах свята праходзіла экспедыцыя «Дарога да святыняў», ладзілася навукова-практычная канферэнцыя «Бялыніцкія чытанні», былі падведзены вынікі конкурсу «Кніга з экрана», а таксама іншыя творчыя спаборніцтвы, што праводзіліся напярэдадні. Стартавала і гістарычная квэст-гульня «Скарб князя Гальшанскага», да якой запрашаліся ўдзельнікі свята. А 5 верасня адбыўся круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго: слова стваральнае і разбуральнае» з удзелам беларускіх і замежных пісьменнікаў з многіх краін свету. Пра тое мы таксама даведаліся раней ад дырэктара — галоўнага рэдактара Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандра Карлюкевіча, якога таксама сустрэлі на свяце.

Сярод заснавальнікаў і арганізатараў круглага стала, які спрые прыцягненню ўвагі да беларускага прыгожага пісьменства ў свеце, — Міністэрства інфармацыі Беларусі, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура». Сустрэча майстроў слова праходзіла ў фармаце Zoom-канферэнцыі, паглядзець яе можна было і ў трансляцыі на YouTube.

Удзельнікамі дыскусіі сталі эксперты з больш чым 10 краін: Беларусі, Расіі, Балгарыі, Сербіі, Малдовы, Украіны, Швецыі ды іншых. Падчас сустрэчы ўдзельнікі абмяркавалі сілу і ўплыў слова не толькі на чалавека, але і

## *Шаноўныя сябры!*

***Шчыра вітаю ўдзельнікаў і гасцей Дня беларускага пісьменства.***
***Гэтае свята — асаблівая падзея ў культурным жыцці Беларусі. На яго пляцоўках адбываецца шматгалосы дыялог майстроў пяра — пісьменнікаў і паэтаў — пра лёс слова і культуры, сучаснасць і будучыню нашага народа. Тут сустракаюцца, узбагачаючы творчую ніву, літаратура, музыка, жывапіс ды іншыя віды мастацтва.***
***Сёлета адно з самых славутых свят незалежнай Беларусі гасцінна вітаюць старажытныя Бялынічы — вядомы цэнтр духоўнасці зямлі беларускай, адметны куток Магілёўшчыны з багатай гісторыяй і надзвычай прыгожай прыродай, знакаміты сваімі таленавітымі творцамі, сярод якіх мастак Вітольд Бялыніцкі-Біруля.***
***Упэўнены, гэтыя вераснёўскія сустрэчы — добрая падстава для кожнага з удзельнікаў і гасцей Дня пісьменства яшчэ раз зразумець, што беларусаў, якіх бы поглядаў яны ні прытрымліваліся, заўсёды аб'ядноўваюць матчына мова, адзіны лёс і Бацькаўшчына. І гэты каштоўны скарб-спадчыну мы павінны зберагчы для нашчадкаў.***
***Сардэчна жадаю ўсім моцнага здароўя, дабрабыту, новых здабыткаў у жыцці і працы.***

**Аляксандр Лукашэнка**

навакольную рэчаіснасць. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства інфармацыі Беларусі, пісьменнікі, выдаўцы, навуковыя супрацоўнікі, прафесары, кандыдаты навук, маркетолагі, публіцысты, журналісты і краязнаўцы.

Да месца будзе сказаць, што Бялынічы падрыхтаваліся да свята пісьменства на выдатна. Вось як пра тое распавядаў раней намеснік старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Валерый Малашка:

— Наш горад і вобласць пасля гэтага свята атрымаюць добрую спадчыну, бо праведзена была грунтоўная падрыхтоўка, якая закранула інфраструктуру горада, транспартныя магістралі і цэлы шэраг аб'ектаў культуры. Безумоўна, пярлінай тут можна лічыць рэканструяваны музей Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, які першапачаткова з'явіўся 50 гадоў таму, а цяпер зноў чакае сваіх наведнікаў. Установа не толькі абсталявана ўсімі сучаснымі тэхналогіямі — у ёй створана безбар'ернае асяроддзе, і гэта зробіць мастацтва даступным шырокаму колу наведнікаў. Звяртаю ўвагу і на такую пляцоўку, як «Лёс зямлі маёй праз слова», дзе адлюстраваны этапы развіцця нашага рэгіёна.

А старшыня Бялыніцкага райвыканкама Васіль Захаранка лічыць, што такая практыка ўладкавання населеных пунктаў і райцэнтраў да значных падзей — выдатная. Бо пасля завяршэння Дня пісьменства, паводле яго словаў, застанецца абноўлены і больш камфортны горад:

— Гэта добра відаць на прыкладзе Бялынічаў. У горадзе амаль цалкам завяршылі капітальны і бягучы рамонт жылля, замянілі інжынерныя сеткі, зрабілі дарогі, добраўпарадкавалі двары і прылеглыя тэрыторыі. Зноўку адбудавалі будынак музея — ад старога застаўся толькі падмурак. Наш кінатэатр стаў мультымедыйным цэнтрам — тут у людзей ёсць магчымасць не толькі паглядзець актуальныя фільмы, але і зайсці ў бібліятэку, выйсці ў інтэрнэт, атрымаць усю неабходную інфармацыю. А парк «Ліпавы гай» стаў сапраўдным месцам адпачынку для нашых жыхароў.

Увесь цэнтр горада ператварыўся ў вялікую пешаходную плошчу. Адна з важных імпрэзаў свята — фестываль кнігі і прэсы, дзе госці маглі не толькі пазнаёміцца з кніжнымі навінкамі Беларусі, але і набыць упадабанае выданне. На цэнтральнай плошчы каля райвыканкама цэнтрам прыцягнення для дзяцей і дарослых стаў «Друкарскі двор»: кожны ахвочы там мог паспрабаваць сябе ў якасці кнігадрукара з мінулага. Для дзяцей гэта была сапраўдная прыгода, а дарослыя таксама маглі даведацца, як нашы продкі друкавалі першыя кнігі. Працавалі і павільёны, пляцоўка «Слова пісьменніка» і многія іншыя, дзе ўдзельнікі і госці Дня беларускага пісьменства змаглі азнаёміцца з кніжнымі навінкамі і сустрэцца з пісьменнікамі. Таксама былі прадстаўлены экспазіцыі перыядычных выданняў рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ. Літаратурныя сустрэчы, прэзентацыі і аўтографсесіі прайшлі на пляцоўцы «Слова пісьменніка».

На фестываль у Бялынічы з'ехаліся рамеснікі з усёй вобласці ды іншых рэгіёнаў. Адзенне і ўпрыгажэнні ручной працы, прадметы побыту, разнастайныя тэматычныя сувеніры… Сваю прадукцыю прадставілі вядучыя прадпрыемствы харчовай прамысловасці рэгіёна: малочная і мясная прадукцыя, хлебабулачныя вырабы, прысмакі і многае іншае. Прыехалі на Дзень пісьменства ў Бялынічы і прамысловыя прадпрыемствы вобласці. Яны не толькі прэзентавалі сваю прадукцыю, але і распавядалі пра гісторыю развіцця іх вытворчасцяў.

Кожны рэгіён Магілёўскай вобласці прыняў удзел у тэматычным блоку «Лёс зямлі маёй праз слова». Было прадстаўлена развіццё Магілёўскай вобласці з часоў беларускага друкара Спірыдона Собаля і да сучасных друкаваных выданняў. Так, Музей гісторыі Магілёва прывёз невялікую выставачную экспазіцыю, дзе размясціліся карціны і кнігі, сярод якіх статут ВКЛ. Круглянскі раён паказаў гасцям Дня пісьменства экспанаты з музея СССР. А дэлегацыя Слаўгарадскага раёна зладзіла тэатралізаванае прадстаўленне, дзе



Падчас адкрыцця Дня беларускага пісьменства



Міністр інфармацыі Ігар Луцкі ўручае Нацыянальную літаратурную прэмію ў жанры «Паэзія» Валерыю Грышкаўцу

***Свята ў Бялынічах дае магчымасць аб'ектыўна ацаніць развіццё рэгіёнаў Беларусі за апошнія гады. І справа тут не толькі ў абноўленых вуліцах і новых аб'ектах. Тут большае — жаданне Прэзідэнта ўдыхнуць новае жыццё ў малыя гарады і пасёлкі, зберагчы сапраўдную Беларусь з працавітымі шчодрымі людзьмі.***

распавядалася пра гісторыю свайго раёна і яго сучаснае жыццё. Таксама ўдзельнікі свята расказалі пра сваю дзейнасць — як установы культуры і адукацыі Магілёўскай вобласці.

Радаваў вока адноўлены будынак Мастацкага музея імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Змянілася і канцэпцыя музея. Адной з цэнтральных экспазіцый засталася галерэя народнага мастака — яна прысвечана творчасці майстра. У той жа зале былі прадстаўлены некаторыя асабістыя яго рэчы. З'явілася і вялікая зала для прывазных выставачных экспазіцый.

Яшчэ адна навінка ў Музеі — зала духоўнасці. Цэнтральным экспанатам стала там там фрэска «Нясенне крыжа, або Узыходжанне на Галгофу». Яе ў канцы 70-х гадоў мастак-рэстаўратар Юры Маліноўскі разам з калегамі выратавалі з разбуранага кляштара кармелітаў у Бялынічах.

Ацаніць новыя залы прыехаў вядомы беларускі мастак, ураджэнец Бялыніцкага раёна Віктар Альшэўскі. Ды не з пустымі рукамі! Падарунак музею ад майстра — новая праца: партрэт Бялыніцкага-Бірулі пад назвай «Залатое палатно Вітольда». Над карцінай мастак працаваў увесь гэты год.

— Кожная карціна — нібы дзіця, якое пачынае расці, — казаў Віктар. — Гэтак жа і палотны. Нараджаючыся, паступова пачынаюць яны пранікаць у свет, куды трапляюць. І мне хацелася б, каб карціна змагла выстаяць у кругавароце падзей гісторыі, захаваўшыся для нашчадкаў. Думаю, гэта жаданне любога майстра, творцы.

А якім радасным быў аўтар скульптурнай кампазіцыі «Яўленне іконы» магілёвец Аляксандр Мінько, які прыехаў на яе адкрыццё ў Бялынічы разам з сям'ёй!

— Я вельмі задаволены вынікам, бо змог увасобіць у жыццё ўсе свае творчыя ідэі. Прыемна, што ў мяне атрымалася стварыць твор, які будзе радаваць не толькі сучасных жыхароў горада, але і іх нашчадкаў, — адзначыў скульптар. І расказаў:

— Праца над скульптурай доўжылася каля трох тыдняў. Каб паспець своечасова, трэба было падтрымліваць вельмі высокі тэмп працы, але гэта ніяк не адбілася на якасці скульптуры. Я хацеў зрабіць цікавую кампазіцыю, якая будзе асацыявацца з гэтым горадам. Так нарадзілася ідэя анёла з абразом. Акрамя таго, я пастараўся дадаць сюды нешта арыгінальнае і цікавае — на крылах анёла прыгожа ўпісаўся ўзор выцінанкі. Гэта незвычайная манера працы з каменем, і падобных скульптур я нідзе не сустракаў.

Дарэчы, памер каменнага анёла — 3х2 м. Скульптура выканана з пакостаўскага граніту. Яе вага — каля 2,5 тон. Яшчэ 75 кг важыць бронзавы абраз, які трымае анёл.

Бронзавы абраз адліваўся па мадэлях скульптара. Як распавёў аўтар, макет ствараўся па вобразе сапраўднай іконы, бо яму, як прызнаўся, хацелася перадаць яе дакладна і праўдападобна.

Відавочна, і скульптура, і музей у Бялынічах — гэта элемент той прыгажосці, без якой наш свет збяднеў бы. Але ўсё ж галоўным героем на свяце ў Бялынічах было Яго Вялікасць Слова! Таму Дзень беларускага пісьменства актыўна засяроджваў жыхароў краіны на вытоках роднай мовы і культуры. Гэтым меркаваннем, варта прыгадаць, з журналістамі дзяліўся Ігар Петрышэнка, намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі, ён жа кіраўнік Нацыянальнага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах.





XXVII Дзень беларускага пісьменства прайшоў 5-6 верасня ў Бялынічах. Увесь цэнтр горада ператварыўся ў вялікую пешаходную плошчу, дзе разгарнуліся фестываль кнігі і прэсы, тэматычныя пляцоўкі кожнага раёна Магілёўскай вобласці, гандлёвыя рады.



У скульптурнай кампазіцыі «Яўленне іконы» ёсць арыгінальная разьба па граніце

*Дзень беларускага пісьменства заснаваны ў 1994 годзе і традыцыйна адзначаецца ў першую нядзелю верасня. Сталіцамі свята становяцца гарады — гістарычныя цэнтры культуры, навукі, літаратуры і кнігадрукавання. За час правядзення Дзень беларускага пісьменства набыў агульнанацыянальны статус, ён стаў значнай падзеяй у культурным жыцці Беларусі. Штогод на свята збіраюцца тысячы гасцей з усёй краіны і замежжа.*

— Наш зямляк Францыск Скарына, — гаварыў ён, — надрукаваў першую кнігу на беларускай мове. Гэта нашы гісторыя і спадчына, якімі мы ганарымся. Дзень пісьменства дае магчымасць папулярызаваць беларускую мову сярод людзей. У нашай краіне дзве дзяржаўныя мовы, і яны для нас раўнацэнныя.

Па словах віцэ-Прэм’ера, на фестываль, які кожны год праходзіць у розных кутках краіны, з’язджаюцца пісьменнікі не толькі з Беларусі, але і бліжэйшых краін.

— Гэта свята — выдатная дыскусійная пляцоўка, дзе пісьменнікі і дзеячы культуры з розных краін абменьваюцца досведам, знаходзяць новыя шляхі далейшага развіцця. Беларускія пісьменнікі працягваюць ствараць цікавыя творы, якія актуальныя як для дарослых, так і для моладзі не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. З боку дзяржавы нашым творчым людзям аказваецца сур’ёзная падтрымка, — падкрэсліў Ігар Петрышэнка.

Лепшыя майстры слова — пісьменнікі, паэты, літаратурныя крытыкі — ушаноўваліся на цырымоніі адкрыцця Дня беларускага пісьменства. Без узнагароды ў сёлетнім літаратурным сезоне засталіся толькі драматургі. На гэтую намінацыю, расказала першая намесніца кіраўніка Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах, была пададзена ўсяго адна праца. Аўтарам лепшай кнігі паэзіі стаў Валерый Грышкавец з Пінска. Яго працу «Застаюся назаўжды…» высока ацанілі і члены журы, і чытачы. Прымаючы ўзнагароду, паэт сказаў:

— Для мяне занятак літаратурнай творчасцю стаў лёсам. Я атрымліваў шмат розных узнагарод, але такую прэстыжную ў Беларусі — упершыню. Вялікі дзякуй тым, хто даў маім творам высокую ацэнку!




На цырымоніі адкрыцця раённага Мастацкага музея імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі



Святочны настрой панаваў усюды

За публіцыстыку ўшанаваны сёлета Ігар Пракаповіч з Паставаў, які пакінуў нашчадкам краязнаўчую спадчыну ў выглядзе кнігі пра малую радзіму «Пастаўшчына».

У намінацыі «Лепшы твор літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўства» перамог вядомы аўтар Іван Саверчанка (кніга «Магія слова»), а ўзнагарода за лепшы літаратурны дэбют — у 18-гадовай Вольгі Нікіценкі: за зборнік вершаў «Сузор'е Птушкі».

Лепшым празаікам журы назвала сёлета Уладзіміра Сцяпана, лепшым дзіцячым пісьменнікам — Кацярыну Хадасевіч-Лісавую. Ім узнагароды і дыпломы члены журы ўручаць у Мінску: па шэрагу абставінаў да Бялынічаў літаратары не даехалі.

Наогул, свята атрымалася вельмі яркім і цікавым. Сабралася шмат гасцей з усёй Беларусі. Былі і прадстаўнікі дыпламатычнага корпусу.

Завяршыўся Дзень пісьменства ў Бялынічах вялікім святочным канцэртам, дзе выступілі зоркі эстрады і заслужаныя калектывы Беларусі: Анатоль Ярмоленка, Алёна Ланская, Вольга Плотнікава, Аляксандр Саладуха, Аляксей Хлястоў, Руслан Аляхно, «Песняры» ды іншыя. А напрыканцы святочнай дзеі быў маляўнічы салют.

Дарэчы, яшчэ адзін цікавы момант святочнага дня — закладка Алеі гарадоў-сталіц Дня беларускага пісьменства. Больш за 20 клёнаў высадзілі ў гарадскім парку ганаровыя госці фестывалю ў Бялынічах.

— Наш парк ужо стаў сапраўднай славутасцю горада. І яго далейшае развіццё, з'яўленне такіх знакавых месцаў, як гэтая алея, дапоўняць і ўпрыгожаць яго, — сказаў старшыня Бялыніцкага райвыканкама Васіль Захаранка.

У кожнага высаджанага дрэва ўсталяваная шыльда, на якой паказана назва горада і год, калі ён прымаў Дзень беларускага пісьменства.

— Дзень пісьменства — гэта свята, якое аб'ядноўвае беларускія гарады, іх жыхароў. Сёння я пасадзіў дрэва, якое сімвалізуе горад Слонім. Летась адтуль перадалі нам эстафету фестывалю. Мы пазнаёміліся, сталі мець зносіны. Нашы спецыялісты ездзілі да калег, даведваліся, як рыхтаваўся горад да свята, — паведаміў Васіль Захаранка. — Мы хочам прадаўжаць традыцыю: сябраваць гарадамі розных абласцей, абменьвацца досведам і ведамі.

Эстафету Дня пісьменства прыняў горад Капыль Мінскай вобласці. Па такім жа прынцыпе, як мы ў мінулым годзе пераймалі досвед Слоніма, цяпер у Бялынічы прыедзе дэлегацыя з Капыля. І так унутры Беларусі гарады становяцца своеасаблівымі гарадамі-пабрацімамі.

Міхаліна **Чаркашына.**

З выкарыстаннем матэрыялаў БелТА.

Фота **БелТА.**




У розныя гады ўрачыстасці праходзілі ў гістарычных і культурных цэнтрах краіны — Полацку, Тураве, Навагрудку, Нясвіжы, Оршы, Пінску, Заслаўі, Мсціславе, Міры, Камянцы, Паставах, Шклове, Барысаве, Смаргоні, Хойніках, Ганцавічах, Глыбокім, Быхаве, Шчучыне

# «ТУТ УСЁ АКАЗАЛАСЯ НА ВЫШЫНІ»

**Як беларускія неўролагі ратуюць жыцці ў самых няпростых выпадках**

Маладому пацыенту з ЗША, які ў выніку інсульту меў параліч канечнасцяў і не мог размаўляць, беларускія нейрахірургі правялі лячэнне ствалавымі клеткамі. З Мінска мужчына ад'язджаў, размаўляючы цэлымі фразамі, і мог самастойна рухацца. Як навыкі беларускіх нейрахірургаў дапамагаюць выратоўваць жыцці ў самых няпростых выпадках, расказаў вядомы нейрахірург, намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ неўралогіі ды нейрахірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Юрый Шанько.



ГАННА ЗАНКОВІЧ

Юрый Шанько

## «Масквічы з інстытута імя Бурдэнкі былі ўражаны»

Летась беларуская нейрахірургія адзначыла свой 70-гадовы юбілей.

— Развіваць яе пачынаў славуты неўролаг, акадэмік Мікалай Грашчанкоў, які ў пасляваенны час прыбыў у нашу краіну і ўзначаліў Прэзідыум НАН Беларусі. З яго ініцыятывы было створана першае нейрахірургічнае аддзяленне, у якое ў хуткім часе прыйшоў працаваць дацэнт Яфрэм Злотнік. Менавіта ён стаў заснавальнікам мікранейрахірургіі ў Савецкім Саюзе. У яго вучыліся многія, у тым ліку выдатны расійскі нейрахірург Аляксандр Канавалаў. У Беларусі першымі пачалі развіваць сасудзістую дыягностыку — ангіяграфію і хірургію анеўрызмаў артэрыяльных і артэрыявянозных мальфармацый — яшчэ ў тыя гады, калі многія лічылі, што з'яўленне анеўрызмаў сасудаў галаўнога мозга абумоўлена сіфілісам, — пачынае са знакавых гістарычных вех прафесар Шанько. 1990-я ён згадвае як «ліхія» і ў медыцыне:

— Не закуплялася абсталяванне, не хапала медыкаментаў, былі вельмі нізкія зарплаты. Працаваць даводзілася на 2–2,5 стаўкі. Акрамя работы ў дзённы час, я браў пяць-шэсць дзяжурстваў па хірургіі, тры-чатыры па неўралогіі, акрамя таго, магло быць 15 дзяжурстваў па санітарнай авіяцыі. Начаваць дома даводзілася далёка не кожны дзень. Самае галоўнае — не было чым працаваць. Амаль адсутнічала абсталяванне, інструменты выходзілі са строю.

Выйсці з цяжкага становішча атрымалася толькі ў канцы 1990-х. Новае развіццё нейрахірургіі пачалося ў 2000-х. Сталічную 5-ю клініку наведаў Кіраўнік дзяржавы, і пасля яго даручэнняў удалося закупіць новае абсталяванне. У прыватнасці, магнітна-рэзанансны тамограф — адзін з першых у краіне, — і аперацыйны мікраскоп.

— Памятаю, як з мяне жартавалі калегі, калі я сядзеў за гэтым мікраскопам. Бо аперацыю, якую яны маглі скончыць гадзіну-дзве, працуючы з бінакулярнай лупай, я завяршаў тры-чатыры гадзіны. Пад мікраскопам большае разрозненне, відаць дробныя структуры — больш уважліва працуеш, ды і развіццё навыку патрабуе часу. Пазней, калі ў нас з'явіліся дадатковыя мікраскопы, у хірургаў узнікла жаданне з імі працаваць, такія аперацыі ўсімі былі асвоены, — згадвае Юрый Шанько.

Ён разам з калегамі развіваў адзін з найскладанейшых кірункаў — хірургію асновы чэрапа, якой была прысвечана яго дысертацыя.

— У 2003 годзе ў Мінску праходзіў з'езд анколагаў СНД, і ўпершыню там працавала секцыя па нейраанкалогіі — пухлінах цэнтральнай нервовай сістэмы. Былі запрошаны і прыехалі выдатныя нейрахірургі: акадэмік Канавалаў са сваімі калегамі з Масквы, прафесар Зельман з Лос-Анджэлеса. І масквічы з інстытута імя Бурдэнкі, а гэта адна з найлепшых нейрахірургічных устаноў свету. Прадставілі матэрыял з 40 выпадкамі краніяфацыяльных рэзекцый, а мы прадставілі матэрыял з больш чым 20! Яны былі надзвычай уражаны, што ў нас развіваецца такі кірунак, — расказвае прафесар Шанько.

Ён тлумачыць, што краніяфацыяльная рэзекцыя — надзвычай складаная аперацыя. Пухліна, часцей за ўсё злаякасная, вырастае з асновы чэрапа адначасова як у яго поласць (у мозг), так і за межы поласці чэрапа — у структуры твару (арбіту вока, нос). Раней пры злаякасных пухлінах выдалялі тую частку, якая знаходзілася ў поласці чэрапа, астатняе апраменьвалі і рабілі хіміятэрапію. Пры гэтым працягласць жыцця была мінімальная, бо частка пухліны заставалася. Краніяфацыяльныя рэзекцыі дазваляюць і выдаліць пухліну з мозга з яго ўчасткам, і рэзецыраваць аснову чэрапа, а таксама тканкі арбіты разам з вокам. Пасля пацыенту робіцца пластыка, а яго працягласць жыцця павялічваецца ў некалькі разоў.

— Адным з найвялікшых адкрыццяў канца XX стагоддзя ў нейрахірургіі лічыцца так званая хірургія замочнай адтуліны, — працягвае Юрый Георгіевіч. — Гэта хірургія праз малыя доступы, напрыклад, праз доступ 2х2 сантыметры можна дабрацца да новаўтварэння памерам 5х7 см і выдаліць яго. Пры гэтым працягласць аперацыі скароціцца, аперацыйная траўма мозга зменшыцца і функцыянальны вынік палепшыцца. Шэсць гадоў мы развіваем гэты кірунак, і лятальныя зыходы пасля такіх аперацый у нас зведзены да абсалютнага мінімуму. А функцыянальныя вынікі сталі лепшыя, і скараціўся час аперацый.

Прычым для выканання гэтых умяшанняў беларускія нейрахірургі выкарыстоўваюць не аперацыйны мікраскоп, а аперацыйны эндаскоп — па прыкладзе амерыканскіх нейрахірургаў з клінікі Пенсільванскага ўніверсітэта. Гэта дазваляе яшчэ больш зменшыць памеры доступу і, адпаведна, аперацыйныя траўмы. Сёння на рахунку айчынных нейрахірургаў больш за 300 такіх умяшанняў, прычым з добрымі вынікамі. Асвойваць гэты кірунак да іх прыязджалі нават калегі з маскоўскага інстытута імя Бурдэнкі.

## «Акадэмік Смеяновіч дагэтуль аперыруе»

Сёння РНПЦ неўралогіі ды нейрахірургіі мае самае сучаснае абсталяванне, у прыватнасці, найноўшыя аперацыйныя мікраскопы і эндаскопы, падрыхтаваных спецыялістаў, каля трох дзясяткаў з якіх у свой час прыйшлі працаваць сюды адразу пасля размеркавання. Сёння гэта высакакласныя нейрахірургі, якія атрымалі практыку ў тым ліку і ў замежных клініках. І самае галоўнае — у цэнтры адкрыты новыя кірункі, якіх няма ў іншых краінах Еўропы і СНД, і ёсць распрацоўкі, якія выклікаюць зайздрасць замежных калег.

Настаўнікамі маладых урачоў становяцца іх сталыя калегі, у прыватнасці, дагэтуль працягвае дзяліцца навыкамі акадэмік Арнольд Смеяновіч.

— Арнольд Фёдаравіч і мой настаўнік, — кажа Юрый Шанько. — Гэта выключны спецыяліст: нягледзячы на паважны ўзрост (акадэміку 82 гады. — **Аўт.**), ён кожны дзень прыходзіць на работу — у аперацыйную. І не проста аперыруе, а выконвае найскладанейшыя ўмяшанні вельмі хутка, якасна, без ускладненняў і з выдатным вынікам. Ён стараецца сачыць і за сваім здароўем, і ў гэтым яму дапамагае адзін з нашых урачоў — Гумен Гарбанеджад. Ён, дарэчы, іранец, скончыў наш медуніверсітэт і застаўся тут працаваць. Авалодаў усімі нашымі метадамі, нават ездзіць з намі ў рэгіёны з лекцыямі аб прафілактыцы тромбаэмбалічных ускладненняў.

Пад кіраўніцтвам акадэміка Смеяновіча праводзяцца даследаванні як па складаных кірунках сучаснай нейрахірургіі, так і больш прыкладныя. З дапамогай аднаго з іх удалося ўстанавіць, што пры пэўных злаякасных пухлінах галаўнога мозга, якія растуць з нервовай тканкі, у працэс пухліннага росту ўмешваецца вірус простага герпесу і робіць яго больш злаякасным. У такім выпадку вынікі могуць быць вельмі неспрыяльныя, нават пры максімальна магчымым лячэнні.

— Ва ўсім свеце працягласць жыцця пацыента з гліябластомай, якая мае 4-ю ступень злаякаснасці, пры выкарыстанні ўсяго арсеналу — хірургіі, прамянёвай тэрапіі, хіміятэрапіі — складае пасля радыкальнага выдалення пухліны 12–14 месяцаў. Пасля частковага — значна менш. Але калі ўдавалася ўздзейнічаць на вірус простага герпесу дастаткова простымі прэпаратамі, то працягласць жыцця гэтых пацыентаў павялічвалася ў некаторых выпадках да чатырох-пяці гадоў, — тлумачыць Юрый Георгіевіч. — Адна з вучаніц Арнольда Фёдаравіча Ганна Барысейка вельмі шырока прадстаўляе гэты матэрыял на міжнародных канферэнцыях, ён заўсёды выклікае захапленне. І мы збіраемся працягваць гэта даследаванне.

Развіваецца ў цэнтры і кірунак эндаваскулярнай хірургіі — без адкрытых умяшанняў, калі пранікненне адбываецца спецыяльным інструментам праз сасуд. Гэта выключэнне артэрыяльных анеўрызмаў, артэрыявянозных мальфармацый, сасудзістай сеткі пухліны, каб аперацыя працякала менш траўматычна. Развіваецца стэрэатаксічная і функцыянальная нейрахірургія, шырока выкарыстоўваецца тэхналогія імплантацыі нейрастымулятараў — іх атрымліваюць усе пацыенты ў краіне, якія маюць у гэтым патрэбу.

## «Паказчыкі выжывальнасці з ЧМТ — адны з лепшых у свеце»

Асаблівую ўвагу ў свой час давялося звярнуць на праблему чэрапна-мазгавых траўмаў.

— Калі ў сусветнай практыцы развіваліся новыя тэхналогіі лячэння ЧМТ, у нас гэта было ў дастаткова запушчаным стане. Міністэрства аховы здароўя звярнула ўвагу на тое, што вынікі неспрыяльныя. Пад кіраўніцтвам Арнольда Смеяновіча быў створаны курс, і мы пачалі вучыць урачоў аперыраваць ЧМТ. Нам давялося развівацца, ездзіць і глядзець, як гэта робіцца ў іншых клініках, запрашаць да сябе спецыялістаў з інстытутаў Бурдэнкі і Скліфасоўскага. З'явіўся наш першы клінічны пратакол, і адбылося неверагоднае. Адсачыўшы статыстыку з 2010 года, мы ўбачылі, што спачатку ў нас было каля 30 выпадкаў смерці на 100 тысяч насельніцтва ў год, і паступова гэты паказчык зніжаўся — да 20, 15 і, нарэшце, да 10. Цяпер ён складае менш за 10 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва ў год. Гэта на ўзроўні найлепшых паказчыкаў у свеце — Германіі, Швецыі, Нарвегіі. Пры тым, што ў ЗША ён 20, ва Украіне — 25–30, сярэдні па Еўропе — 25, у некаторых рэгіёнах Расіі дасягае 40 і 50, — дзеліцца суразмоўца.

Сёння ў Беларусі арганізаваны міжраённыя цэнтры, адлегласць да якіх з любога населенага пункта складае не больш за 70 кіламетраў, што

дазваляе даставіць туды пацыента з інсультам, ЧМТ цягам гадзіны. У такіх клініках ёсць камп'ютарныя тамографы, рэанімацыйныя ложкі і спецыялісты, якія акажуць кваліфікаваную спецыялізаваную дапамогу. У Мінску гэта Бальніца хуткай медыцынскай дапамогі ды 5-я клінічная бальніца. Спецыялісты РНПЦ неўралогіі ды нейрахірургіі падключаюцца на розных этапах і выязджаюць у любую клініку краіны для аперацыі ці кансультацыі: у прыватнасці, і для выканання эндаваскулярных умяшанняў.

— Гэта складаная галіна, якая патрабуе доўгай падрыхтоўкі спецыяліста: за год-два яго не навучыш. І калі ён будзе выконваць толькі 25–50 эндаваскулярных умяшанняў у год, то спецыялістам не стане. Бо трэба рабіць некалькі соцень такіх аперацый штогод, каб авалодаць навыкамі ды адчуваць, як будзе паводзіць сябе анеўрызма, якую ты збіраешся выключыць. Таму працэй накіроўваць у рэгіён спецыяліста з неабходным расходным матэрыялам. А потым, калі хворы выйдзе з цяжкага стану, забраць яго ў Мінск і далей праводзіць лячэнне, — аргументуе Юрый Шанько.

## Па што едуць у Беларусь замежнікі?

Замежныя пацыенты на аперацыйным стале беларускіх нейрахірургаў — таксама не рэдкасць. Прафесар Шанько расказвае паказальны выпадак.

— Малады амерыканец закахаўся ва ўкраінскую дзяўчыну, якая перaехала ў ЗША. Сабраўся з ёй ажаніцца. Але ў яго быў невялікі дэфект — дабраякасная пухліна ніжняй сківіцы. Перад вяселлем ён вырашыў ад недахопу пазбавіцца. У адной з клінік Маямі яму зрабілі аперацыю: выдалілі пухліну, паставілі металічную канструкцыю, якая трымала сківіцу. Даследаванне пухліны паказала, што яна дабраякасная і цалкам выдалена. Можна праводзіць наступны этап хірургічнага лячэння — аперацыю косной пластыкі. Зрабілі і гэта: узялі частку яго падуздышнай косткі, каб запоўніць дэфект ніжняй сківіцы. Пры гэтым аперацыю рабілі падыходам знутры сківіцы, і так атрымалася, што дастаткова доўга была перацiснута ўнутраная сонная артэрыя. Малады чалавек атрымаў інфаркт мозга з развіццём паралічу правых канечнасцяў, поўнай стратай маўлення, прычым інфаркт мозга быў прагрэсуючы. Для таго каб выратаваць мозг, у такіх выпадках выконваецца дэкампрэсійная краніятамія. Яму выдалілі частку косці чэрапа памерам 12х15 см, а калі мозг справіўся з ацёкам, устанавілі тытанавую пласціну. Але параліч і парушэнне маўлення засталіся. Пацыенту правялі максімальна магчымае лячэнне, нават клетачную тэрапію. Ствалавыя клеткі ўводзілі ўнутрывенна. Гэта дапамагло: ён стаў вымаўляць асобныя словы, мог прайсці тры-пяць крокаў уздоўж ложка — і не больш.



Юрый Шанько з калегамі

Дарэчы, такое лячэнне абышлося ў ЗША ў 500 тысяч долараў. Але вынік быў нездавальняючы. Маладога чалавека яго нявеста прывезла на лячэнне ў Беларусь.

— У нас на той момант ужо знайшла сваё развіццё практыка лячэння ачаговых паражэнняў галаўнога мозга з дапамогай ствалавых клетак, але не так, як гэта традыцыйна робіцца ў свеце, — працягвае Юрый Шанько. — Важна не проста ўвесці ствалавыя клеткі, а даставіць іх у галаўны мозг. Калі іх уводзяць праз вену, усяго 0,2 % клетак трапляе ў галаўны мозг, калі праз артэрыю — 2 %. Калі іх уводзіць у спіннамазгавы канал, яны ўвогуле ў мозг не трапяць. Калі непасрэдна ў галаўны мозг з дапамогай стэрыятаксічных прыстасаванняў, то ў месцы ўвядзення ўзнікае ачаг траўмы, і большая частка гэтых клетак спрацуе, каб яго ліквідаваць. Здавалася б, бязвыхадная сітуацыя. Наш інстытут фізіялогіі НАН займаецца гэтай тэмай на чале з акадэмікам Уладзімірам Кульчыцкім шмат гадоў. Існуе дакладная канцэпцыя: ствалавая клетка перамяшчаецца перынеўральна — уздоўж нервовых валокнаў у напрамку руху нервовага імпульсу. Прычым уздоўж не рухальных, а адчувальных нервовых валокнаў. Такім чынам ствалавыя клеткі ў вялікай колькасці трапляюць у галаўны мозг. Ведаючы эксперыментальную падаплёку гэтага метаду, мы адпрацавалі яго ў клініцы, апрабавалі на пацыентах з інфарктамі мозга, унутрымазгавым кровазліццём, якое суправаджаецца другаснымі інфарктамі мозга, цяпер ідзе апрабацыя пры цяжкай чэрапна-мазгавой траўме. І амаль ва ўсіх выпадках такое лячэнне дэманструе выдатны эфект.

Амерыканскаму пацыенту таксама правялі клетачную тэрапію, і ён цягам месяца пачаў размаўляць фразамі, хоць пакуль і невялікімі, і мог самастойна прайсці да 100 метраў. Эфекту ўдалося дасягнуць усяго за адзін курс клетачнай тэрапіі, які абышоўся ў 10 тысяч долараў.

— Калі я спытаў яго блізкіх, ці варта было ехаць у Беларусь, адказ быў адназначны: безумоўна, — дзеліцца суразмоўца. — Цяпер да нас на лячэнне едуць грамадзяне нашых бліжэйшых суседніх краін, і мы плануем заключаць дамовы на сумесныя даследаванні, у першую чаргу з расіянамі. У большасці краін СНД лячэнне ствалавымі клеткамі закрытае. Але гэта вельмі перспектыўны, хоць і складаны кірунак, які патрабуе спецыфічнага абсталявання, навыкаў і лабараторый.

Алена **Кравец**

# ДОМ «ЭЛЕКТРЫЧНАГА ЧАЛАВЕКА»

**Маляўнічыя руіны на беразе Нёмана, за восемдзясят кіламетраў ад Мінска, — родавы маёнтак беларускага вучонага Якуба Наркевіча-Ёдкі, чые даследаванні апярэдзілі свой час. Папулярнасць прафесара Наркевіча-Ёдкі ў навуковых колах сучаснікі параўноўвалі з папулярнасцю Луі Пастэра, а значнасць яго доследаў — з навуковым значэннем адкрыццяў Вільгельма Рэнтгена.**

Навуковыя пошукі беларускага прафесара апярэдзілі свой час. Гэтаму ўнікальнаму навукоўцу належаць адкрыцці ў галіне фізікі, метэаралогіі, медыцыны і псіхалогіі. У сваёй сядзібе ён стварыў адну з першых ва Усходняй Еўропе метэаралагічных станцый. А яго дом можа стаць у перспектыве дзіцяча-юнацкім навуковым цэнтрам, які будзе адкрываць свету новыя імёны ў навуцы.

## Лофт пазамінулага стагоддзя

Якуб Наркевіч-Ёдка паходзіў з багатага шляхецкага роду. Дзед навукоўца, Ануфрый Наркевіч-Ёдка, па некаторых звестках, быў архіварыусам князёў Радзівілаў — чалавекам, набліжаным да ўсёмагутных магнатаў, які ўведзены ва ўсе таямніцы роду.

— У той час род Радзівілаў пачаў паступова бяднець з прычыны разгульнага ладу жыцця некаторых яго прадстаўнікоў. І сёе-тое са сваіх зямель, якія не ўваходзілі ў непадзельную Нясвіжскую ардынацыю, князі прадавалі, — апавядае дырэктарка Уздзенскага раённага гістарычна-краязнаўчага музея Тамара Лухверчык.

У 1823 годзе Ануфрый Наркевіч-Ёдка набыў маёнтак Малыскаўшчына, які раней належаў Радзівілам. А калі пасля паўстання 1830–1831 гадоў ён быў прыгавораны да пажыццёвага зняволення ў сваім маёнтку, стаў будаваць дом. Так пачалася гісторыя палаца Наркевічаў-Ёдкаў. Трэба сказаць, што багацце роду было звязана з гандлем лесам, які яны сплаўлялі па Нёмане, і ў сродках уладальнікі маёнтка абмежаваныя не былі. Але Ануфрый вырашыў не ўзводзіць дом з нуля, а перабудаваць пад палац двухпавярховы радзівілаўскі піваварны завод. Апярэджваць свой час, мабыць, уласціва гэтаму роду: цяпер лофт — памяшканне прамысловага прызначэння, пераабсталяванае пад жыллё — гэта модны кірунак у дызайне інтэр'ераў. Для XIX стагоддзя рашэнне было нетрывіяльнае. Аднак тое, што атрымалася ў выніку, выглядала хоць і нестандартна, але цалкам гарманічна, бо, верагодна, будаўніцтвам займаўся выдатны архітэктар Францішак Яшольд, які спраектаваў і пабудаваў такі шэдэўр, як Косаўскі палац. Будаўнічыя работы ішлі больш за дзесяць гадоў і завяршыліся ўжо пры Атоне, сыне Ануфрыя, у 1840 годзе.

— Палац быў пабудаваны ў стылі барока з элементамі сярэднявечнай готыкі: гэтаму творчаму рашэнню спрыяў першапачатковы будынак — старадаўні бровар вылучаўся тоўстымі сценамі, — тлумачыць дырэктарка Уздзенскага музея. — Каб будынак не выглядаў змрочна, ён быў аздоблены дзвюма вежамі: чатырохграннай і шасціграннай. Прыгожая лесвіца вяла да ўваходных дзвярэй. Калі палац быў дабудаваны, Атон змяніў назву маёнтка Малыскаўшчына на больш гучную: Наднёман.



Уязная брама ўжо адноўлена. Над ёю — герб роду Наркевічаў-Ёдкаў.

## Беларускі Тэсла

«Электрычным чалавекам» называлі Якуба Наркевіча-Ёдку, аднаго з сыноў Атона, французкія навуковыя выданні. А мясцовыя сяляне называлі свайго пана ведзьмаком і шапталіся, што ён запанібрата з Перуном. Наркевіч-Ёдка — аўтар піянерскіх работ па выкарыстанні электрамагнітнага выпрамянення газаразраднай плазмы для візуалізацыі жывых арганізмаў (вынаходнік электраграфіі), па прыёме электрамагнітных хваляў ад электрычных разрадаў у атмасферы на адлегласці да 100 кіламетраў, аўтар метаду электратэрапіі, вядомага і сёння як «сістэма Ёдкі», заснавальнік сістэматычных метэаралагічных і феналагічных назіранняў на тэрыторыі Мінскай губерні, даследчык выкарыстання атмасфернай электрычнай энергіі ў сельскай гаспадарцы.

З маленства Якуб быў вельмі таленавітым хлопчыкам. Шмат у чым дзякуючы адукацыі, якую дала яму, а таксама яго братам і сёстрам маці. Жонка Атона Наркевіча-Ёдкі паходзіла са славутага роду Касцюшкаў, была вельмі адукаваная і перадала дзецям любоў да навукі. А далейшую адукацыю Якаў атрымаў у навучальных установах Фларэнцыі, Вены і ў Сарбоне.

— У тыя часы на ўсёй тэрыторыі сучаснай Беларусі лютавалі сухоты, — расказвае Тамара Лухверчык. — Гэтая хвароба, тады невылечная, пакінула страшны след і ў сям'і Якуба. Ад туберкулёзу памёрлі яго бацька і сястра (ёй было ўсяго 25 гадоў). Менавіта таму лячэнне сухотаў стала адным з асноўных кірункаў медыцынскіх пошукаў навукоўца.

З гэтай мэтай Наркевіч-Ёдка, калі стаў уладальнікам радавога маёнтка пасля смерці бацькі, наладзіў у Наднёмане вытворчасць кумысу (і ў нашы дні пры некаторых формах туберкулёзу прапісваюць кумысатэрапію). Былі закуплены спецыяльныя пароды коней, запрошаныя спецыялісты з Башкірыі, якія займаліся развядзеннем і вытворчасцю гаючага напою. У год выраблялася каля пяці тысяч бутэлек кумысу: тры тысячы — на продаж, дзве тысячы — для ўнутранага карыстання (яны раздаваліся сялянам для лячэння і прафілактыкі сухотаў).

Як пацвярджаюць дакументы Парыжскай медыцынскай супольнасці і Італьянскай медычна-псіхалагічнай супольнасці, якія аб'ядноўвалі спецыялістаў медыцыны таго часу, добры эфект у лячэнні лёгкіх давалі метады магнітатэрапіі, электратэрапіі ды фітатэрапіі, якія ўжываў прафесар Наркевіч-Ёдка.



Адноўлена і вінакурня. Тут плануецца адкрыць кавярню традыцыйнай беларускай кухні.

У 1892 годзе ў Наднёмане прафесар адкрывае санаторый, які неадкладна набывае сусветную вядомасць: сюды ў надзеі на папраўку з'язджаюцца хворыя на сухоты забяспечаныя людзі з усёй Еўропы. Паколькі сухоты вельмі заразныя, санаторый уяўляў сабой камфартабельныя катэджы, кожны — на аднаго пацыента, у светлым сасновым лесе. Таксама былі пабудаваныя ўнікальныя аранжарэі са шкляной сцяной і кабінкамі, каб пацыенты маглі дыхаць гаючым паветрам (дзякуючы карпатліваму падбору высаджаных там раслін) і прымаць сонечныя ванны, не заражаючы адзін аднаго. Паблізу былі адкрыты крыніцы мінеральнай вады — цяпер побач з імі размяшчаецца санаторый Пад'ельнікі.

Лячыў прафесар і бедных пацыентаў. Па сведчаннях сучаснікаў, эфектыўна вылечваў з дапамогай электратэрапіі пашкоджаны пазваночнік, заіканне, алалію, лячыў нервовыя і псіхічныя захворванні. І адкрываў аптэкі ў невялікіх беларускіх населеных пунктах.

Акрамя медыцынскіх і фізічных даследаванняў, шмат займаўся мецэнацтвам. Адпраўляў мясцовую таленавітую моладзь вучыцца за ўласныя сродкі.

— Ён быў землеўладальнік і клапаціўся пра будучыню гэтай зямлі, — тлумачыць Тамара Лухверчык. — Атрымаўшы адукацыю, моладзь часцей за ўсё вярталася працаваць у родныя мясціны.

Цікавыя распрацоўкі пакінуў нашчадкам прафесар Наркевіч-Ёдка ў галіне сельскай гаспадаркі. На эксперыментальных палях з дапамогай металічных штыроў, злучаных пласцінамі глыбока ў глебе, ён вельмі эфектыўна выкарыстоўваў атмасферную электрычнасць для павышэння ўраджайнасці. Глебы па берагах Нёмана бедныя і сёння — занадта пясчаныя. А эксперыментальныя палі Наркевіча-Ёдкі стабільна давалі добрыя ўраджаі. Але значна большым артыкулам даходу, чым земляробства, у Наднёмане была гадоўля мясной жывёлы. Праўда, гэта, хутчэй, — заслуга жонкі прафесара. Вядома, што яна, у адрозненне ад мужа, была жанчына ўладная і жалезнай рукой кіравала значнай — чатыры тысячы гектараў зямлі — гаспадаркай.





Работы па рэканструкцыі палаца яшчэ толькі пачаліся

А яшчэ Якуб Наркевіч-Ёдка ўсталёўваў громаадводы, каб маланкі не наносілі шкоду жылым дамам, але сяляне ставіліся да «панскіх дзівацтваў» з падазрэннем і імкнуліся іх спілаваць. Дарэчы, прафесар узначальваў мясцовае таварыства цвярозасці і, каб наглядным прыкладам паказаць, што можна жыць без алкаголю, ладзіў у маёнтку святы для сваіх сялян з артыстамі і музыкамі, смачнай ежай і прысмакамі, але без кроплі спіртнога.

— Нашчадкі таленавітага роду «электрычнага чалавека» сёння жывуць па ўсім свеце: у ЗША, Канадзе, Польшчы, на Далёкім Усходзе, — адзначае Тамара Лухверчык. — Цікава, што многія з іх — навукоўцы, займаюцца ў асноўным фізікай.

Наступным уладальнікам сядзібы стаў сын Якуба Наркевіча-Ёдкі Кандрат. Пасля рэвалюцыі ён вымушаны быў пакінуць радавыя землі і з'ехаў у Польшчу. У будынку размяшчалася школа механізатараў, а частку пабудоў папросту разабралі на будаўнічы матэрыял — вакол маёнтка ў тыя гады ўзнікла вёска Наднёман. Былі зняты падлогі і столі з каштоўных парод дрэва. Навуковае абсталяванне вывезлі, багацці палаца бясследна зніклі. Да 1941 года там месціўся дзіцячы санаторый. А падчас вайны партызаны ўзарвалі дом, каб немцы не размясцілі ў ім свой штаб. Зрэшты, будынак быў пабудаваны як мае быць і паваліўся не цалкам — галоўная вежа рассыпалася толькі ў 1994 годзе.

## Наднёманскі «Хогвартс»

У студзені 2011 года з ініцыятывы навукоўцаў БДУ быў створаны дабрачынны фонд развіцця навукі, інавацыйных тэхналогій і культуры імя прафесара Якуба Наркевіча-Ёдкі пад старшынствам выкладчыка БДУ Уладзіміра Аляксандравіча Самуйлава. Неўзабаве пачалася рэстаўрацыя палаца ды іншых сядзібных пабудоў, якая ажыццяўляецца на сродкі дабрачынцаў і спонсарскую дапамогу. У прыватнасці, сур'ёзны ўнёсак у аднаўленне помніка архітэктуры зрабілі Міжнародны дабрачынны фонд «Навука вакол нас», навуковец-фізік, сузаснавальнік міжнароднай кампаніі EPAM Systems Леанід Лознер і асабіста Уладзімір Самуйлаў, у мінулым выкладчык БДУ, а цяпер — супрацоўнік аднаго з універсітэтаў ЗША. Паколькі работы вядуцца на сродкі дабрачынцаў, яны ідуць павольна. Але ўжо аднаўлены ўязная брама з гербам роду Наркевічаў-Ёдкаў і вінакурня, дзе ў будучыні плануецца адкрыць кавярню. Сам палац пакуль ляжыць у руінах. Але работы над яго аднаўленнем ужо пачаліся.

— Рэканструкцыя будзе строга гістарычнай, — падкрэслівае дырэктар музея. — Пры аднаўленні старанна захоўваецца кожны кавалачак старадаўняга мура, усё тое нямногае, што дайшло да нашых дзён.

Нават прыкладных тэрмінаў завяршэння рэканструкцыі суразмоўніца назваць не змагла. Але планы выкарыстання рэканструяванага будынка ўжо ёсць: там адкрыецца Міжнародны навукова-адукацыйны цэнтр для адоранай моладзі. Плануецца, што ў Наднёман будуць прыязджаць на лета таленавітыя да натуральных навук дзеці з усяго свету.

— Будуць лабараторыі, канферэнц-зала, гасцініца, — пералічвае суразмоўніца. — З дзецьмі будуць займацца ўніверсітэцкія выкладчыкі. А яшчэ з дапамогай камп'ютарнай графікі плануецца ўзнавіць навуковую лабараторыю XIX стагоддзя, куды можна будзе «трапіць», надзеўшы акуляры віртуальнай рэальнасці. Але і рэальнае абсталяванне лабараторыі натуральных навук сярэдзіны пазамінулага стагоддзя ў адведзеных пад музей памяшканнях палаца таксама будзе. Частка прадметаў таго перыяду ўжо закуплена ў ЗША, — расказвае Тамара Пятроўна. Ад усяго таго, што пакінуў у радавым гняздзе, ад'язджаючы з яго назаўжды, сын «электрычнага чалавека», да нашых дзён цудам «дажыло» толькі адно крэсла. Цяпер яно захоўваецца ва Уздзенскім краязнаўчым музеі.

Аляксандра **Анцэлевіч**

# Леанід Екель: «ШУКАЮ ГУЧАННЕ...»

**Ён — легендарны журналіст, нарысіст, які ў гэтай прафесіі ўсё свядомае жыццё. Майстар слова, аўтар-укладальнік амаль дзясятка кніг у сваім працоўным арсенале выкарыстоўвае з падручных сродкаў толькі нататнік і ручку.**

## Як прайсці ў бібліятэку?

Неяк у мяне знік інтэрнэт у той момант, калі быў вельмі патрэбны: якраз працавала над матэрыялам пра здаровы лад жыцця. Дзе ж узяць звесткі пра карысць і шкоду розных прадуктаў? Не ехаць жа гартаць кнігу па дыеталогіі ў бібліятэку! Тэкст трэба дарабіць тэрмінова і адправіць па электроннай пошце ў рэдакцыю. І раптам я задумалася: а як раней спраўляліся журналісты з такімі задачамі? Бо інтэрнэту ж не было, а дэдлайн — быў, хоць і зваўся па-іншаму. Захацелася пагутарыць з кімсьці з мэтраў журналістыкі ды павучыцца ў яго жыць у прафесіі без віртуальнай рэальнасці.


STUDLIVE.BY
Леанід Екель

Кандыдатуру для зносін і ўзбагачэння асабістага досведу доўга не шукала: Леанід Сямёнавіч Екель — фігура ў нас вядомая. Тры гады таму адсвяткаваў 70-гадовыя ўгодкі, на якіх атрымаў Ганаровую грамату Адміністрацыі Прэзідэнта. З Екелем звязваюць залаты век газеты «Знамя юности», выхад якой кожны раз станавіўся падзеяй дзякуючы таленавітаму кіраўніцтву Леаніда Сямёнавіча. Наклад газеты тады, у савецкі час, складаў 940 тысяч асобнікаў. Працуе журналіст і сёння: нарысы Майстра слова можна чытаць на партале Выдавецкага дома «СБ. Беларусь сегодня». У кожным раскрываецца глыбокая душа аўтара і трапяткое яго стаўленне да непаўторнай асобы героя артыкула. Некаторыя ўвогуле немагчыма чытаць без камяка ў горле.

Сустрэцца з Леанідам Сямёнавічам я дамовілася ля ўвахода ў мінскую Купалаўскую бібліятэку — у яе зале яго ўлюбёнае месца працы над тэкстамі. Праўда, да гэтага мела нялёгкую размову па тэлефоне: прыйшлося ўгаворваць заслужанага журналіста пагутарыць са мной. «Я зусім не той, хто вам патрэбны! Не карыстаюся інтэрнэтам і не хачу! У мяне ёсць толькі ручка і нататнік. Вам не будзе пра што са мной размаўляць…» Дык гэта ж цудоўна! Мне патрэбен менавіта той, хто ні разу «ў вочы» не бачыў інтэрнэт. Я нават адважуся сказаць, што сёння гэта ўнікальная з'ява. Бо цяпер людзей усіх узростаў імкнуцца далучыць да высокіх тэхналогій.

Увогуле, сышліся на тым, што пакажу Леаніду Сямёнавічу свае пытанні, і ён сам вырашыць зыход нашай сустрэчы. Пагутарыць мы вырашылі на вуліцы, каб не парушаць цішыню ў чытацкай зале бібліятэкі. Тым больш, што надвор'е спрыяла. Мы прыселі на лаўцы пад прыгожым разгалістым клёнам. Леанід Сямёнавіч беражліва дастаў з чахла свае акуляры, уважліва прачытаў пытанні, часам ціха пасмейваючыся. «Ну добра, давайце раскажу», — так пачалося апавяданне нарысіста пра самога сябе.

## Споведзь шчаслівага чалавека

— З самага ранняга дзяцінства я ўжо ведаў, што буду журналістам. Вельмі трапятліва ставіўся да кнігі. Усё, што можна было прачытаць у школьнай, сельскай бібліятэцы, «елася» мною «взахлёб» з велізарным апетытам і прагнасцю. Памятаю, лета… Івацэвіцкі раён, вёска Заполле… А мы жылі на хутары, гэта яшчэ далей на 3 км. Мне 15 гадоў. Дамашняй працы — рабіць-не перарабіць, нагрузка велізарная! І ўсё роўна я знаходзіў час, каб выска-

чыць з хаты ў сельскую бібліятэку. Не перадаць словамі адчуванне радасці ад таго, што можна ўзяць і гэтую кнігу, і вунь тую!.. Рукі самі цягнуцца дастаць яе с паліцы. Возьмеш, ідзеш назад. І не па дарозе, а выбіраеш такі шлях, каб адгарадзіцца ад навакольнага свету. Зашыешся ў жыта па калена, яно так прыемна каласіцца… Кніжку раскрыў — забыўся пра ўсё на свеце. Чытаеш, аналізуеш: як жа аўтару ўдалося з самых простых слоў пабудаваць цэлы вобраз?! Мне вельмі хацелася разабрацца ў тым, зразумець… Ведаеце, я ж сам рабіў школьную газету, ад пачатку і да канца. Потым пайшоў у Косаўскую сярэднюю школу — які там быў настаўнік, Якаў Дзмітрыевіч Янчанка! Надзвычайная асоба! Я ганаруся тым, што здолеў напісаць пра яго нарыс, распавесці пра гэтага дзівоснага чалавека...

І Леанід Сямёнавіч надоўга змаўкае. І я маўчу разам з ім, «разглядаючы» ажыўшы перада мной вобраз жыта і раскрытую у руцэ кнігу… Эх, мне б туды хоць на гадзінку!..

АЛІСА ГЮНГЕР



Дом Журналіста ў Мінску

Падчас нашай размовы Леанід Сямёнавіч неаднаразова паўтарае «надзвычайная асоба, дзівосны чалавек», кажучы пра шмат каго. Гэта рэдкая, на мой погляд, якасць — умець быць шчыра ўдзячным усім тым, з кім зводзіць цябе лёс.

— Я зразумеў, што сапраўднае чалавечае шчасце — гэта здолець напісаць, распавесці пра дзівоснага чалавека. Нарыс для мяне — гэта як ікона для верніка, гэта святое. Нарыс — найлепшы жанр! Ён раскрывае чалавека, яго непаўторнасць. З аднаго боку, ты сам раскрываешся як аўтар, паказваеш сваю заможнасць; з другога боку — распавядаеш пра іншага чалавека. Ва ўсіх жыццё ў нечым падобнае: дзяцінства, юнацтва, сталенне, праца, кар’ера, выхад на пенсію… Але ў той жа час у кожнага — свой лёс. Ён праяўляецца ў маленькіх, няўлоўных дробязях. І разгаварыць да іх чалавека — ой як часам цяжка. Бывае, і пяць гадзін гутарым, і больш. Надзвычай стамляюся!

***— Хто вашы героі?***

— У мяне заўсёды была цяга да людзей вёскі. Здаецца, ну колькі нарысаў можна пісаць пра галоўнага агранома ці тэхнара, даярку, трактарыста? Ды бясконца! Чалавечае жыццё вельмі багатае.

***— Леанід Сямёнавіч, вы ўсё жыццё займаліся тым, чым хацелі, — пісалі?***

— Абсалютна! Пасля школы паехаў на камсамольскую будоўлю ў Архангельск. Будавалі на беразе Паўночнай Дзвіны мараходку. Там я трапіў на Паўночны флот, на службу, і не куды-небудзь, а ў газету «За Родину», фотакарэспандэнтам! Ніколі камеру ў руках не трымаў, а тут далі мне старэнькі фотаапарат «Киев». Было мне тады недзе 18 гадоў. Тры гады працаваў, потым вярнуўся дадому. Сям’я пераехала ўжо з хутара ў Заполле. Я пару дзён адпачыў і — наўпрост у брэсцкую абласную газету «Заря», без вышэйшай адукацыі. Думаеце, лёгка было туды трапіць? Сам сабе дзіўлюся: хапіла ж мужнасці, упартасці, нахабства… *(смяецца)*. Заходжу да галоўнага рэдактара, паказваю яму свае газетныя выразкі. Ён паглядзеў, пагартаў і кажа: «Таварыш Екель, дык вы — гатовы журналіст! Але месцаў у нас няма». Разам пачалі шукаць мне рэдакцыю. У Івацэвічах няма, у Бярозе няма… У Маларыце ёсць! Я адразу паехаў. Там пазнаёміўся з Яраславам Сельвестравічам Пархутам — ой, які гэта чалавек, якая асоба!.. Я атрымліваў велізарнае задавальненне ад усіх месцаў, дзе працаваў. Ніколі не было трывогі, ці спраўлюся. Спакойна разумеў: гэта маё. Так, не хапае досведу, навыкаў. Не страшна! Увогуле, прапрацаваў у Маларыце год. Потым адразу паступіў на журфак БДУ. Памятаю, яшчэ цяльняшачка выглядала з-пад кашулі... Так і празвалі мяне — мараком. Эх, як усё добра складвалася! У 1977 годзе я ўжо — загадчык аддзела камсамольскага жыцця ў «Знамя юности» быў. Гэта самы складаны аддзел: нялёгка распавядаць пра сутнасць камсамольскай працы. Дастаткова нецікавая тэма, ніхто асабліва пра гэта не пісаў. Усё трэба было самому ствараць. Праз два гады — я ўжо загадчык аддзела прапаганды, затым — адказны сакратар, потым — намеснік галоўнага рэдактара. «Знамёночке» сваёй аддаў 10 гадоў. А ў 1988 годзе ствараецца часопіс «Крыніца», у яго за год — 400 000 тыраж па ўсім СССР, каля 40 старонак у нумары. Ідэя часопіса — выхоўваць моладзь на патрыятызме. Склад рэдакцыі, вядома, быў залаты: Уладзімір Някляеў — галоўны рэдактар, Міхаіл Кацюшэнка — намеснік, і я таксама, Павел Якубовіч — загадчык аддзела публіцыстыкі. Праз гады ён мяне запрасіў у «СБ. Беларусь сегодня», дзе працаваў галоўным рэдактарам. Вось, пішу цяпер нарысы ўжо больш за дзесяць гадоў.

***— Раскажыце пра Беларускі саюз журналістаў, які вы ўзначальвалі 15 гадоў. Вы ж таксама і Дом Журналіста пабудавалі?***

— Так. Спачатку ўсё добра было, нас за савецкім часам фінансавала Масква. У сталіцу ж пералічваўся працэнт ад ганарараў журналістаў, і набягала прыстойная сума. Прыстойная да такой ступені, што мы маглі тым, хто мае вострую патрэбу ў жыллі, вылучаць у год па 3–4 кватэры. Пуцёўкі за мяжу давалі. У 70-я гады ЦК КПБ і Савет Міністраў прынялі Пастанову аб выдзяленні ўчастка пад будаўніцтва Дома Журналіста ў Мінску, бо ў нас быў проста арэндны асабнячок. Але наступіў складаны 90-ы год. Фінансаванне



ІВАН ЖДАНОВІЧ

Леанід Екель адзначае 70-годдзе з калегамі з газеты «СБ. Беларусь сегодня»

**_Калі ў руцэ нататнік і ручка — нараджаецца нешта новае. І гэта нельга паставіць на колы, механізаваць. Кожны радок з цябе жыўцом льецца. Ты яго бачыш, адчуваеш, усведамляеш…_**

спынілася — а свайго нічога ж няма! Дакладней, грошы былі, але яны ператварыліся ў пыл. Ох, гэтая пара перабудовы… Трывога вісела ў паветры. Усе грамадскія арганізацыі разумелі добра, што будуць кінутыя. Выдзеленую нам тэрыторыю канфіскавалі, бо на працягу пэўнага тэрміну не было распачата будаўніцтва. Што рабіць? Гэта канец! І вось я вырашаю пайсці да Уладзіміра Васільевіча Ярмошына, мэра Мінска, і — вяртаю нам участак! Гэта быў 1991 год. Ярмошын — чалавек наймудрэйшы! Не спытаў, а за што будаваць будзем. Адказу я і сам тады не ведаў. Але потым мяне натхніў спосаб будаўніцтва Юрыя Лужкова, маскоўскага мэра. Ён знаходзіў людзей, якія валодалі вялікімі капіталамі, і будаваў сумесна з імі. Так і я зрабіў: знайшоў прыватніка, які пабудаваў трохпавярхоўку за свае грошы, і ўзяў сабе пад Дома Журналіста адзін паверх — каля 900 кв. м. Вось такая гісторыя ўзнікнення вядомага цяпер многім будынка.

**_— Давайце вернемся да працоўных будняў у вашай газеце. Як ішоў працэс выпуску нумара? Вы самі карысталіся друкарскай машынкай?_**

— Я заўсёды пісаў ад рукі, і па гэты час так пішу. Не прызнаю дыктафоны і камп'ютары. Потым аддаю тэкст машыністцы, яна набірае і вяртае мне ўжо надрукаваны матэрыял. Дарэчы, згаданы Павел Якубовіч быў геніяльным у гэтым плане чалавекам: умеў дзвюм машыністкам адначасова два розныя тэксты нагаворваць: Лоры — фельетон, Зоі — спартыўны агляд. Больш я такіх людзей не бачыў. Затым я аддаю свой матэрыял з фатаграфіяй адказнаму сакратару. А калі сам ім быў, значыць, з левай рукі ў правую перакладаю *(смяемся)*. Разам з намеснікамі вырашаем, што будзе і дзе размешчана на паласе. Робіцца макет на паперы, па радках усё падлічваецца ўручную і аддаецца ў цэх. Там ёсць адказны за выпуск, ён вярстае радкі. Была спецыяльная металічная рама дакладна па фармаце паласы, радок да радка падганяўся згодна макету, бабашкамі замацоўваўся па вышыні і шырыні, і ўсё пераводзілася на тоненькую металічную пласціну, накшталт пячаткі. А загалоўкі набіраліся ўручную, былі для гэтага адпаведныя шрыфты.

**_— Вельмі складана ўявіць сабе гэты працэс журналісту, які з першага працоўнага дня сядзіць за кам'ютарам з доступам у інтэрнэт. Што скажаце пра сучасную журналістыку?_**

— Я шмат думаў пра гэта. Асноўная асаблівасць цяперашняй журналістыкі ў тым, што чалавек выконвае функцыю журналіста. Няма прафесіі. Раней думка нараджалася, а цяпер яе фармулююць. Інтэрнэт і ўсё астатняе, уся гэтая ўседаступнасць… Яна не тое, каб спрасціла ісціну, проста сышла душа, а прафесія стала рамяством. Але калі ў руцэ нататнік і ручка — нараджаецца нешта новае. І гэта нельга паставіць на колы, механізаваць. Кожны радок з цябе жыўцом льецца. Ты яго бачыш, адчуваеш, усведамляеш… Я, бывае, па сем разоў фразу ўслых прамаўляю. Агучыў — не тое, нешта язык драпае. Шукаю гучанне. А калі запісаў на дыктафон, зняў, пераклаў на паперу — гэта мёртвае. Для мяне — непрымальна набраць шмат матэрыялаў з інтэрнэту ці яшчэ аднекуль, скампіляваць. Калі ў галаве ідзе працэс — вось гэта творчасць!

**_— Як думаеце, друкаваныя СМІ памруць? Услед за тэатрам, якому ўжо даўно прадказваюць смерць…_**

— Не памруць, нас проста палохаюць. Кніга не страціла сваю каштоўнасць, проста яна «засунута» цяпер. Але як можна пазбавіць чалавецтва такой асалоды, калі адкрыў старонку — і новы свет расхінуўся?!

**_— Што параіце маладым журналістам?_**

— Мяне часта запрашаюць да студэнтаў, і я ім заўсёды кажу: пішыце нарысы! Гэта лепшае, што прыдумана чалавецтвам. Толькі тады можна адбыцца як журналіст. Проста ўхапіць інфармацыю і перадаць яе — тады ты толькі сродак. А журналіст удзельнічае ў працэсе нараджэння Слова. Пачынаючы з чыстага белага аркуша і першага радка…

***

Паўтары гадзіны размовы пад разгалістым клёнам з Леанідам Сямёнавічам, які адказваў на падрыхтаваныя мною пытанні, пранесліся незаўважна. Мне падалося, што мы толькі пачалі размову. Не інтэрв'ю, а шчырую размову, як кажуць «по душам». Калі адчуваеш, што зносіны цябе насычаюць чымсьці неацэнна важным, унутрана ўзбагачаюць. Карацей, калі атрымліваеш эмацыйнае задавальненне. Ох, ужо гэтая хуткаплыннасць часу! Воляй-няволяй апускаешся ў яе — і ледзь не губляеш сэнс жыцця. І як выдатна, што на шляху часам сустракаюцца людзі, дзякуючы якім успамінаеш: сэнс і ў тым, каб больш адчуваць.

Гутарыла Аліса **Гюнгер**

# ТАРЫФ — ЖЫЦЦЁВЫ



**Калі зазірнуць у сябе, разумееш: так, усе мы родам з дзяцінства. Часам крыўдлівыя больш меры, часам не лагічна ўпартыя, нават зайздросныя... Тым не менш, мы — жыццёвы прыклад для сваіх дзяцей. А яны — наша люстэрка. Таму, як кажуць псіхолагі, хочаш змяніць свет вакол — пачні з сябе.**

Пагаварыць пра тое, як дарослым лепш выхаваць сваіх дзяцей у перыяд пандэміі эмацыйнага спусташэння і інфармацыйных войн, я вырашыла з **псіхолагам, сэксолагам, журналісткай аўдыёвізуальных СМІ, даследчыцай у галіне псіхалагічных навук, старшай выкладчыцай кафедры тэлебачання і радыёвяшчання факультэта журналістыкі БДУ Аксанай Катрэнкай.**

*— Неяк у інтэрнэце бачыла фотаздымак: пасярод пустой, перакрытай паліцыяй плошчы стаіць хлопчык. Блізка стаіць і глядзіць на «жывы плот». Не ўяўляю, пра што дзіця думала ў той момант. А яго бацькі?.. Аксана Адамаўна, наколькі дзяцей можна паглыбляць у праблемы дарослых?*

— Ідэальны варыянт, калі ў сям'і ўсталёўваюцца дакладныя правілы. Напрыклад, праблемы, якія могуць перагрузіць псіхіку дзіцяці, трэба вырашаць без яго. Асабліва гэта тычыцца дзяцей 9–10-гадовага ўзросту. Іх няўстойлівую псіхіку лёгка траўмаваць з-за высокай ступені ўнушальнасці, гэта даказана навукоўцамі. І нават калі мама з татам моўчкі глядзяць відэа з негатыўным пасылам, у дзіцяці такі кантэнт можа выклікаць страх, нават панічную атаку. Дзеці ўсё ўбіраюць як губка. «Мама, у нас будзе вайна?» Здавалася б, адкуль дзіця можа яе баяцца? Такога страху ў яго апрыёры быць не можа. Але ёсць паняцце — калектыўнае несвядомае, калі ў інфармацыйным полі існуе глыбінны страх той жа вайны, што перадаецца з пакалення ў пакаленне. І нешта дзіця ўбачыла на экране, гэта зрэзаніравала з яго падсвядомасцю. Мы можам нічога не казаць, але спаць гэтай ноччу малое будзе дрэнна. І яшчэ: калі нешта выносіцца на сямейную раду, мама з татам павінны разумець: тое, што адбываецца дома, дзіця панясе ў школу. Увогуле, асноўны крытэрый, паглыбляць яго ў нейкую тэму ці не, гэта адказ для сабе на пытанне: ці я не нашкоджу яму? Ці прынясе карысць гэтая размова? Бо ў малых усе страхі ірацыянальныя. Яны могуць любога чалавека ўспрымаць як мульцяшнага героя, нават прэзідэнта. І, вядома, калі дзіцяці тры гады, зусім неабавязкова абмяркоўваць пры ім палітыку, асабліва калі ў сям'і ёсць розныя меркаванні на гэты конт.

*— Інтэрнэт, як сімвал уседаступнасці, можна любіць ці ненавідзець, але быць абыякавым, як той казаў, да яго нельга. Бо ён — у кожным доме і кожнай сям'і, нават у розумах нашых неакрэплых псіхічна дзяцей. Канешне, роўтар можна ад іх схаваць, а мабільную перадачу дадзеных адключыць. Але калі дзіцё выходзіць на вуліцу, яно ўсё роўна трапляе ў інфармацыйнае поле са сваімі спакусамі і фэйкамі. І як тады зберагчы непаўналетняе дзіця ад усяго лішняга?*

— Да трох гадоў катэгарычна не рэкамендую паказваць яму рухомую карцінку. Я пра тэлевізары і камп'ютары кажу. Цяпер модна ўключаць дзіцяці розныя развівальныя мульцікі са стракатымі кадрамі, якія хутка змяняюцца. Гэта прычыняе вялікую шкоду развіццю малога, яго мозгу, зроку. Пра тое навукоўцы ўсяго света «крычаць». У мяне асабіста на гэтую тэму даследавана больш за





450 крыніц, з іх 140 на англійскай мове. Выпраўляць такія памылкі вельмі складана. Дзіцяці трэба, каб мама была побач, шкадавала яго, карміла грудзямі, трымала на руках. І ўсё! Калі бацькі разумеюць, што яны фарміруюць асобу дзіцяці, праблем потым у прынцыпе быць не павінна ў дыялогу з дзецьмі. Выхаванне пачынаецца з закладкі каштоўнаснай базы, фарміравання эмацыйнага інтэлекту, выбудоўвання глыбокага ўзроўню даверу. Калі я цябе нарадзіла не для таго, каб ты мне на старасці шклянку вады прынёс, а таму, што хацела, каб ты быў. Я цябе люблю таму, што ты ёсць.

***— Гэта ідэальная мадэль узаемаадносін. І нават калі яе атрымоўваецца выбудаваць, дзіця аднойчы выходзіць у соцыум і бачыць, як яго аднагодкі «сэлфяцца» ды выкладаюць свае відэа ў сацсеткі… Узнікае пытанне: мама, а можна я таксама?..***

— У выніку сваіх даследаванняў я зрабіла выснову, што ва ўзросце 9–10 гадоў пачынаецца перыяд каштоўнаснай пераарыентацыі. Калі з аднаго боку разумееш, што трэба быць добрым, сумленным, сачыць за здароўем і добра вучыцца, а з другога — хочацца, каб у цябе ўжо «быў хлопец», а лепш два ці татуіроўкі на руцэ, пакуль намаляваныя маркерам. Дзеці кідаюцца з адной крайнасці ў іншую. Цяпер, мабыць, кожны з іх хоча стаць блогерам. Усе гэтыя здымкі абы якія ды проста жудасныя сябе любімага — дэманстрацыя дарослаcці. Бацькі павінны дапамагчы выстаяць у перыяд такой разбалансіроўкі. Прапануйце выбар з адабранага вамі матэрыялу. Гэта значыць, самі яго арыентуйце. Пастаянна, штодня, штогадзіна! Хочаш стаць блогерам? Выдатна! Прынясі мне канцэпцыю твайго кантэнту. Мама, а што такое канцэпцыя?.. Так, крок за крокам «выцягвайце» дзіця з інфармацыйнага смецця, у якім яно, магчыма, ужо загразла, вучыце яго дзяліць збожжа ад пустазелля.

***— А потым прыходзіць са школы такі разумны і правільны хлопец ці дачка і са слязамі заяўляе, што ён — белая варона.***

— Згодна, не такі як усе. Асаблівы. Але давайце прызнаемся шчыра: кожны з нас мае ў сабе гэта пачуццё. Проста ў многіх яно скажонае. Развівайце ў дзецях самапавагу, любоў да сябе, уменне дараваць сабе і іншым. Не трэба ні на каго крыўдзіцца, пакідаючы права чалавеку здзейсніць той ці іншы ўчынак. Белая варона? Ну і што! Нас не могуць любіць усе. Так, у цябе няма сотавага тэлефона, але ў параўнанні з Васем у цябе ўсё не так і дрэнна: ёсць мудрыя бацькі, яны цябе шчыра любяць. А ў Васі зашмат тэлефонаў і няма разумення сэнсу жыцця, ён не імкнецца да развіцця і пакрыўджаны на ўвесь свет. Аднаўляйце з дзіцем каштоўнасны баланс.

***— Нават не ўсе бацькі ўмеюць гэта рабіць. Ды што там аднаўляць баланс! Хаця б проста навучыцца разумець свае эмоцыі …***

— На жаль, нас гэтаму не вучаць. Хоць, здавалася б, ёсць мноства псіхалагічных цэнтраў, вэбінараў, семінараў. І нават з бясплатным першым заняткам! Але не хапае ў іх глыбіні і шматвектарнасці, цэласнасці, сістэмнасці. Інфармацыя даецца кавалкамі і ўспрымаецца фрагментарна. Зацікавілі, а далей — заплаці. І нават калі заплаціш — часта нічога для сябе не ўсведамляеш. Хацелася б мець сістэму «пад ключ», каб яна падказвала, дапамагала чалавеку разабрацца з самім сабой. Дарэчы, у мяне ёсць ідэя, як стварыць такі праект.

***— Ёсць кароткія парады: як эмацыйна не выгараць?***

— Нармуйце свой распарадак дня. Сон, харчаванне, фізічныя нагрузкі — базавыя патрэбы і дарослага, і дзіця. Бо малыя таксама эмацыйна выгараюць. Ну і псіхічны складнік, безумоўна, важны: усё, што мы робім, павінна прыносіць радасць. Таму не «трэба рабіць урокі!», а тлумачым іх карысць, разважаем пра плюсы і мінусы навучання. Бо школа — гэта падмурак, яна дае магчымасць пазнаёміцца з усімі сферамі жыцця і выбраць сваю. І ў дарослых школа жыцця — такі ж падмурак, на якой будуем сваю асобу. Як ні круці, мы ўсе знаходзімся ў пэўнай сістэме, якую немагчыма ігнараваць.



***— Успомніла свае падлеткавыя дыскусіі пра тое, ці можна заставацца свабодным, знаходзячыся ў рамках той ці іншай сістэмы. У самы крызісны перыяд мне здавалася, што жыццё — гэта турма.***

— А што такое ўнутраная свабода? Гэта пачуццё любові да сябе, прыняцце сябе. Калі разумееш, што ты — асобная планета, самакаштоўнасць. Ведаеш сваё прызначэнне, ведаеш, што ты на сваім месцы, робіш тое, што хочаш, што душа просіць. Разумееш, чаму ты тут. Не абмяжоўваеш кагосьці і не дазваляеш абмяжоўваць сябе. Усё гэта і дае адчуванне ўнутранай свабоды. Чалавек, што яе атрымаў — заўсёды яркая асоба, якая не баіцца асуджэння з боку, мае свой пункт гледжання, але ўлічвае «правілы гульні». Ну і, вядома, страхі перашкаджаюць унутранай свабодзе.

***— Ужо даўно назіраю тэндэнцыю ўседазволенасці, калі дзіця, напрыклад, мае права самастойна выбіраць сабе віды адпачынку, і мяне тое насцярожвае. Ці заўсёды трэба прыслухоўвацца да жаданняў непаўналетняй асобы, якая просіць купіць такі ж гаджэт, як у Васі, або пафарбаваць валасы ў ружовы колер, бо ўсе сяброўкі ўжо зрабілі гэта?***

— Калі мама не хоча спаліць псіхіку дзіцяці, то ёй неабходна абмяжоўваць яго ад рознага роду «спакусаў». Калі дазволіць глядзець і рабіць усё, што хочацца і колькі хочацца, дзіця проста «згарыць». І тое, што было ўкладзена ў яго да гэтага, можна перакрэсліць. Пачнецца разбуральны дысбаланс, які ў дзяцей і так перыядычна ўзнікае ў сілу фізіялогіі. Што тычыцца бясконцых дзіцячых «хачушак», тут проста трэба быць разумнымі. Дзесьці даем права выбару. Недзе ідзем на кампрамісы. Але калі дзяўчынка перакананая, што без фарбаваных валасоў яна не спадабаецца хлопчыку, то тут ужо маці варта задумацца, ці не транслюе яна дачцэ свае падсвядомыя комплексы? Трэба выпрацоўваць у дзіцяці з ранняга ўзросту крытычнае мысленне: а ці праўда гэта? Калі я паглядзела або паглядзеў тыя кадры, і ў мяне стала часцей біцца сэрца, знік добры настрой, з'явіўся страх — а ці трэба мне тое? Задача бацькоў — навучыць дзіця ўсведамляць свае эмоцыі, не дазваляць сябе атакоўваць звонку.



***— Цяпер гэта зрабіць вельмі цяжка, калі ідзе звышмаштабная «атака» на дзіцячую свядомасць. Тая ж тэма інтымнага жыцця… Калі ты не распавядзеш — аднакласнікі «адукуюць». Чаму так адбываецца?***

— Таму што гэта рэфлексы… У нас ёсць інстынкт выжывання, размнажэння. Гэта нейкія «кнопкі», якія заўсёды працуюць. Для чаго? Каб прасцей было кіраваць чалавекам, масамі. Таму трэба вучыць дзіця разумець, што адбываецца на самой справе. Што чалавек жыве не сам па сабе, а ў вялікім свеце, дзе шмат усяго і добрага, і дрэннага. Што існуюць сістэмы, і кожная спрабуе на яго ўплываць. І, вядома, я супраць таго, каб сямігадовае дзіця пасвячалі ў працэс зачацця з усімі фізіялагічнымі падрабязнасцямі. Хоць гэта агульная практыка. Але ў гэтым узросце дзяўчынкам хочацца гуляць з хлопчыкамі ў футбол, у лялькі. А тут раптам такое адкрыццё!.. Пачынаецца моцная псіхалагічная ломка. Ужо і тату свайго немагчыма нармальна ўспрымаць. Навошта гэта патрэбна?! Так, цяпер цяжка ўберагчы дзяцей ад медыязгвалтавання. Але ўсё ж трэба імкнуцца адцягнуць «момант ісціны» хоць бы да 9–10 гадоў.

***— Булінг, тролінг, мобінг… Чаму гэтыя з'явы, калі здзекваюцца з сабе падобных, сталі папулярнымі? Адкуль карані растуць?***

— Так праяўляецца каласальная ўнутраная незадаволенасць. І цяпер вы бачыце, колькі вакол нас недалюбёных людзей? Іх не любілі бацькі, магчыма, не любілі мужчыны і жанчыны. Бо ў стане любові чалавек не зайздросціць, у ім няма агрэсіі, злосці, нянавісці, страхаў… А калі гэта ўсё ёсць — дай толькі нагоду, каб сваю незадаволенасць выцiснуць з сябе. Так спрацоўвае кампенсаторыка. Мала таго, чалавек, не разумеючы, што з ім на самой справе адбываецца, можа нават заахвочваць у сабе негатыўныя праявы.



Ён можа быць перакананы, што аб'ектыўна мае рацыю. Але корань праблемы мы ўжо выявілі — недалюбілі яго… Бывае яшчэ ўсвядомленая гульня. Калі пазбаўленыя любові «марыянеткі» або «пешкі», як хочаце, думаюць, што дзейнічаюць у сваіх асабістых інтарэсах. І нават атрымліваюць ад гэтага задавальненне. Але трэба разумець: што праўда, што ілюзія. І гэтаму вучыць дзяцей. Ёсць, вядома, апрыёры злаславыя людзі. Але іх 1% на планеце. Усе астатнія такія — з-за выдаткаў выхавання, на жаль.

***— Я чула, што закладка характару і будучых паводніцкіх рэакцый адбываецца да 5 гадоў. Потым карэктаваць што-небудзь вельмі складана. Сумныя факты…***

— Усё папраўна! Акцэнтуйцеся на сваіх здольнасцях, талентах. Гэта тое, чаго заўсёды хоча ваша ўнутранае я. Самаразвівайцеся, тады ўнутры будзе моцны зарад любові, радасці, шчасця, падзякі ўсім і ўсяму за досвед, які набываеце па жыцці. Гэта самы верны спосаб сябе адрадзіць, захаваць. І цяжкі. Прызнаюся, тое, што я вам расказала, раней транслявала толькі блізкаму асяродку. Не была ўпэўненая, што грамадства гатова прыняць такую інфармацыю. Але калі наша сустрэча адбылася, то, напэўна, наспела ў тым сур'ёзная неабходнасць.

Гутарыла **Аліса Гюнгер**



# ПАРАДАК. БЯСПЕКА. ДОБРЫЯ ЛЮДЗІ...

**Былы масквіч, выпускнік МДІМА, кандыдат сельскагаспадарчых навук і па складзе розуму сістэмны аналітык Уладзімір Патакаў год таму пераехаў на сталае жыхарства ў Мінск. Не адзін — разам са сваёй шматдзетнай сям'ёй. Як жывецца грамадзянам Расіі ў Беларусі?**

Цнянскае вадасховішча з вышыні птушынага палёту

Мы пазнаёміліся з ім гады тры таму дзякуючы Людміле Дзёмінай, беларусцы з Тальяці. Кіраўніца Беларускай мясцовай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Нёман», як і створаны ёю ансамбль «Купалінка», удзельнічалі ў праектах Рускага культурнага цэнтра — яго ж у Тальяці стварыў, ім кіраваў Уладзімір Патакаў. У мінулым годзе Уладзімір Уладзіміравіч — ужо з Кіпра — напісаў мне: збіраецца пераехаць у Беларусь. І ўжо год Патакавы тут. Размаўляючы з Уладзімірам, я даведаўся, што рашэнне аб пераездзе было абсалютна прадуманым і ўзважаным. І знайшліся людзі, якія дапамаглі ўвасобіць думкі ў рэальнасць, у іх ліку — Людміла Іванаўна, разам з якой ён і пабываў у Мінску ў 2017-м. Прыязджаў, кажа, не толькі па працоўных пытаннях: зблізку паглядзець, як тут людзі жывуць. Да гэтага шмат чытаў, глядзеў: як тут усё ўладкована. А каб атрымаць больш поўнае ўражанне, «пагрузіўся» ў гэтае асяроддзе.

Што цікава: падштурхнулі сям'ю Патакавых да рашучых крокаў па пераездзе ў Беларусь маладыя людзі, якія з'ехалі са ЗША, пражыўшы там больш за 20 гадоў. Іх бацькі дзецьмі вывезлі. Там яны выраслі, вывучыліся на IT-спецыялістаў, пажаніліся, дзяцей нарадзілі — і адважыліся-такі, зазірнуўшы на Кіпр, вярнуцца на зямлю продкаў, у Беларусь. Казалі: у Амерыцы выхоўваць дзяцей так, як яны хочуць, ужо зусім немагчыма. Амаль аднachасова дзве сям'і апынуліся ў Мінску: амерыканцы і масквічы.

Уладзімір Патакаў — з сям'і патомных дыпламатаў, выпускнікоў МДІМА (Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін): там вучыліся яго дзед, бацька, маці. Праца ім таксама знаходзілася адпаведная, высокааплатная. Але калі Уладзімір з жонкай, аднакурсніцай, заканчвалі гэтую прэстыжную навучальную ўстанову на пачатку 2000-х, то Савецкага Саюза ўжо не было, паспяховы бізнес яго бацькі «оттиснули в 1995-м бандиты», а да таго ж бацькі яго разышліся. І Уладзіміру, які жыў тады ў бабулі, рана давялося сталець. Але праца ў прадстаўніцтве саліднай амерыканскай камерцыйнай фірмы, Міжнародным фондзе «Диалог цивилизаций», кіраўніком аддзела ў буйной гандлёвай сетцы «Бегемот» у Тальяці, кансультантам непасрэдна ў Алега Дзерыпаскі ў кампаніі «Русский алюминий» узбагацілі майго суразмоўцу неацэнным жыццёвым і прафесійным досведам. Да таго ж і вучоба ў гуртку расійскага тэарэтыка навукі, сацыёлага, палітолага і публіцыста Сяргея Кара-Мурзы (разам яны нават напісалі кнігу «Россия: точка 2010, образ будущего и путь к нему») дала свой плён.

І вось жыццё склалася так, што Уладзімір Патакаў і яго сям'я больш за год — у Мінску. І падалі ўжо дакументы на атрыманне беларускага грамадзянства.

***— Уладзімір, пераездам з Расіі ў Беларусь мала каго здзівіш, хоць***

***масквічы, мабыць, не часта расстаюцца са сталічнай прапіскай. А што вашым знаёмым у ЗША было не так?***

— Напружвалі, казалі, чыста пабытавыя пытанні. У іх добрая праца: абодва айцішнікі. Але там, кажуць, пайшла легалізацыя марыхуаны, наркотыкі выходзяць з-пад кантролю, і культура ў традыцыйным яе разуменні адсутнічае. Па родавых каранях Саша Рэзнік — украінец, жонка яго нарадзілася ў Беларусі. Так што культура ў іх у крыві: гэта людзі, як я кажу, з рускім культурным кодам. Заходні ўплыў на іх быў сур'ёзны ў плане прафесійным, а ўнутры яны засталіся цэльнымі. Разумеюць, што такое добра і што такое дрэнна. У іх трое дзяцей, і яны ясна ўбачылі: далей у Амерыцы ім дзяцей будзе выхоўваць цяжка. Вось яны праз Кіпр і вярталіся ў Беларусь. Аляксандр і Вольга купілі сабе ў Мінску дом. На Кіпры мы шмат з імі гутарылі. Паступова зразумелі: гэта ж і наш «беларускі» шанец, будзе за што тут зачапіцца. Ну хоць дзеці між сабой кантактаваць стануць на першым часе. Але я, прызнацца, яшчэ ў 2017-м зразумеў: канчатковым нашым «пунктам прызначэння» стане Мінск.

***— Вы тады казалі, што родавыя карані вашы па маме, магчыма, з Беларусі. Можа, гэта яны вас сюды й паклікалі?***

— Не выключаю і такое. Па-першае, маміна дзявочае прозвішча Булах тут пашырана. Па-другое, вёскі з аднакарэннымі назвамі ёсць. Цяпер я актыўна шукаю родавыя карані, апытваю сваякоў, прычым на дыктафон. Ведаю, што продак наш атрымаў дваранскі тытул за подзвігі пры абароне Севастопаля ў Крымскую вайну 1853–55 гадоў. У рэвалюцыйным часе трое братоў з роду ваявалі за белых, адзін — за чырвоных. І я нашчадак ягоны: Міхаіла Іванавіча Булаха. Ён стаў вялікім чалавекам пры савецкай уладзе: працаваў ва ўрадзе Масквы, адказваў за эканоміку сталіцы ў 20-я гады. А ў 37-м памёр ад сардэчнага прыступу — мабыць, чакаў арышту, таму што яму «пашчасціла» працаваць з Троцкім. Нашчадкі Міхаіла Іванавіча хуценька з'ехалі на Далёкі Усход. І таму дзед мой, Юрый Георгіевіч Булах, пастапац у МДІМА (46-ы ці 47-ы год) прыехаў ужо з Магадана. Ён-та і быў у ліку першых выпускнікоў МДІМА. Ну і гэтак далей.

***— А як атрымалася, што вы, карэнны масквіч, сталі кандыдатам сельскагаспадарчых навук?***

— Так жыццё склалася: у 2007-м я абараніў дысертацыю ў інстытуце пры Распатэнце: «Фарміраванне сістэмы ўкаранення біятэхналагічных інавацый у аграпрамысловы комплекс». Я пасля ВНУ, яшчэ да Міжнароднага фонду «Диалог цивилизаций», папрацаваў нядоўга ў адной амерыканскай фірме, якая гандлявала біятэхналагічнымі інавацыямі ў аграпрамысловым комплексе. Прадавала корм для жывёл. Праца была надзвычай цікавая, міжнароднага характару. Мне было 22 гады, узялі маркетолагам, прычым венгры: у іх цэнтральны офіс па Еўропе. У мяне англійская мова добрая, быў я малады — і мне даручылі арганізацыю замежных камандзіровак і паездкі разам з кіраўнікамі аграпрампрадпрыемстваў Расіі за мяжу. Семінары праводзіліся. Я бачыў, вывучыў, як арганізаваны гэты працэс — і напісаў кандыдацкую.

***— Яна вам дапамагае неяк рухацца па жыцці?***

— Усё, што мы ні робім у жыцці — мае наступствы. Думаю, ніводзін кандыдат не шкадуе, што выдаткаваў час на дысертацыю. Вось, напрыклад, пазней я пачаў супрацоўнічаць з Ціміразеўскай акадэміяй (Расійскім аграрным універсітэтам) — і мы з навукоўцамі гаворым на адной мове. Там ёсць лабараторыя, дзе вырошчваюць грыбы, выкарыстоўваючы ў тым ліку і генетыку. Інавацыйныя тэхналогіі, якія «выраслі» з мікрабіялагічнай прамысловасці СССР. Калі ўсё развалілася, то людзі навукі спрабавалі выжыць, нешта збераглі. Тое, што ўмелі-ведалі, змаглі камерцыялізаваць. Робяць сродак для павышэння ўраджайнасці. Калі ўносіш яго ў глебу, то за кошт падаўлення грыбамі шкоднай мікрафлоры каранёвая сістэма раслін лепш развіваецца. Усё проста: павышаецца імунітэт расліны. Такі грыб знішчае гніласныя бактэрыі, цвіль, якія могуць аслабляць яе. І расліна за кошт уласных сіл рэзка павялічвае свой патэнцыял. Вынікі вельмі сур'ёзныя: 18 адсоткаў прыросту ўраджайнасці мінімум. А ў некаторых цёплых абласцях і да 35! Я па пшаніцы кажу. Гэта вельмі цікава. Калі цяпер у Беларусі каля 8 мільёнаў тон збожжа збіраюць, то з нашым прэпаратам можна смела падыходзіць да 10-ці.



Уладзімір Патакаў

***— Мяркуючы па ўсім, вы гэтай тэмай цяпер і займаецеся?***

— Больш правільна будзе сказаць: у тым ліку і гэтай. Думаю, яна яшчэ знойдзе развіццё ў Беларусі.

***— З Кіпра вы пісалі: «У сярэдзіне 2017-га мне прыйшлося «саскочыць» са свайго бізнесу, бо кліенты амаль усе згалелі, я выйшаў у нуль. У плане эканомікі поўная нявыкрутка»…***

— Ну, 2017-ы яшчэ мы неяк перажылі. Тады я перабраўся ў Маскву і папрацаваў нават аналітыкам у фірме «Русский алюминий» у вядомага Алега Дзерыпаскі. Асабіста яго кансультаваў. І там, вядома ж, была нядрэнная зарплата. Але па шэрагу абставін мне і адтуль прыйшлося сысці. Мабыць, некаторым людзям здалося, што ранавата мне супакойвацца на дасягнутым — трэба далей рухацца. Або Усявышняму так было заўгодна… Карацей, я тады падумаў-падумаў — і вырашыў памяняць усё кардынальна. Так мы з'ехалі з сям'ёй у цёплы быццам бы край: на Кіпр, у горад Пафас. Прыгожа гучыць?

***— Нават пафасна, я б сказаў. Але чаму на Кіпр? І чаму край «быццам бы цёплы»? Вас там холадна сустрэлі? У пісьме адтуль вы пісалі:***

***«Але дзяцей трэба выхоўваць у нашых традыцыях. Так што маю задумку паспрабаваць падаць на беларускае грамадзянства».***

— Паехаць на Кіпр нам было прасцей за ўсё: там не патрэбна віза. З'ехалі, арандавалі дом і сталі жыць: каб паглядзець, што такое Кіпр знутры, што такое ўвогуле жыць за мяжой. Многія ж бо едуць летам адпачываць на Кіпр — і вяртаюцца адтуль у поўным захапленні. Падумваюць: вось бы нам там жыць, вось дзе рай зямны!

***— І я такіх ведаю!..***

— Але адна справа — на месяц, ды ў добрым гатэлі, і зусім іншая — круглы год пажыць там. Дзяцей у школу ўладкоўваеце, з мясцовымі маеце зносіны, грошы на жыццё зарабляеце ды ўсё такое іншае. Мы жылі ў Пафасе: паўднёвы захад краіны, вельмі добрае месца. Шматлікая і моцная руска-ўкраінская дыяспара. І праблем ва ўзаемадачыненнях няма: усе савецкія людзі, як я іх называю. Ды ўсё ж гэта была самая страшная зіма, якую ў сваім жыцці перажыў: зіма 2018–2019 гадоў. Дом вялікі — а кацёл стаяў проста на вуліцы: там дызпаліва спальваюць для абагравання. Я спецыяльна шукаў дом з батарэямі: каб цёпла было зімой, бо пяцёра ж дзяцей у нашай камандзе. Рамантавалі кацёл тыдні тры. Спец мне кажа: мінімум 20 еўра за ноч будзе ляцець. Я зрабіў тэставае ўключэнне — сышло 70 еўра. За ноч! Дом да холаду зусім не прыстасаваны. Купілі тэны электрычныя — мала дапамагалі. На вуліцы 6–10, да 12 градусаў, і ў доме не нашмат вышэй: ну як у халадзільніку. А ў нас дзеці, жанчыны. Грэкі-кіпрыёты, аднак, вялікія аптымісты. Холадна, кажу ім. А яны: ну выйдзі пагуляй… І гэта быў не жарт!

***— Вы тады з Рэзнікамі пазнаёміліся?***

— Мы паралельна з імі жылі. А суровая кіпрская зіма, вядома ж, паскорыла нашы працэсы мыслення. Мы цвёрда вырашылі з'язджаць. Рэзнікі дапамаглі ў Мінску знайсці дом у арэнду: я быў яшчэ там, а Саша яго нагледзеў. Фоткі адправіў. Мы прыехалі ў Мінск: 14 ліпеня спаўнілася год, як мы тут.

***— У мінскім жыцці знайшлі станоўчыя моманты?***

— Вядома. Прычым іх больш, чым адмоўных. Калі коратка, то гэта парадак, бяспека, экалогія. Прадказальнасць жыцця. Добрыя людзі. Апошняе, дарэчы, вельмі важна, таму што я пажыў ужо ў розных грамадствах. Тут ты ведаеш, чаго ад людзей чакаць. Вось мае хлопцы, скажам, цяпер самі ездзяць на ровары на футбол: у секцыі займаюцца. І старэйшыя дзяўчынкі на тралейбусе — па сваіх справах і занятках. Нашы дзеці — гэта Віка, ёй 14, Олі — 12, Сашу — 10, Сярожу — 7, а Лізе — 3. Дык вось, нават Сярожа сам на ровары ездзіць на футбол. А гэта трэба сесці, ехаць, цераз дарогу перайсці. Але я ведаю: з ім нічога не здарыцца. І гэта вельмі важна. У Расіі такое проста немагчыма. Кажу гэта з поўнай адказнасцю, бо працаваў і аналітыкам па пагрозах. І ведаю, што такое выкраданне дзяцей, выкуп і гэтак далей. Страшная рэч, не дай Бог! І яшчэ пра футбол. Малодшы наш займаецца бясплатна, а старэйшы за палову кошту: замест 120 рублёў у месяц плацім 60, паколькі Сяропка на добрым рахунку. Гэта прыватная школа, і там усё сур'ёзна. Хлопцаў рыхтуюць да міжнародных турніраў, выездаў за мяжу — толькі каранавірус планы каркэтуе.

***— А як з агульнаадукацыйнай школай?***

— Фармальна мы як расійскія грамадзяне прымацаваныя пакуль да расійскіх школ, вучымся па расійскай сістэме. Там ёсць Закон аб сямейнай адукацыі. Можна вучыцца так: займайся дома, прымацоўвайся да любой школы, і туды 2 разы на год прыходзь здаваць іспыты. Мы так і робім. У нас асноўныя грошы ідуць на адукацыю. Мы тут ходзім у школу: шматдзетныя сем'і нанялі настаўніка. З юрыдычнага пункту гледжання гэта як клуб па інтарэсах, так хадзілі Саша і Сяропка. З-за каранавіруса пачалі займацца дыстанцыйна. Санёк яшчэ іграе на фартэпіяна, ходзіць у музычную школу. І робіць поспехі. Нават пачаў музыку сам пісаць — на пачатковым этапе, але, спадзяюся, у яго вялікая будучыня. Оля нацэлілася на біялагічны факультэт БДУ.

***— І яшчэ, ведаю, Віка паступіла ў прэстыжны ліцэй Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.***

— Ужо вучыцца. Паспяхова здала фізіку і матэматыку, прайшла па конкурсе. Мы ў мінулым годзе хадзілі ў ліцэй БДУ: бо ёсць у Вікі дыплом аб заканчэнні 9 класаў, выдадзены Пасольствам Расіі на Кіпры. На сямейнай форме навучання Віка за год «здавала» па два класы, і ў 13 гадоў закончыла 9. А потым год нідзе не вучылася. У верасні 2019-га прыйшлі мы ў ліцэй БДУ навесці даведкі — а ў іх патрабаванне: атэстат павінны быць таго ж года, у які чалавек паступае. Мы зазірнулі ў Закон аб адукацыі — там такое не прапісана. Дайшлі да Мінадукацыі, запісаліся



Уладзімір Патакаў у стыле «рэтра»


Ліда — малодшая ў сям'і

на прыём. І спецыялістка займалася нашым пытаннем мінут 40. Нават дала свой мабільны тэлефон! Гэта ўвогуле нас пакарыла. Такое ў Расіі ў прынцыпе немагчыма. І наша праблема вырашылася: мы ўжо маглі ў 2020-м з дыпломам тым пастунаць у любую навучальную ўстанову. Што нам дапамагло і пры паступленні ў ліцэй БНТУ.

***— Як сябе адчувае ў Беларусі жонка?***

— Выдатна! Святлана Рыгораўна — чалавек сямейна арыентаваны. Яна, дарэчы, таксама закончыла МГІМО, і нават у яе была персанальная стыпендыя. Старэйшая за мяне на год, у Францыі стажыравалася, а калі вярнулася — патрапіла на мой курс. А ў выніку выбрала сям'ю. І што ў нас ёсць — гэта дзякуючы ёй. Асвоілася ў Мінску хутка, на Камароўку па прадукты ездзіць.

***— Якія вашы перспектывы і планы? Дзе збіраецеся прымяніць веды і досвед?***

— Планаў — шмат, ды каранавірус іх памяняў. Хацелі мы тут кампанію рэгістраваць па вытворчасці тых самых «ціміразеўскіх» грыбоў, вытворчасць у Беларусі размясціць. Ды вось — пандэмія, ізаляцыя. Хочам удзельнічаць у сельскагаспадарчых выставах. Прыглядаюся, прадумваю, прыкідваю. Як вядома, пераход на іншыя прадукты ў сельскай гаспадарцы — гэта заўсёды змена тэхналагічнага працэсу. Да таго ж прымяненне нашых біяпрэпаратаў прыводзіць да рэзкага зніжэння адсотка «хіміі» ў тэхпрацэсе. Выходзіць, мы ў кагосьці кавалак хлеба забіраць будзем. Але гэта — перспектыўны шлях, тыя самыя зялёныя тэхналогіі, на якія ў Беларусі арыентуюцца. Таму важна, каб інфармацыя аб нашым прадукце «авалодвала розумамі» ў тым ліку і высокіх чыноўнікаў, якія прымаюць рашэнні на дзяржузроўні.

***— Не сумна ў Мінску самаму старэйшаму члену сям'і — вашай бабулі Тамары Уладзіміраўне?***

— Ніколькі. Пашанцавала ёй з суседкай: Алене Нікіфараўне таксама 85, і яна таксама памятае вайну. Так што ў іх шмат тэм для размоў і магчымасцяў для зносін. Ды і дзеці нашы падраслі, яны шмат часу на вадасховішчы Цнянка праводзяць,



Патакавы на Дажынках у Беларусі



Святлана з Сашам: шчаслівая маці

якое ад нас блізка. Там ёсць веладарожкі, розныя атракцыёны, мангалы для сямейнага адпачынку ўстаноўлены, альтанкі. Гэта крута, як кажа моладзь! Мы там усе гуляем, сямейныя вячоркі пастаянна ладзім, робім шашлыкі.

***— І ўсё ж — пяцёра дзяцей! Прымацаваліся да нашых паліклінік ці карыстаецеся платнай медыцынай?***

— Прымацаваліся, і клопат беларускіх лекараў на сабе адчулі. Дарэчы, даводзілася мне чуць скаргі на чэргі ў беларускіх паліклініках. Але — усё пазнаецца ў параўнанні. Вось хто са скаржнікаў хоць краем вока бачыў, як ідуць справы, напрыклад, у Расіі, у іншых постсавецкіх краінах? З чым вы параўноўваеце, калі кажаце, што тут дрэнна? А я шчыра кажу: як у вас крута усё арганізавана! Калі што баліць — вам жа ёсць куды звярнуцца! А ў Расіі пасля рэформы пайсці проста няма куды. Мы ж усе замацаваныя за паліклінікай па месцы жыхарства.

***— На жаль, ёсць людзі, якім увогуле не падабаецца наша бясплатная медыцына…***

— І вельмі дарма! Вось ім бы паспрабаваць пахварэць там, дзе за ўсё трэба плаціць — тады хутка ў галаве ўсё стане на свае месцы. Дарэчы, я неяк з вялікай цікавасцю слухаў вялікае інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі радыёстанцыі «Эхо Москвы». І яшчэ раз пераканаўся: ён — разумны гаспадарнік. Як чалавек, які скончыў МДІМА і сёе-тое ў жыцці пабачыў, у тым ліку і палітычнае закулісце, хачу даць аматарам платнай медыцыны, наогул рынкавых адносінаў такую параду. Калі ў вас ёсць магчымасць выбіраць кіраўніка, то паміж фінансістам (ці, як іх цяпер называюць, эфектыўным менеджарам) і гаспадарнікам трэба заўсёды выбіраць гаспадарніка. Таму што ў яго проста хоць бы ёсць здаровы сэнс. А фінансіст што робіць? У яго эфектыўнасць — галоўнае. А хто не эфектыўны — тых у бок, тых выкараніць, закрыць…

***— Так, розныя бываюць падыходы да вырашэння сацыяльных, эканамічных праблем…***

— Вельмі розныя, нават супрацьлеглыя, сказаў бы. І, вядома ж, я азнаёміўся з праграмай аднаго з кандыдатаў у Прэзідэнты Беларусі, які пазіцыянуе сябе як эфектыўны менеджар. Там жа ўсё ясна. Першае, што зрабіў бы гэты чалавек, прыйшоўшы да ўлады, — запусціў бы маштабную праграму прыватызацыі. Думаеце, на карысць народа? Зусім не! Прыйшлі б алігархі з усходу і захаду — і канец беларускай эканоміцы. Я дакладна вас запэўніваю: адбылося б менавіта гэта.

***— Ды і мне здаецца, што спадзявацца на замежныя інвестыцыі,***

***багатых гаспадароў, якія з нас зробяць шчаслівых людзей — ілюзорна і нават глупства. Гэта свайго роду эканамічны, палітычны траянскі конь. Бо інвестары ідуць да нас не з праграмамі развіцця краіны, а са сваімі інтарэсамі. Па вялікім рахунку, няма ім аніякай справы да нашых праблем — да нашых старых, дзяцей, шматдзетных сем'яў, інвалідаў і гэтак далей. Ім проста трэба тут на нас зарабіць.***

— На пальцах, што называецца, раскажу. Чысты рынак — гэта Кіпр, выкажам такую здагадку, а «незразумелы рынак» — гэта Расія. А вось Беларусь — гэта народная гаспадарка. Менавіта да такога вызначэння бліжэй ваша мадэль. А гаспадарка ад рынку чым адрозніваецца? Гаспадарка забяспечвае існаванне, жыццё людзей. Калі гэта сямейная прысядзібная гаспадарка ў сельскай мясцовасці, то за кошт яе вядзення жыве сям'я, нават калі там і не ўсё эфектыўна. І народнай гаспадаркай можа быць уся краіна. А рынак нацэлены на прыбытак. Вось прынцыповая розніца. Добры прыклад я неяк даведаўся: Нарыльск у Расіі. На поўначы горад, адрэзаны ад вялікай зямлі. У савецкі час там была свая сельская гаспадарка! З пункту гледжання рынку — зусім бессэнсоўная: жудасна дарагая і выдатковая. Але з пункту гледжання гаспадарання забяспечвала яна мясцовых жыхароў ежай. І яшчэ прыклад, мінчанам больш блізкі. Мы хадзім у мінскі Палац дзяцей і моладзі, там з намі займаюцца выкладчыкі, майстры — а мы не плацім за тое ні капейкі. Караблікі будуем, у шахматы гуляем…

***— Там яшчэ і малююць, займаюцца лепкай, спяваюць, танчаць — шмат гурткоў і секцый для развіцця талентаў…***

— …А калі будзе рынак — тады што? Усе тыя паслугі стануць для бацькоў надзвычай дарагімі. Вось на Кіпры да нас прыходзіў выкладчык, займаўся музыкай з дзецьмі. Бралі з нас мала па тамтэйшых мерках: бо шматдзетная сям'я, руская абшчына. Занятак каштаваў 20 еўра, і доўжыўся 45 мінут. Гэта каб вам было наглядна і зразумела. Рынак адразу ж любую паслугу ператворыць у грошы, прычым большасць насельніцтва будзе ад тых паслуг адрэзана, у тым ліку і ад медыцыны. Цяпер беларуская медыцына лечыць, а вось рынкавая медыцына — залучае ў лячэнне. Яна зацікаўлена ў тым, каб вы лячыліся доўга і грунтоўна, выкладваючы за гэта добрыя грошы. Або адукацыю дзяцей возьмем. У рынкавым грамадстве адукаваныя людзі проста не патрэбныя! Таму што адукаваны чалавек менш купляе: на яго ж горш дзейнічае рэклама. Гэта не мае здагадкі, гэта даказалі швейцарскія навукоўцы, правёўшы даследаванні. Адзін з былых міністраў адукацыі Расіі яшчэ на пачатку 2000-х сказаў: нам патрэбныя спажыўцы — нам не патрэбен чалавек-творца. Вось што такое рынак! Таму калі вам распавядаюць пра інвестыцыі заходнія, іншую падобную туфту-лабуду — вы павінны разумець: яны пераследуюць свае інтарэсы.

***— Гэта значыць: мадэль гаспадаркі больш падыходзіць для жыцця, чым мадэль рынку?***

— У тым нават няма ніякіх сумневаў: мадэль гаспадаркі больш падыходная для жыцця і для развіцця як грамадства, так і асобных людзей. А рынак больш падыходзіць для тых, хто, груба кажучы, ужо ў тым рынку. Хто робіць бізнес. І, дарэчы, многія любяць казаць пра дэмакратыю як пра ўладу народа. Але варта нагадаць: калі зараджалася дэмакратыя, то народам лічыліся менавіта тыя людзі, у якіх была ўласнасць. А ўсе астатнія — гэта былі Бог ведае хто. Тыя, хто нічога не меў: рабы, плебс. Таму, калі нам кажуць, што дэмакратыя — гэта ўлада народа, то гэта хлусня. І мая парада беларусам: думаць, аналізаваць усё, што адбываецца. У вас выдатная сістэма народнай гаспадаркі…

***— У нас, Уладзімір Уладзіміравіч…***

— Так, у нас. Але ёсць і мінусы. Адзін з іх: актыўна ўкладваюцца намаганні ды сродкі ў развіццё экспарту — але не развіваецца ўнутранае спажыванне. Ці развіваецца

Вадасховішча Цнянка ў Мінску — любімае месца адпачынку сям'і Патакавых.
Непадалёк і дом, дзе яны цяпер жывуць.



недастаткова актыўна. Лічыцца, што ўзровень спажывання ў грамадстве павінен павышацца: за кошт стварэння новых працоўных месцаў ды іншых фактараў. Бо калі надараецца якая пературбацыі, то экспарт рэзка скарачаецца — а трэба выжываць: тавар прадаць, паслугі аказаць, каб грошы ішлі па крузе. Інакш вы залежыце ад тых, хто купляе вашу прадукцыю. Калі ў вас вялікі ўнутраны попыт, то ў вас большая прастора для манеўру.

***— Можа, наш унутраны рынак замалы? Я чуў аб разліках эканамістаў: каб гарманічна развівалася***



***эканоміка, кажуць, патрэбен рынак у 100–150 мільёнаў чалавек.***

— Ну, эканамісты розныя бываюць. А возьмем, скажам, Ліхтэнштэйн: там самы вялікі ВУП на душу насельніцтва, і людзі выдатна там, кажуць, жывуць. Так што размовы, што трэба абавязкова мець вялікі рынак — па меншай меры неаб'ектыўныя. Але паколькі ў свеце існуе канцэпцыя макрарэгіёнаў, то яе й лабіруюць розныя «адмыслоўцы» на розных узроўнях у інтарэсах шэрагу сусветных суб'ектаў. Якіх? Гэта і транснацыянальныя кампаніі, гэта й шэраг краін — ЗША, Кітай, Расія… А навукоўцам-эканамістам плацяць зарплату, і яны з натхненнем і стараннем «умозаключают» якраз тое, што ім скажуць.

***— Кажуць, што калі знешнія сілы дапамагалі развальваць Савецкі Саюз, то меркавалася, што праслойка з постсавецкіх краін — Украіна, Беларусь, краіны Прыбалтыкі — для заходняй і ўсходняй цывілізацый будзе нейкай «храстковай праслойкай». Каб не іскрыла на іх межах. І каб не было рэзкіх канфліктаў інтарэсаў. Такая ідэя нібыта закладвалася заходняй культурнай і палітычнай элітай. Меркавалася не паглынаць новыя незалежныя дзяржавы — дапамагаць ім развівацца…***

— Ой, вы сапраўды ў такое верыце? Я не згодны з такой канцэпцыяй. Жыццё паказвае, што па факце ўсё атрымліваецца не зусім так, як, можа, кімсьці задумана. Як толькі крыху аслабла дзяржава з «праслойкі» — яе тут жа паглынаюць: альбо з захаду, альбо з усходу. І гэта ўжо, дарэчы, было ў беларускай гісторыі. Жыццё дыктуе свае правілы, і захад дзейнічае па жорсткіх правілах. Пачытайце, што такое кольцы анаконды, або геапалітычная канцэпцыя Маккіндэра — і вам стане ўсё зразумела. Там ідэя такая: вашага палітычнага праціўніка трэба акружыць поясам нестабільнасці — і тая нестабільнасць, канфліктнасць увесь час будуць выцягваць з вашага ворага рэсурсы і сілы. З Кітаем робіцца менавіта так: «змяіная» тэхналогія праглядаецца. У дачыненні да яго ісламская дуга нестабільнасці была рэалізаваная. Колькі было каляровых рэвалюцый? Здаецца, 14. Паглядзіце, якую геапалітычную дугу ўтвараюць краіны, у якіх яны адбыліся.

***— Бачачы, як палітэліты Польшчы, Літвы, ды і Украіны рэагуюць на паслявыбарчыя падзеі ў Беларусі, міжволі ўспомніш і пра кольцы анаконды, і пра дугі нестабільнасці…***

— Але ўсё ж адчайвацца не варта! Я асабіста веру ў Беларусь — і таму я тут. А чаму веру? Самі беларусы могуць пра тое ня ведаць, але ў рускіх да Беларусі склалася ў наш час стаўленне не проста станоўчае — метафізічнае, я б сказаў. Беларусь для многіх рускіх людзей ўвасабляе вялікае мінулае: тое лепшае, што было ў савецкім мінулым. І што тэарэтычна можа быць у будучыні. Яно сёння — як вобраз — сканцэнтравана ў Беларусі. Бярэм беларускі герб — і бачым у ім пераемнасць з гербам савецкім. Рускія ведаюць: Беларусь — гэта асучасненая савецкая гаспадарка. З элементамі рынку, але тым не менш. І яшчэ. У свой час у Расіі жартавалі: калі б у Прэзідэнты маглі балатавацца не толькі грамадзяне Расіі — перамог бы Лукашэнка. І гэта ніякі не жарт! Вобраз Лукашэнкі — гэта вобраз чалавека-гаспадарніка. Беларусь можа прапанаваць Расіі той вобраз будучыні, які Расія сама ўсё ніяк не знойдзе.

***— Тое, што расіяне шукаюць, вы лічыце, ёсць ужо тут? Мне здаецца, у іх пакуль усё ж такі амбіцыі большыя, ці ж ім браць прыклад з Беларусі? Вунь жа пры выпадку некаторыя палітыкі самі не супраць павучыць Беларусь розуму…***

— Так, згодзен: у Расіі ўсяго многа. А ў Беларусі ёсць каласальны патэнцыял у вобразе будучыні, у сферы сэнсаў, культуры, адукацыі. А таксама іншых сферах. Калі б усё гэта ўвасобіць у Расіі — яны б маглі краіну пераўтварыць. На дадзеным этапе, што праўда, сама Беларусь не зможа ўвесь гэты свой патэнцыял рэалізаваць па адной прычыне: вы спрабуеце чэрпаць сваю нацыянальную ідэнтычнасць у мінулым. Ну зразумела: усе так робяць. А вось вобразу будучыні ў Беларусі я таксама не бачу, гэта неяк не адчуваецца. І як жа ісці наперад, калі не ўяўляеш нават, куды? Зразумела, што лепшая савецкая спадчына захавалася ў Беларусі — а ў Расіі не. Рускія людзі гэта добра разумеюць. Ёсць каштоўны прыклад, ёсць на што раўняцца. Толькі гэта будзе, вядома ж, не СССР версіі 2.0.

***— Дзякуй за шчырую размову, Уладзімір! Спадзяюся, Беларусь як месца для жыцця вас не расчаруе.***

Гутарыў Іван **Ждановіч**



# Мітрапаліт Алма-Ацінскі і Казахстанскі Іосіф нарадзіўся ў Магілёве

**Магчыма, і сённяшнія пакаленні беларусаў ці казахаў, увогуле жыхароў постсавецкіх краін, памятаюць фразу, якую сказаў адзін з праваслаўных святароў: «Юрый Гагарын у космас лятаў і Бога не бачыў... А Бог яго бачыў! І благаславіў!..» Гэта адбылося на службе ў праваслаўнай царкве, а словы належаць архіепіскапу Іосіфу (Чарнову Івану Міхайлавічу). Такое вось судакрананне веры і новых касмічных прастораў...**

Мітрапаліт Іосіф — наш зямляк. Нарадзіўся ў чэрвені 1893 года ў Магілёве, у сям'і вайскоўца звыштэрміновай службы. Бацька па веравызначчэнні належаў да старавераў. Быў хрышчоны ў палкавым храме, які, зразумела, знаходзіўся пад юрысдыкцыяй Свяцейшага Сінода. Вось што ўспамінаў святар пра сваё дзяцінства: «Я — сын роты, сын салдата. З рук на рукі, з рук на рукі. Ванюшка ды Ванюшка, Ваня ды Ваня. І ўсе афіцэры мяне ведалі. І камандзір палка мяне ведаў і падарункі мне заўсёды прывозіў у роту, калі прыязджаў наведваць яе…»

У 1910 годзе Іван паступіў у Бялыніцкі Раства-Багародзіцкі манастыр Магілёўскай епархіі. Быў келейнікам намесніка манастыра, архімандрыта (будучага епіскапа) Арсенія (Смалянца). А ў 1912 годзе стаў яго іпадыяканам. У 1912–1917 гг. Іван Чарноў — паслушнік Цвярскога Успенскага манастыра. У 1918 г. быў пастрыжаны ў манаства епіскапам Арсеніем (Смалянцом). З 1919 года — іерадыякан, з 1920 года — іераманах.

Служыў наш зямляк і ў Нікольскім храме Таганрога. Выступаў супраць абнаўленчага руху. У 1924 годзе ўзведзены ў сан ігумена.

Праз год Іосіф Чарноў быў арыштаваны, асуджаны да двух гадоў пазбаўлення свабоды. Знаходзіўся ў заключэнні ў вобласці Комі — у Кол-Ёле. Пасля вярнуўся ў Таганрог. З 1927 года — архімандрыт, быў эканомам архіерэйскага дома. 27 лістапада 1932 года святар быў хіратанісан ў епіскапа Таганрогскага, вікарыя Растоўскай епархіі. Чын хіратаніі ў Растоўскім кафедральным саборы здзейснілі архіепіскапы Дзмітраўскі Піцірым (Крылоў), кіраўнік справамі Свяцейшага Сінода, Растоўскі Нікалай (Амасійскі), Табольскі Назарый (Бліноў) і архіепіскап Аляксандр (Беразёр). З 16 лютага 1933 года новы епіскап кіраваў Данской і Навачаркаскай епархіяй.

У 1935 годзе — новы арышт. Асуджаны да пяці гадоў пазбаўлення волі — па абвінавачванні ў «антысавецкай агітацыі». У заключэнні наш зямляк на гэты раз знаходзіўся ў Комі АССР — Ухта-Іжэмскім лагеры. Роўна праз пяць гадоў Чарнова вызвалілі… Святар вярнуўся ў Таганрог. Пасля быў выселены ў Азоў.

У гэты перыяд ураджэнец Магілёва прымаў удзел у дзейнасці нелегальнай грамады вернікаў «Белы дом», службу вёў патаемна. Такі быў час… Ладзіў свяшчэнніцкія хіратоніі, манаскія пострыгі. Калі нямецка-фашысцкія захопнікі прыйшлі ў Таганрог, святар узнавіў службу ў якасці епіскапа Таганрогскага — са жніўня 1942 г. І хоць няпроста было пярэчыць гітлераўцам, Іосіф Чарноў адмовіўся ўдзельнічаць у прапагандысцкіх акцыях нацыстаў. А прапановы і даручэнні ішлі самыя розныя. І каб у нечым адмовіць гаспадарам «новага парадку», патрэбны былі надзвычайныя мужнасць і смеласць. Патрабавалі не ўспамінаць у час службы і мітрапаліта Сергія (Страгародскага), што таксама не было выканана. Мітрапаліт жа Сергій якраз восенню 1943 годзе быў абраны на Свяцейшым Сінодзе Патрыярхам. Іосіф Сталін, савецкі ўрад у складаных ваенных умовах узялі курс на адраджэнне праваслаўнай царквы… З гэтым працэсам праваслаўны люд Савецкай краіны атаясамляў і перамогу ў барацьбе з нямецкім фашызмам… У кастрычніку 1943 года І. Чарноў прыбыў у горад Умань. А 6 лістапада 1943 г. гестапаўцы арыштавалі святара. Абвінавацілі ў тым, што ён «…прысланы мітрапалітам Сергіем для работы на акупаванай тэрыторыі на карысць СССР». Акрамя таго, гітлераўцы выказалі падазрэнне ў тым, што Чарноў працуе на… англійскую разведку. Што ж, тут яны мала чым адрозніваліся ад сталінскай рэпрэсіўнай машыны. Не дзіва, калі б яны абвінавацілі святара, напрыклад, у працы на амерыканскую разведку альбо на якую іншую… Напрыклад, на японскую. Вызвалілі Іосіфа Чарнова 12 студзеня 1944 года.



Мітрапаліт Іосіф Чарноў у Сяміпалацінску (у цэнтры).1967 г.

Як толькі Чырвоная Армія прыйшла ў горад Умань, святар адправіўся ў Маскву для сустрэчы з Патрыярхам Сергіем. Але па дарозе быў арыштаваны ў Кіеве 4 чэрвеня 1944 г. Утрымлівалі нашага земляка ў Бутырскім астрозе ў Маскве, пасля перавялі ў Растоў-на-Доне. У лютым асудзілі да 10 гадоў пазбаўлення волі…

Патрапіў епіскап Таганрогскі ў Чалябінскі лагер асобага прызначэння. А з 1948 года быў пераведзены ў пасёлак Спаск Карагандзінскага лагера. Працаваў на будаўніцтве цагельні, быў санітарам. З 1954 года знаходзіўся ў высылцы ў пасёлку Ак-Кудук Чкалаўскага раёна Какчэтаўскай вобласці. І, нягледзячы на сталы ўзрост, святар быў вымушаны працаваць вадавозам. А ў 1956 годзе прыйшло вызваленне, якога ўжо не чакаў наш зямляк…



Мітрапаліт Іосіф з чацвераногімі сябрамі — Мужычком і Джэры. 1973 г.

Ён застаўся ў Казахстане. Служыў ў Міхаіла-Архангельскім храме Какчэтава. У хуткім часе прыйшло да святара яшчэ адно званне — ганаровы настаяцель Петрапаўлаўскага храма. У тым самым годзе І. Чарноў наведаў Маскву, Троіца-Сергіеву Лаўру, Таганрог і, канешне ж, родны Магілёў. Захаваліся сведчанні пра сустрэчу з епіскапам у адным з храмаў роднага горада: «… увесь горад прыйшоў паглядзець і памаліцца…»

З 25 лістапада 1956 года наш зямляк — епіскап Петрапаўлаўскі, вікарый Алма-Ацінскай епархіі. Меней як праз год, з 14 сакавіка 1957 года, епіскап Петрапаўлаўскі і Кустанайскі. У 1958 годзе святара ўзвялі ў сан архіепіскапа. З 28 верасня 1960 года ён — архіепіскап Алма-Ацінскі і Казахстанскі. У гэты час была зліквідавана Петрапаўлаўская епархія, а яе прыходы перадалі ў Алма-Ацінскую… З 25 лютага 1968 года новы сан у Чарнова — мітрапаліт. Між іншым, пасля смерці Патрыярха Алексія нашага земляка называлі яго пераемнікам. Але вядома, што ўраджэнец Магілёва адмовіўся ўдзельнічаць у выбарах на гэтае высокае іерархічнае месца…

Без некалькіх тыдняў 15 гадоў (!) адслужыў наш суайчыннік архіепіскапам Алма-Ацінскім і Казахстанскім. За гэты час і за тыя гады, калі ён вынес іншыя выпрабаванні ў Казахстане, ён зрадніўся з далёкай ад Беларусі старонкай, знайшоў там шмат блізкіх па праваслаўнай веры людзей…

Сяргей **Шычко**



Рэгуліроўшчык Марцін Балтоўскі

SB.BY




Начальнік вытворчасці Уладзімір Стасевіч

# МЕЛОДЫЯ Ў МАЖОРЫ

**Мы наведалі прадпрыемствы «Фабрыка фартэпіяна» і «Зонта», каб даведацца, як і колькі музычных інструментаў сёння вырабляецца ў нашай краіне**

## Справа ідзе як па нотах

Людзі старэйшага ўзросту добра памятаюць Барысаўскую фабрыку музычных інструментаў, якая выпускала да 2000 фартэпіяна ў месяц. Іх скуплялі па ўсім Савецкім Саюзе і не толькі. У 2006 годзе вытворчасць спынілі. Аднак па даручэнні Прэзідэнта яго адрадзілі. У Мінску была створана «Фабрыка фартэпіяна», дзе зноў выпускаюць інструменты пад звыклым брэндам «Беларусь».

— У нас працуюць 25 чалавек, — удакладняе дырэктар «Фабрыкі фартэпіяна» Рэната Мартыновіч. — У нашай краіне пакуль яшчэ няма вытворчасцяў, якія навучаюць вырабу фартэпіяна. Таму майстры самі выхоўваюць сабе змену — перадаюць досвед і навыкі. На адукацыю спецыяліста сыходзіць не менш за два гады.

Фабрыка выпускае класічныя акустычныя фартэпіяна. Ручная зборка, таму кожны інструмент з уласцівым толькі яму адценнем гучання. Кошт пытання — каля 9000 рублёў. Выраб пачынаецца са склейвання корпуса. Магутны прэс склейвае каркас будучага інструмента з драўніны елкі ды сасны. На барысаўскай фабрыцы на этап трацілі два дні, а цяпер — 20 мінут. Прагрэс! Корпус сабраны ідэальна, падагнаны з дакладнасцю да міліметра. Інакш інструмент не будзе правільна гучаць. Далей за справу бяруцца майстры. Збіраюць механіку. Напрыклад, устаўляюць грузікі ў клавішы — працэс узважвання. Па заканчэнні ўсёй зборкі на крайняй левай клавішы майстар пакідае сваё прозвішча. Наступны этап — абыгроўка інструмента. На аўтаматычнай машыне ў ізаляваным пакоі. 15 мінут яе «ігры» замяняюць паўгода рэальнай эксплуатацыі. Такі вось рэсурсны тэст.

Пасля зборкі і абыгроўкі ідзе наладка інструмента, чатыры разы. Адразу нельга наладзіць да патрэбнай часціні ў 442 герцы: лопнуць струны. Магутная чыгунная рама трымае нацяжэнне 222 струн, а гэта ціск да 16 тон. І, нарэшце, фінальная інтаніроўка: гэта каб фартэпіяна здабыло роўнае насычанае гучанне. Усяго ж на зборку кожнага інструмента сыходзіць два месяцы.

— У мінулым годзе мы выпусцілі 669 фартэпіяна, а ўжо сёлета ў першым паўгоддзі — 464 інструменты, — працягвае Рэната Мартыновіч.

Большая частка працы — ручная, з душой і ўвагай да дэталяў. Як, напрыклад, даводчык на вечку, каб яно не біла па пальцах. З такіх важных дробязяў і складаецца агульнае ўражанне аб вытворцы. Фінальная паліроўка і ўпакоўка. Прыгажуны ў чорным лаку, а хутка і ў белым, з ганарлівым надпісам «Беларусь» адпраўляюцца заказчыкам.



Музычны майстар Міхаіл Сіцько



Рэгуліроўшчыца музычных інструментаў Вольга Балтоўская



Зборшчыца язычковых інструментаў Таццяна Сарока

## Сабрана залатымі рукамі

На сустрэчы з творчай моладдзю два гады таму Прэзідэнту таксама паказалі магчымасці ўнікальнага электроннага мідзі-баяна, створанага ААТ «Зонта» ў Маладзечне. Баян здольны прайграваць гукі самых розных музычных інструментаў, выконваючы ролю своеасаблівага міні-аркестра.

Прадпрыемства «Зонта» выпускае баяны, гармонікі, акардэоны з 2006 года. Тут працуюць 25 чалавек, як і на «Фабрыцы фартэпіяна». Праўда, выпускаюць усё самі — ад ліста фанеры да гатовага інструмента. Нават самыя дробныя дэталі — рычагі, клапаны, кнопкі, штурхачы і спружынкі — робяць на «Зонта». Таму і маштабы вытворчасці куды больш сціплыя — каля 60 інструментаў у год.

У 2018-м, мяркуючы па заяўках ад музычных устаноў па ўсёй краіне, патрабавалася абнавіць больш за 600 адных толькі баянаў. На прадпрыемства пайшла плынь заказаў, прыйшлося нават пашырацца.

— Попыт і цяпер значна перавышае прапанову, бо стварыць інструмент — працаёмкі ручны працэс, — распавядае начальнік вытворчасці Уладзімір Стасевіч. — На выраб аднаго баяна патрабуецца тры месяцы. Інструменты вырабляем індывідуальна пад музыканта. У лінейцы па памерах тры тыпу баянаў: «піянер», «медыум» і «гранд». Яны адрозніваюцца адзін ад аднаго толькі зрэзаным дыяпазонам.

У Гродне «Зонта» закупляе скуру для рамянёў і фурнітуру. Латунь, дзюраль і алюміній таксама беларускія. Елка для рэзанансных частак інструментаў — з паўночных раёнаў краіны.

— Некаторыя дэталі і матэрыялы закупляем за мяжой, — працягвае Уладзімір Стасевіч. — Напрыклад, 2,2-міліметровую скуру на басовыя галасы — у Германіі, натуральны перламутр на кнопкі і цэлулоід — у Італіі, у Чэхіі — кускавую планку для камбінаванага акорда. У баяне 2000 дэталяў. Адных толькі галасавых планак каля 800 штук. Таму праца мясцовых майстроў падобна я да рамяства гадзіншчыкаў: філігранная зборка нават самых дробных механізмаў і вузлоў. Першы этап вытворчасці — падрыхтоўка, якую выконваюць токары і фрэзероўшчыкі. Затым ідзе зборка правага і левага клавіятурных механізмаў, кляпаюцца акорды. Далей майстры абклейваюць рэзанатар і мантуюць акорд. Корпус інструментаў не фарбуюць — абкладваюць цэлулоідам. Гэты матэрыял вымочваецца ў ацэтоне і адмысловым клеем мацуецца на корпус. Затым корпус паліруецца. Дадатковыя ўпрыгожванні — па гусце кліента. Напрыклад, «Харошкі» папрасілі нанесці назву ансамбля на мяхі гармоніка.

Наладчык — і зусім унікальны работнік: адзін на ўсю вытворчасць. Ён сточвае напайку на галасах. Робіць інтаніроўку. Адна планка гучыць ва ўнісон з цюнарам, а другая падвышаецца або паніжаецца — так нараджаюцца абертоны.

На фабрыцы таксама шыюць чахлы і рамяні для інструментаў, усталёўваюць мідзі-сістэмы. З такой сістэмай «Зонта» зрабіла баян для канцэртаў. Ён спалучае ў сабе восем інструментаў. Ёсць інструменты і з радыёмікрафонамі, што ловяць сігнал у радыусе да 80 метраў. Толькі прыкладна 5 працэнтаў кліентаў «Зонта» — фізічныя асобы. Цэны на гармонікі пачынаюцца ад 2500 рублёў, на баяны — ад 5000 рублёў, акардэоны — ад 8500 рублёў. Танней стварыць якасную рэч ручной працы проста немагчыма. Заказчыкі ёсць нават з Італіі, з радзімы акардэона. Замежным музыкам падабаецца гучанне нашага акорда, з непаўторнай усходнееўрапейскай афарбоўкай.

Ілья **Красоўскі.**
Фота **SB.BY.**

# ШЛЯХ ДА СЯБЕ

## Вялікі тэатр Беларусі адкрыў 88-ы сезон балетам «Пер Гюнт»



Пер Гюнт (Эвен Капітэн) і Сольвейг (Людміла Уланцава)



Пра тое, як у Вялікім чакалі адкрыцця, красамоўна гаварылі твары служыцеляў тэатра ў дзень прэм'еры.. Служба аховы, работнікі гардэроба, капельдынеры, прыхільнікі-балетаманы ў фае, у буфеце — усе ўсміхаліся. І хоць усмешкі многіх былі схаваныя пад маскамі, радасць выдавалі зіхатлівыя вочы. Свята! Больш за пяць месяцаў у сувязі з пандэміяй у Вялікім не было публікі. Мы, хто не прапускае ніводнай прэм'еры ў любімым тэатры, таксама засумавалі па яго цёплай святочнай атмасферы. І ў прадчуванні новага спектакля, пра які чулі яшчэ ранняй вясной, таксама знаходзіліся ў прыўзнятым настроі. На ўваходзе сустрэлі Сяргея Мухіна, начальніка службы папулярызацыі opэрнага і балетнага мастацтва. Павіншавалі з адкрыццём сезона. Вось ён якраз, падзякаваўшы, абмовіўся: маўляў, як жа мы ўсе стаміліся без сустрэч з вамі!..

Як выявіцца на сцэне Вялікага тэатра віртуальны свет, напоўнены фантастычнымі вобразамі скандынаўскай міфалогіі, які стварылі 145 гадоў таму драматург Генрык Ібсэн і кампазітар Эдвард Грыг, можна было толькі меркаваць. Яшчэ ў сакавіку мне давялося па БТ-1 паглядзець сюжэт, які апавядаў пра тое, што ў Вялікім тэатры ў артыстаў балета пачаліся першыя прагоны балета «Пер Гюнт». Прэм'ера чакалася на пачатку ліпеня. І ўжо ў той час мы ведалі, што ў спектаклі задзейнічаюць 4 склада артыстаў балета. Будуць, казалі, гучаць на нарвежскай мове яшчэ і салісты оперы і харавыя партыі. Абяцалі мінімум, як выказаўся харэограф-пастаноўшчык Сяргей Мікель, пальцавай тэхнікі. А вось як гаварыў у невялікім сюжэце аб працы свайго вучня Сяргея





Сцэны са спектакля

Мікеля, уладальніка Нацыянальнай тэатральнай прэміі, лаўрэата міжнародных конкурсаў, Валянцін Елізар'еў, народны артыст СССР, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі:

«Ён вучыўся, вельмі паслядоўна ішоў да мэты. Перш чым з'явіцца ў нас са сваёй задумай, ён паставіў, на мой погляд, два вельмі цікавыя спектаклі ў музычным тэатры (два дарослыя балеты — «Вішнёвы сад» і «Тытанік», а таксама спектакль для дзяцей «Джэймс і Персік-волат». — **Аўт.**), ну дадзім яму шанец. Я ўвогуле вельмі хачу вырасціць таленавітых беларусаў. Сяргей вельмі адказна ставіцца да пастаноўкі ў Вялікім тэатры, бо не кожнаму давярае. І я чакаю ад яго, як ад чалавека патэнцыйна таленавітага, цікавую працу». (https://www.tvr.by/)

Прывяду і словы мастака-пастаноўшчыка балета «Пер Гюнт» Любові Сідзельнікавай: «Трэба было знайсці такія вобразы, у якіх і касцюмы былі б сугучныя з нашым часам. Сказаць, што Пер Гюнт у нас быў такім вельмі гламурным, напэўна, нельга. Я думаю, што ён у асноўным будзе прыцягваць увагу гледачоў пластыкай і танцам, і сабой. Пераапранаецца герой тры-чатыры разы. Потым, Пер Гюнта пабачым і маладым, і сталым, праз 30–40 гадоў — задзейнічаем розных артыстаў. Мы так вырашылі, што гэта будзе больш праўдападобна».

Дарэчы, у спектаклі выкарыстоўваецца больш за 250 касцюмаў. Праца над імі вялася больш за паўгода. Можна толькі ўявіць, як магутна былі задзейнічаны ўсе вытворчыя цэхі Вялікага тэатра. Любоў Сідзельнікава стварыла нарвежскія нацыянальныя касцюмы, характэрныя для артыстаў народнага тэатра, а вось адзенне шахцёраў па рашэнні мастачкі нагадвае сучаснае, у ім мала што змянілася. Для салістаў оперы створаны вельмі прыгожыя галаўныя ўборы.

Дарэчы, Вялікі тэатр ужо звяртаўся да гэтага твора больш за 40 гадоў таму і ён захоўваўся ў рэпертуары да 1978 года.

Але гэта зусім іншая гісторыя, кажа Сяргей Мікель: «Мне ж хацелася актуалізаваць матэрыял, максімальна наблізіцца да жыцця, зразумелага сучаснаму гледачу. Сюжэт мне здаецца вельмі надзённым. У эпоху бязмежных магчымасцяў, калі практычна не існуе межаў для сваёй рэалізацыі, усё часцей і часцей чалавек шукае сябе, прычым шукае сябе сапраўднага…».

Што тычыцца музыкі, то Аляксандр Анісімаў, дырыжор-пастаноўшчык, прызнаўся, што быў захоплены гэтым творам не адзін год. Вось як ён пра тое казаў:

— Прыступаючы да праекту, я прапанаваў харэографу ўзяць за аснову не дзве папулярныя сюіты, а грунтавацца на поўнай партытуры музыкі Эдварда Грыга да драмы «Пер Гюнт». Яна ўключае каля паўтары гадзіны музыкі.

Пры гэтым, паводле словаў маэстра, ён не абмежаваўся толькі музыкай да драмы Ібсэна, а ўзяў і іншыя музычныя творы Грыга, у прыватнасці чатыры нарвежскія танцы, таксама выкарыстаў сімфанічныя танцы, лірычныя п'есы… Атрымаў музычны твор для двух актаў.

Творчы саюз маладога харэографа-пастаноўшчыка Сяргея Мікеля, мэтра — дырыжора-пастаноўшчыка народнага артыста Беларусі Аляксандра Анісімава і мастачкі-пастаноўшчыцы Любові Сідзельнікавай атрымаўся ўдалым. У п'есу Генрыка Ібсэна, створаную яшчэ ў 1867 годзе, на сцэне Вялікага тэатра ўдыхнулі новае жыццё. Мы



Яна Штангей — Анітра



Сольвейг і Пер Гюнт у сталым узросце (Ганна Фокіна і Антон Краўчанка)

паглядзелі вельмі відовішчны спектакль. Мае калегі ахрысцілі яго блокбастарам, які здольны да глыбіні душы ўразіць адчувальныя натуры. Прызнаюся, ёсць у гэтым вызначэнні штосьці правільнае. Балет не пакідае абыякавым. Эмоцыі ды пачуцці, якія валодаюць артыстамі, транслюцца ў залу. І іх ловіш, адгукаешся яшчэ і таму, што сюжэт захоплівае. Вось кароткі змест лібрэта, якое напісана па аднайменнай п'есе Ібсэна Сяргеем Мікелем, з якім можна азнаёміцца на сайце Вялікага тэатра. (https://bolshoibelarus.by/)

У Пралозе мы бачым пагоню. Паранены алень уцякае ад праследавання Гузічніка, майстра па пераплаўцы «нягодных» душ — тых, што не варты ні пекла, ні раю; душ тых, хто не імкнуўся да святасці, але і вялікіх пакасцяў не рабіў. Тут жа і знаёмімся з Пер Гюнтам. Ён — летуценнік, які прагне прыгод і захапляльных гісторый, ён і вандроўнік, які шукае славы і неўміручасці, нечага асаблівага. На самой справе гэта чалавек, які прайшоў усё жыццё, не дасягнуўшы сваіх мэтаў.

Гузічнік нагадвае Перу пра даўні абавязак — ён павінен аддаць сваю душу на пераплаўку: «Гузікам вылітым ты для камізэлькі сусветнай быў, але вось вушка зламалася, адскочыла, і трэба будзе табе быць здадзеным у лом, каб разам з іншымі быць пералітым». Пер Гюнт жа, гледзячы на сваё адлюстраванне ў возеры, бачыць сябе маладым і бесклапотным…

Першая дзея знаёміць нас з перасоўным тэатрам «Сурыя Мурыя», якія належаць Азэ (маці Пера), які прыязджае ў пасёлак Хэгстад. Акцёры тэатра разыгрываюць дзіўнае прадстаўленне, але яно перапынена выхадкай Пера: ён выкрадае Інгрыд, адну з артыстак тэатра. Ледзь астыўшы пасля бурнай сваркі з маці, Пер бачыць перасяленку Сольвейг і закохваецца ў яе. Аднак яго сэрца не знаходзіць спакою. Пер сустракаецца з Гузічнікам і, аддаўшыся фантазіям, пакідае блізкіх яму людзей.

Ганарыстасць прыводзіць героя ў карпарацыю троляў. Сустрэча з Горным каралём змяняе жыццё Пера, менавіта ад кіраўніка троляў ён дазнаецца праўду, якая вызначыць яго далейшы шлях: «Троль, будзь задаволены сабою самім!» Перу блізкія думкі троля, ён гатовы прыняць запрашэнне застацца і ўзяць за жонку Доўрскую дзеву, дачку караля і, незаўважна для сябе, цалкам трапляе ва ўладу троляў. Светлы вобраз маці, які ўзнікае раптам перад ім, ратуе Пера ад поўнага пераўтварэння ў троля. Ён вяртаецца да Сольвейг і на некаторы час набывае спакой. Ціхае адасобленае шчасце не доўжыцца доўга: Азэ памірае. Пер Гюнт не можа справіцца з пачуццём віны і зноў пакідае дом.

У другім дзеянні Пер адпраўляецца ў падарожжа па свеце. За гады падарожжаў ён прымярае на сябе мноства роляў. Кожнае новае рамяство ён урачыста абвяшчае доўгачаканай справай свайго жыцця, але прысвячае сябе яму толькі да моманту сутыкнення з цяжкасцямі. Ён шукае шчасця ў грошах, стаўшы дзялком-рабагандляром, ён узначальвае гандляроў кантрабанднай зброяй, спрабуе знайсці сябе ў гарачых танцах, спакушаючы бедуінку Анітру. Мазаіка роляў, якія мяняюцца, прыводзіць Пера ў вар'ятню, дзе яго наракаюць імператарам, надзеўшы на галаву карону з аленевых рагоў, а пасля выкідваюць на сметнік да бяздомных.

У канцы жыцця, апынуўшыся ў поўнай адзіноце, страціўшы становішча і грошы, Пер усведамляе пагрозу небыцця, «пераплаўлення» ў каўшы Гузічніка: «Жыццё тваё не ўдалося, пара на пераплаўку». У канцы жыцця ён ізноў адчайна шукае адказ на пытанне, што ж значыць быць самім сабой, і ці быў ён сабой?

Пер сустракае сівую Сольвейг — і толькі тады ўсведамляе, што ён выратаваны. Пад самымі разнастайнымі маскамі на працягу ўсяго яго стракатага жыцця ён заставаўся самім сабой толькі ў любові да Сольвейг, якая сваім каханнем яго ахоўвала.

Такім чынам, заслона адчыняецца. Знаёмства з Пер Гюнтам пачынаецца з масавай сцэны ва ўладаннях горна-

га караля. На сцэне вяршыцца містычнае дзейства: свет рэальны ўрываецца ў свет фантазійны, і наадварот. І пра тое, як яны пачынаюць узаемадзейнічаць, апавядае танец. Яго мова нам зразумелая. У цэнтры — Пер Гюнт, галоўны герой. У гэтай ролі — эфектны француз Эвен Капітэн, а далікатную і закаханую Сольвейг танцуе Людміла Уланцава. Дарэчы, у ролі вытанчанай, летуценнай Азэ, маці Пера Гюнта — Ірына Яромкіна, народная артыстка Беларусі, а Доўрскую Дзеву, дачку Горнага караля, іграе Аляксандра Чыжык, уладальніца медаля Францыска Скарыны. І ў гэтым балеце яна дэманструе свой высокі, зграбны і непараўнальны скачок. Зрэшты, як і ўлюбёнец публікі Такатошы Мачыяма, харызматычны і таленавіты лаўрэат міжнародных конкурсаў нам свой непараўнальны скачок таксама паказвае. Тэмпераментным, мудрагелістым Гузічнікам, пераплаўшчыкам душ паўстае ён на сцэне. Цудоўная і артыстычная ў ролі Анітры Яна Штангей, лаўрэат міжнародных конкурсаў, — кіраўніца бедуінаў. Яе яркі і гарачы танец не можа не запомніцца.

Сольвейг ва ўзросце танцуе Ганна Фокіна, уладальніца медаля Францыска Скарыны, сталага Пер Гюнта — Антон Краўчанка, заслужаны артыст Беларусі.

Вакалісты на сцэне спяваюць побач з артыстамі балета. Гэта стварае цікавы спектакль, які і не назавеш уласна балетам. Дарэчы, спяваюць салісты на нарвежскай мове. Ім, кажуць у тэатры, давялося старанна папрацаваць над вымаўленнем пад кіраўніцтвам прафесіяналаў з Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. Нібы сама душа Сольвейг гучыць у вакальнай партыі Алены Золавай на прэм'еры. Ну, а якасць харавога спеву ў Вялікім тэатры, як вядома, заўсёды на вышыні.

Не магу не згадаць і іншых выканаўцаў яркіх і выразных партый. Гэта «механізаваная» світа Гузічніка, так званыя Крывыя — Вераніка Аўчыннікава, Вераніка Алешчанка, Таццяна Уласень. Рухі іх завостраныя і вывераныя настолькі, што здаецца, нібыта перад намі робаты. У той жа стылістыцы працуе народны артыст Беларусі Ігар Артамонаў — Горны кароль, уладальнік карпарацыі троляў. Знаёмімся мы і з бацькамі, і з сястрой Сольвейг (Антон Краўчанка, Ганна Фокіна, Карына Малахоўская), з іншымі жыхарамі Хегстага, а таксама тролямі і троліцамі, акцёрамі перасоўнага тэатра, бедуінамі, пацыентамі ў вар'ятні, бяздомнымі на сметніку. У гэтым маштабным спектаклі, паўтаруся, занята некалькі складаў выканаўцаў.

Падарожжа Пера Гюнта ў пошуках свайго месца на зямлі ды ўласнага «я» суправаджаецца дынамічнай зменай сцэн і дэкарацый. Толькі што ён быў сярод горных ландшафтаў Нарвегіі і ля возера, ды ўжо апынуўся ў месцах пражывання троляў… А яшчэ з'яўляюцца вобразы вар'яцкага дома, звалкі, пустыні…

Праз шмат выпрабаванняў і спакусаў пройдзе Пер Гюнт, фантазёр, чалавек, які ўрэшце рэшт задумаецца пра свой лёс, каб зразумець у канцы жыцця: усё жыццё ён быў самім сабой у каханні да Сольвейг. Ён усвядоміць, што менавіта каханне Сольвейг было яму сапраўдным абярэгам ад усіх бед, якія яго напаткалі.

Што цікава, першапачатковa «Пер Гюнт», як і чэхаўская «Чайка», поспеху не меў і нават быў успрыняты ў Нарвегіі і Даніі досыць негатыўна. Вядомы казачнік Ганс-Хрысціян Андэрсэн назваў твор «цалкам бессэнсоўным». Аднак, як адзначае літаратурная крытыка, з часам, у асноўным дзякуючы вобразу Сольвейг, «пачалося пераасэнсаванне п'есы». Перш за ўсё, таму спрыяла хвалюючая музыка Эдварда Грыга, якая не страціла сваёй свежасці і сёння. Новыя годныя старонкі ў гісторыі існавання тварэння Грыга і Ібсэна цяпер увасоблены і таленавітымі беларускімі пастаноўшчыкамі. І «Пер Гюнт» Сяргея Мікеля — сапраўды ўдалы дэбют на сцэне Вялікага тэатра.

Валянціна **Ждановіч.**

Фота прадастаўлены Вялікім тэатрам Беларусі.

**Сяргей Мікель:**

***Мне хацелася актуалізаваць матэрыял, максімальна наблізіцца да жыцця, зразумелага сучаснаму гледачу. Сюжэт мне здаецца вельмі надзённым. У эпоху бязмежных магчымасцяў, калі практычна не існуе межаў для сваёй рэалізацыі, усё часцей і часцей чалавек шукае сябе, прычым шукае сябе сапраўднага…***



Прэм'ера «Пер Гюнт» у Вялікім тэатры Беларусі завяршылася авацыямі гледачоў. На авансцэне — харэограф-пастаноўшчык Сяргей Мікель.

Аляксей Дудараў



ІВАН ЖДАНОВІЧ

# МАЛАЯ РАДЗІМА

**Камедыя ў дзвюх дзеях**

**_ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ:_**

АТЭЛА — Ён
МАША — Яна
ГАБІ — Лялька

*Заканчэнне.*
*Пачатак у № 6.*

## Дзея другая

**Дзень чацвёрты**

Тая ж кватэра. У ёй гаспадарыць лялька Габі. Навальніца за вокнамі. З'яўляюцца АТЭЛА і МАША. Габі знікае.

МАША *(стрэсвае парасон.)* Жудасць! Усё перамяшалася… Зіма на носе… і на табе! Навальніца з дажджом.

АТЭЛА. Гэта ў гонар нашага вяселля.

МАША. Вяселле… Так, дарэчы, гані вясельны падарунак!

АТЭЛА. Што гнаць?

МАША. Падарунак. Жаніх нявесце абавязкова нешта падарыць павінен.

АТЭЛА. Вядома, вядома… *(рыецца ў сваім заплечніку.)*

МАША. У вас, можа, і не так, а ў нас…

АТЭЛА. І ў нас так. Вы — усюды.

МАША. Хто гэта «мы»?

АТЭЛА. Вы. *(Дастае з заплечніка кальцо.)* Гэта падыдзе?

МАША *(разглядае)*. Ну, хоць і не золата…

АТЭЛА. Гэта плаціна.

МАША. Нічога. І шкельцы прыгожыя.

АТЭЛА. Гэта брыльянты.

МАША. Ну, вядома, вядома брюлікі… Лепшыя сябры дзяўчат… І колькі гэтая прыгажосць каштуе?

АТЭЛА. Не ведаю. Мільёнаў пяць, мусіць…

МАША. Колькі?

АТЭЛА. Пяць мільёнаў.

МАША. Нашых?

АТЭЛА. Крыўдзіш.

МАША. Варожых?! Дык яны што, сапраўдныя?

АТЭЛА. Слухай. Цябе ў дзяцінстве білі?

МАША. Не.

АТЭЛА. Адчуваецца. Як я магу сваёй жонцы падарыць нешта несапраўднае?!

МАША. У мяне безыменны палец адваліцца… Пяць мільёнаў! Пяць мільёнаў!

АТЭЛА. Можа і больш.

МАША. Ну твой татка буго-о-ор… Каб так на хабарах разжыцца! За што ж яму столькі адшпільвалі?

АТЭЛА. Ты іншых спосабаў разжыцца, акрамя хабараў, не ведаеш?

МАША. Не-а…

АТЭЛА. У нашай сям'і шахта ва ўласнасці. У шахце здабываюць алмазы і плаціну.

МАША. Не слаба.

АТЭЛА. І, павер, шахцёры, якія іх здабываюць, ніколі пакрыўджанымі не былі. І ў мігранты не запісваліся.

МАША. Не дабівай мяне. А ў вашай Пехетэрыі Машу як называюць?

АТЭЛА. Марыя. Толькі не ў Пехетэры, а ў Ур-Лагаш!

МАША. Вядома, вядома… *(заспявала.)* Маша з Ур-Лагаша! З Ур-Лагаша Маша!

АТЭЛА. Спыніся!

МАША. Даруй. За сваё жыццё я забылася пра ўсё сапраўднае. Плаціна — гэта сапраўднае! І яна даражэй за золата. Я ўспомніла.

АТЭЛА. Даражэй — гэта дрэннае слова.

МАША. Я згодна. Ёсць нешта вышэй і плаціны, і золата, і Пехетэрыі…

АТЭЛА. Ур-Лагаш!

МАША. І Ур-Лагаша…

АТЭЛА. Вышэй Ур-Лагаша — не!

МАША. Ёсць!

АТЭЛА. Маўчы!

МАША. Я маўчу, але ты ж згодзен са мной. Бо згодны?

АТЭЛА. Згодны.

МАША. Тады скажы: што гэта.

АТЭЛА. Каханне.

МАША. Правільна! Правільна, родны… Цяпер ты запросіш мяне на танец.

АТЭЛА. Куды?

МАША. На вальс. Нявеста абавязкова павінна станцаваць вальс з жані-



Так можно вобразна праілюстраваць змест чарговай часткі камедыі

хом. Традыцыя такая. Зараз знайду што-небудзь адпаведнае.

МАША дастае мабільнік, уключае радыё на гучнагаварыцель, пераскоквае са станцыі на станцыю.

АТЭЛА. Пачакай! Пераключы на папярэднюю.

МАША. Ды ну іх! Усюды бардак.

АТЭЛА. Пераключы!

МАША. Калі ласка! *(пераключае.)*

РАДЫЁ. … аша. Як паведамляюць сусветныя агенцтвы, народ выспы, які паўстаў супраць ваеннай хунты, аднавіў манархію ў поўным аб'ёме. Рычард аль-Мабаба III разам з сям'ёй вярнуўся ў сталіцу Ур-Лагаша Хабанэра і адразу ж адрокся ад пасады на карысць свайго старэйшага сына Атэлы, які хаваецца дзесьці за мяжой…

МАША. О! У цябе нават цёзкі маюцца… І там Атэла.

АТЭЛА. Дай даслухаць!

РАДЫЁ. Ур-Лагаш па ўсім свеце шукае свайго новага кіраўніка…

МАША. Дык гэта ж…

АТЭЛА. Ты можаш памаўчаць?

РАДЫЁ. Былы манарх Ур-Лагаша звярнуўся да шматлікіх радыёстанцый з просьбай зачытаць у эфір яго зварот да сына. Мы цяпер і зробім гэта, захаваўшы стыль звароту: Сынок! Вярніся! Я стары і хворы чалавек. Мой час прайшоў, твой час надышоў. Калі Гасподзь не падорыць мне магчымасці цябе абняць, ведай, што я заўсёды любіў і шкадаваў цябе. І сышоў з прастолу таму, што мне не дазволілі дараваць тым, хто мне здрадзіў. Генерала Чомбэ пакаралі смерцю, нягледзячы на маю забарону. Цяпер вярхоўны кіраўнік Ур-Лагаша ты. Паслухай мой запавет: Гасподзь заўсёды адлюстроўвае нам тое, што мы пасылаем… Хто любіць — любімы будзе. Той, хто дарує — дараваны будзе. Той, хто ўкраў — абкрадзены будзе. Той, хто забіў — забіты будзе… І так да бясконцасці. І ва ўсе часы. Я загадаў пасляць самалёты ў тыя краіны, дзе ты можаш быць. Сынок! Вярніся! Вярніся і памятай: кароль — вышэй усякага шамана, а Бог — вышэй любога караля!

Музыка. АТЭЛА і МАША сядзяць аглушаныя.

МАША. Ну што, паехалі да брата мужа стрыечнай сястры пляменніцы маёй роднай цёткі.

АТЭЛА. Навошта?

МАША. Развенчвацца. Накшталт разводзіцца.

АТЭЛА. Навошта?

МАША. Ну, а навошта я табе?.. *(Здымае кальцо з пальца.)* На…

АТЭЛА. Та-ак, цябе дакладна ў дзяцінстве не білі.

МАША. Не білі.

АТЭЛА. І дарма. Калі б білі — ты б ведала, што сапраўдныя каралі не развенчваюцца!

МАША. А навошта я табе! Такая…

АТЭЛА. Я табе «навошта», а ты мне яшчэ больш «навошта». Уехала?

МАША. Дзякуй.

АТЭЛА. Надзень кальцо! Жыва!

МАША. Дзякуй. *(Надзявае кальцо.)* Та-ак… Толькі не смейся. Масюсей — была, Манькай — клікалі, Герлай — была, а вось прынцэсай — ніколі не была. Я ж цяпер прынцэса, паколькі твая жонка?

АТЭЛА. Не.

МАША. Чаму?

АТЭЛА. Я — кароль! Ты — мая жонка! Значыць, хто?

МАША. Ка-ра-ле-ва. Ушчыкні мяне.

АТЭЛА. Збірайся! У аэрапорце самалёт чакае.

МАША. Дык мне… А ў мяне візы няма!

АТЭЛА. Я думаю, што ўжо ёсць.

МАША. А ты мяне не кінеш?

АТЭЛА. Збірайся!

РАДЫЁ. Сынок! Вярніся! Сынок! Вярніся!

АТЭЛА. Хутчэй, ваша вялікасць!

МАША. Не здзеквайся!

АТЭЛА. Хто з цябе здзекуецца, дурнічка! Варушыся! На апошнюю электрычку спознімся.

МАША. Ну, якая я табе «ваша вялікасць»?

АТЭЛА. Цябе ўсе з гэтага часу будуць так зваць!

МАША. І ты?

АТЭЛА. І я.

МАША. Тады варушуся. Дзе гэта мае бігудзі? Я ж іх вось тут паклала! Ты не браў?





АТЭЛА. Яны выйшлі пагуляць, ваша вялікасць. Збірайцеся, збірайцеся.

МАША. Дзе ж я іх паклала? А, вось яны!

АТЭЛА выходзіць. МАША збірае рэчы.

З'яўляецца АТЭЛА. Ён вядзе за руку Габі.

АТЭЛА. Ты пра якуюсь ляльку ў мяне пыталася. Гэта не яна?

МАША. Габі! Дзяўчынка мая! Родная! *(Адымае ляльку.)* Я прыехала… Твая мамка прыехала па цябе. Дзе ты яе знайшоў?

АТЭЛА. За газавай плітой.

МАША. Правільна! Я ж сама там яе схавала, калі нас высялялі. І забыла! *(Лялцы.)* Твая матуля забылася, дзе цябе схавала, а дзядзька Атэла знайшоў. Маленькая мая, прыгажуня мая… Чакай, чакай… Ты ж сказаў, што ёй «чых-пых» зрабіў.

АТЭЛА. Гэта яна ці не яна?

МАША. Ты здзекуешся! Каб я і не пазнала сваю Габі! Вось трэшчынка на лакаточку, вось плечык абпалены.

АТЭЛА. Дык у чым справа?

МАША. Але ты ж «чых-пых» ладзіў лялцы?

АТЭЛА. Ладзіў. Але я з ёй не знаёміўся. Збірайся, Марыя…

МАША. Збірайцеся.

АТЭЛА. Ну, збірайцеся…

МАША. Зараз я маю дзяўчынку апрану, прычашу… Па дарозе на магілку да дзядулі зазірнем. Ваша вялікасць, мы ж міма могілак праходзіць будзем?

АТЭЛА. Вядома. Плыт за горкаю.

МАША. І ты скажаш дзядулі, што даравала сваю мамку за ўсё за ўсё… І што мамка больш ніколі не будзе засмучаць дзядулю і цябе, маё сонейка… І што твая мамка замуж выйшла… За добрага чалавека замуж выйшла, хоць гэты добры чалавек і кароль. І брыльянтаў цэлую шахту мае… Але гэта не галоўнае.

АТЭЛА. Ідзем, Марыя …

МАША. Ідзем, Габі …

Выходзяць.

**Эпілог**

Пусты салон борта № 1 каралеўства Ур-Лагаш. АТЭЛА і МАША сядзяць, прышпіленыя рамянямі бяспекі. ГАБІ бегае па салоне. Грукочуць турбіны.

МАША. А колькі цяпер да зямлі?

АТЭЛА. Не ведаю. Кіламетраў дванаццаць, пэўна…

МАША. І недзе там Драўлянск.

АТЭЛА. І недзе там Драўлянск.

МАША. А да космасу колькі?

АТЭЛА. А колькі хочаш. Нават любую ступень паставіць можна.

МАША. Аці, а ў нас будуць дзеці?

АТЭЛА. Вядома, будуць…

МАША. І многа?

АТЭЛА. Многа. Кіраўнікі павінны паказваць дэмаграфічны прыклад.

МАША. Толькі не смейся. Ты — цёмны, я — светлая… Раптам яны ў нас у палосачку атрымліваца будуць.

АТЭЛА. Як цяльняшкі?

МАША. Як цяльняшкі.

АТЭЛА. Марыя, ну які ж ты наіўны чалавек!

МАША. Ты мяне кахаеш?

АТЭЛА. Я цябе вельмі кахаю, Марыя… Я цябе вельмі кахаю, Маша…

МАША. Узаемна, ваша вялікасць.

АТЭЛА. Не плач. Усё будзе добра.

МАША. Усё будзе добра…

Заплюшчваюць вочы.

Габі *(спявае)*.

Метель ей пела песенку:
— Спи, Машенька, бай-бай!
Мороз снежком укутывал:
— Смотри, не замерзай!
Мороз снежком укутывал
— Смотри, не замерзай!

Грукочуць турбіны.

Зацямненне.



LIVEINTERNET.RU

Пераклад Валянціны **Ждановіч**

# СВЯТА НАРОДНАЕ, СВЯТА З ДУШОЙ

**Звыш 3 000 удзельнікаў і больш за 20 000 гасцей з Беларусі, Расіі, Украіны і Польшчы сабралася на V Міжнародным фестывалі этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» ў аграгарадку Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельшчыны**



У 2020-м гасцей чакалася больш, чым у мінулыя гады, але перашкодзіў каранавірус. Да прыкладу, у 2018 годзе на фэст «Покліч Палесся» прыехала 35 тысяч гасцей. Як паведамілі СМІ, актыўнасць гасцей замежных прыкметна знізілася. Але гэта не паўплывала на ўнікальнасць і каларыт адметнага свята Палесся.

Упершыню гасцямі «Поклічу Палесся» сталі дыпламаты з Арменіі, Азербайджана, Балгарыі, Ірана, Літвы, Пакістана, Палестыны, Расіі, Судана, Узбекістана. Напярэдадні падчас Дня гандлёвага саветніка яны вывучалі патэнцыял Прыпяцкага Палесся на Мазырскім эканамічным форуме.

— Я ўпершыню на Палессі. Фестываль дорыць добрыя ўражанні. Мы вельмі здзіўлены. Прыгожая прырода, добрыя людзі. Усё выдатна, — падзяліўся эмоцыямі дарадца па эканамічных сувязях Амбасады Судана ў Беларусі Алі Хасан.

За гэтыя гады палескі форум стаў адной з візітных картак краіны, падкрэсліў Міністр культуры Юрый Бондар:

— Вельмі рады, што ў культурным жыцці Беларусі ёсць такая яркая падзея, як «Покліч Палесся». З кожным годам форум развіваецца, яго праграма адкрывае самыя патаемныя куткі багатай беларускай культуры, якая з’яўляецца асновай нашай нацыянальнай ідэнтычнасці. Думаю, што ў гэтага фестывалю вялікая будучыня, бо сучасная моладзь шчыра цікавіцца сваёй гісторыяй, а менавіта тут — нашы карані.

Свята пачыналася з традыцыйнага прысваення на цэнтральнай сцэне званняў «Ганаровы паляшук». Сёлета



Прыгажосць сталых жанчын,
за плячыма якіх вялікі жыццёвы досвед, відавочная



Заспяваць песню, патанчыць пад гармонік з бубнам, ды яшчэ
ў народных строях — яскравая прыкмета фэсту «Покліч Палесся»



З вясёлай праграмай прыехалі ў братнюю Беларусь
артысты ўкраінскай групы «Лісапетни батальйон»

двое ўраджэнцаў Беларускага Палесся атрымалі бронзавыя статуэткі — кіраўнік заслужанага народнага ансамбля «Выцінанка» Столінскага дома культуры Пётр Астапчук і байдарачнік, алімпійскі чэмпіён, сяміразовы чэмпіён свету Раман Петрушэнка. У яго калекцыі — гэта незвычайная ўзнагарода, прызнаўся ён:

— Я ганаруся, што нарадзіўся і жыву на палескай зямлі. Мой родны горад — Калінкавічы, а працую ў суседнім Мазыры. Дзе б я ні быў, малая радзіма — заўсёды ў сэрцы. Нават адпачынак праводжу тут з вудай на возеры і, вядома, з роднымі людзьмі.

На сцэне фестывалю свае нумары прадстаўлялі Нацыянальны акадэмічны народны хор Беларусі імя Генадзя Цітовіча, заслужаны калектыў Беларусі ансамбль народнай музыкі «Бяседа», вакальны гурт «Чысты голас», фальклорны ансамбль славянскай песні «Збіцень», артысты Гомельскай абласной філармоніі, Гомельскі эстрадна-сімфанічны аркестр імя Юрыя Васілеўскага. Шмат яркіх момантаў падрыхтавалі артысты ўкраінскага гурта «Лісапетни батальйон».

Гасцям фестывалю прапаноўвалася пазнаёміцца з фантастычным і загадкавым светам нашых продкаў праз міфалогію вяскоўцаў Палесся. Так, на падворках з агульнай назвай «Таямніцы палешукоў» распавядалася аб міфалагічных персанажах, паказваліся інсцэніроўкі пра іх. Тэрасы-падворкі знаёмілі з міфалагічнымі ўяўленнямі як з культурнай з'явай і часткай гісторыі духоўнага жыцця народа. Удзельнікі і госці фестывалю маглі наведаць млын, дамы ткацтва, рыбака, паляўнічага, майстэрню ганчара, кафэ ў стылі народных традыцый.

На майстар-класы запрашала выстава-кірмаш «Рамесная слабада». Там расчынілі дзверы «Майстэрня ганчарства і кузня», «Майстэрня саломапляцення і ткацтва», «Майстэрня лозапляцення і бондарства», «Хата рыбака і паляўнічага».

Сёлета Ляскавічы па аднадушным меркаванні тых, хто прыязджаў на гэты фестываль і ў мінулыя гады, вельмі змяніліся. Да прыкладу, Аляксандр Клачко, пчаляр з Лельчыцкага раёна, прапаноўваючы ўсім, хто да яго падыходзіў, пакаштаваць духмяны палескі мёд, казаў:

— Ён чысты, лугавы ды лясны. Пачыналася тут усё проста на паляне, а цяпер можна праводзіць такія фестывалі і маштабныя канцэрты.

Тыя, хто прыехаў на фэст упершыню, шчыра захапляліся яго размахам. Вось што сказала мастак-афарміцель з Хойніцкага Дома культуры Таццяна Саханькова:

— Я шмат чула пра гэты фестываль, але сюды мяне ўзялі толькі сёлета як удзельніцу. Мы ўсіх запрашалі да сябе на падворак, каб пачаставаць Хойніцкімі прысмакамі, зачараваць нашым раёнам і запрасіць да сябе ў госці.

Побач з хойніцкімі ўдзельнікамі фестывалю — гасцінныя палешукі з усяго Петрыкаўскага раёна. І кожны наперабой імкнецца выказаць сваю радасць ад далучаннасці да свята.

— Я тут другі раз,— кажа Вольга Сілівонец, мастачка-пастаноўшчыца народнага тэатра ў Доме культуры гарадскога пасёлка Капаткевічы. — «Покліч Палесся» змяняецца кожны год. На гэты раз пляцоўка проста цудоўная!

Але самае важнае, што мы тут знаёмімся, заводзім новых сяброў. Гэта не толькі фестываль палескай культуры, але і сяброўства. Самае важнае — палеская самабытнасць.

А вось якое меркаванне выказаў вядомы на ўсё Палессе Васіль Казачок, ганчар з вёскі Гародная Столінскага раёна:

— Калі мы не будзем захоўваць свае карані, рамёствы, песні, абрады, касцюмы, мову, — кім мы будзем? Беларусамі? Палешукамі? У гэтым плане Палессе выткана з такіх каларытных культурных нітак, што страціць гэты ўнікальны свет для Беларусі, ды і для ўсёй Еўропы, недапушчальна. Таму такія фестывалі жыццёва неабходныя.

А разьбяр па дрэве, Аляксей Батан, чыімі скульптурамі немагчыма не залюбавацца, сказаў:

— І ў лыжцы, і ў статуі павінна быць душа. Калі яе не ўкладаеш, — выраб не ажывае, дрэва не аддае цяплыню. А ў нас тут найлепшыя месцы для натхнення… У Палесся ёсць свая душа — вялікая, старажытная. І калі яе зразумееш, то гэты край ніколі ўжо не разлюбіш.

Дарэчы, этнафестываль палескага жыцця аб'ядноўвае восем раёнаў Гомельшчыны (Мазырскі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Хойніцкі, Жыткавіцкі, Ельскі, Калінкавіцкі, Лельчыцкі) і тры раёны Брэстчыны (Столінскі, Лунінецкі і Пінскі). Сёлета да традыцыйных стылістычных падворкаў дадаліся цікавыя навінкі. Напрыклад, выступленне лялечных тэатраў-батлеек, якія зарадзіліся ў нашых краях яшчэ на пачатку XVI стагоддзя. Загадчыца Мікуліцскага дома культуры Надзея Гананайка (Ельскі раён) сцэнары лялечных спектакляў піша сама:

— Батлейка ў нас жыве ўжо другі год. Гэта самы распаўсюджаны калядны варыянт. Спектакль «Цар Ірад» апавядае пра нараджэнне дзіцяткі Ісуса і падзеі, звязаныя з тым. Дзецям, ды і дарослым вельмі падабаецца. Цяпер ужо гатовыя новыя фігуркі для спектакля «Пан і паненка», гэта будзе не рэлігійная, а сацыяльная гісторыя.

Можна было не толькі праходжвацца ўсюды, але і ўдзельнічаць у імпрэзах. Для гледачоў падрыхтавалі танцавальны сюрпрыз: навучанне рытмічным рухам з глыбіні стагоддзяў. На фестывалі прайшоў майстар-клас па вывучэнні старажытнага беларускага бытавога танца пад назвай «Лысы».

Увечары на галоўнай сцэне фестывалю прыгажуні з дзвюх абласцей спрачаліся за званне «Палеская Прыгажуня — 2020». Перамагла жыхарка Петрыкава Аляксандра Вобель. А завершылася гэтае свята вячэрнім шоу і святочным феерверкам.

Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся» — свята сапраўды народнае. Ён спрыяе захаванню і папулярызацыі этнакультурных традыцый, вывучэнню і падтрымцы багатай гістарычна-культурнай спадчыны, умацаванню творчых сувязяў памежных рэгіёнаў. А поспех фэсту, як выказаўся старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Салавей, вызначылі тры складніка — унікальная, цнатлівая прырода, найбагатая гістарычна-культурная спадчына і аўтэнтычныя народныя абрады і рамёствы. Плюс працавітасць, гасцінны характар палешукоў ды іх вялікія сэрцы, якія ўмеюць шчыра любіць і радавацца.

Міхаліна **Чаркашына.**

З выкарыстаннем матэрыялаў «СБ. Беларусь сегодня», БелТА.

Фота **БелТА.**



У адной з майстэрняў можна было пазнаёміцца са старажытным рамяством Беларусі: ткацтвам



Майстар лозапляцення Віктар Давідовіч



Усіх прыгажунь, якія перамаглі ў розных намінацыях, паяднала вялікая, святочная радасць



# ПОГЛЯД НА МАСТАЦТВА Ў КАНТЭКСЦЕ ЧАСУ

**З рэктарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхаілам Баразной даводзілася сустракацца нярэдка: то ў музеі на якім-небудзь мерапрыемстве ўбачымся, то ў галерэі на адкрыцці выставы перасячэмся. Як правіла, у большасці выпадкаў удаваўся дыялог, абменьваліся думкамі, хоць і коратка, з той ці іншай культурнай нагоды.**

На адной з такіх сустрэч і атрымаў ад рэктара запрашэнне пабываць непасрэдна ў Акадэміі. Прыехаць на свайго роду наваселле. Сутнасць у тым, што тут толькі што скончыўся маштабны рамонт-рэканструкцыя, які доўжыўся ні больш ні менш як з дзясятак гадоў. Помніцца ў жніўні 2012 года ў нас была грунтоўная прафесійная размова з рэктарам у сценах Акадэміі. Тады будаўнічая эпапея толькі разгортвалася і Міхаіл Баразна вымушаны быў, просячы прабачэння, перапыняць гутарку дзеля аператыўнага рашэння рознага роду гаспадарчых пытанняў.

Іншая справа цяпер. Нават знешне было выразна бачна тое, з якім натхненнем рэктар праводзіў экскурсію па абноўленай альма-матэр, дзе цяпер, сапраўды, ёсць выдатныя ўмовы для заняткаў студэнтам і для працы выкладчыкам. Нездарма партнёры з Масквы — з брэндавага інстытута кінематаграфіі — на цэлы тыдзень прыязджалі ў Мінск, каб адчуць тут, у сваіх беларускіх калег, выдатную атмасферу.

***З асаблівым гонарам Міхаіл Баразна паказваў тое, як гарманічна ўладкавалася ў абноўлены інтэр'ер творчасць студэнтаў Акадэміі***



З асаблівым гонарам Міхаіл Баразна паказваў тое, як гарманічна ўладкавалася ў абноўлены інтэр'ер творчасць студэнтаў Акадэміі. Распавядаў пра выпадак, як чарговыя замежныя госці захапляліся маляўнічымі творамі на сценах яго кабінета. Былі ўпэўнены, што яны выкананы сталымі аўтарамі. Якое ж было здзіўленне гасцей, калі рэктар удакладніў, што гэта ўсяго толькі працы студэнта-першакурсніка!..

Вось на такім спрыяльным фоне і праходзіла наша цяперашняя гутарка з рэктарам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

***— Якія, на ваш погляд, галоўныя падзеі апошніх дзесяці гадоў у жыцці Акадэміі?***

— Для калектыву Акадэміі галоўная падзея ў тым, што мы вярнуліся ў альма-матэр. Так, ёсць таксама падзеі з прафесійнага жыцця, якія не менш важныя. Да іх у першую чаргу варта аднесці наш удзел у выставе «Стужка часу» ў штаб-кватэры ААН у Жэневе. Яна праходзіла летась у красавіку на Вялікай выставачнай пляцоўцы — у памяшканні, дзе адлюстраваны не толькі характар дзейнасці ААН, але і сканцэнтраваны каласальныя калекцыі мастацтва. І на гэтай пляцоўцы мы мелі гонар зрабіць вялікую выставу-рэтраспекцыю, на якой прадэманстравалі работы выкладчыкаў і студэнтаў за некалькі дзесяцігоддзяў. У выніку там была прадстаўлена не толькі акадэмічная школа, але і тое, што можна назваць сучасным мастацтвам. Гэта і медыя-праекты, і мультыплікацыя, анімацыя, інсталяцыі, плакат і фатаграфія, эксперыментальныя працы. У адкрыцці выставы прымалі ўдзел Генеральны дырэктар ААН, Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, і рэктар,

***Цяпер інтэрнэт дазваляе аператыўна выкарыстоўваць самыя розныя інфармацыйныя рэсурсы. І Акадэмія дэманструе сваю талерантнасць да ўсяго, што ўваходзіць у межы нашай платформы каштоўнасцяў: гуманітарных, маральных.***







канешне ж, Акадэміі мастацтваў — на правах арганізатара экспазіцыі з беларускага боку. Гэтая падзея, напэўна, самая знакавая за апошнія гады, якая дазволіла нам убачыць рэтраспекцыі, дынаміку многіх працэсаў як у выяўленчым мастацтве, дызайне, так і ў развіцці самой філасофіі творчасці, якая культывуецца ў Акадэміі мастацтваў. Гэтая падзея, безумоўна, знакавая, яна сведчыць аб прызнанні нашай школы. Мы ўдзячныя беларускаму прадстаўніцтву ААН у Жэневе, самой штаб-кватэры за прадстаўленую магчымасць арганізаваць такую маштабную экспазіцыю.

***— Вы працуеце рэктарам ўжо 10 гадоў. Для вопыту — значны тэрмін. За гэты час адчулі, што рэктар — значная фігура ў Акадэміі?***

— Калі шчыра сказаць, то адчуў, што рэктар — такая ж адзінка, як усе. Як у дзейнасці любога экспертнага савета. Старшыня савета пры галасаванні мае толькі адзін голас. Але мае дзве магчымасці выступіць: у пачатку і ў канцы нарады. Таму ў яго большая прастора для нейкіх выказванняў. Але зноў жа, рэктар — толькі частка калектыва. Як ён сябе паводзіць — вось што самае галоўнае і самае важнае. У Акадэміі я працую з 2 верасня 1992 года. Гэта без студэнцкіх і аспіранцкіх гадоў. Таму ў мяне, з аднаго боку, нічога не змянілася, нават што тычыцца таго вопыту, калі я прыйшоў, і цяпер. З іншага боку — вельмі вялікі шлях. Не толькі гэтыя 10 гадоў, а і апошнія 20, 25. Велізарны шлях! Памятаю, якія былі раней навучальныя планы, праграмы, што чыталася на лекцыях, якая была аднастайнасць у патрабаваннях. Цяпер жа мы бачым шырокую панараму магчымасцяў для студэнтаў і выкладчыкаў: гаварыць на роднай мове, здзяйсняць творчыя здольнасці на мове мастацтва, адстойваць свае прынцыпы, свае погляды, нават свае філасофскія перакананні. Раней усё было абмежавана. А цяпер шмат што змянілася: з'явілася мабільнасць, ёсць розныя напрамкі дзейнасці для выкладчыкаў і студэнтаў, пастунае разнастайная інфармацыя. Калі раней з трапятаннем глядзелі нейкія дыфіцытныя каталогі, то цяпер інтэрнэт дазваляе аператыўна выкарыстоўваць самыя розныя інфармацыйныя рэсурсы. І Акадэмія дэманструе сваю талерантнасць да ўсяго, што ўваходзіць у межы нашай платформы каштоўнасцяў: гуманітарных, маральных. Таму я бачу добрую дынаміку магчымасцяў у творчасці, у педагагічным майстэрстве.

***— Вы ўжо адзначылі, што былі прадстаўлены ў міжнародным плане на высокай трыбуне ААН, калі так вобразна можна сказаць. Наогул, сутнасць сувязяў Акадэміі з іншымі арганізацыямі — яна істотная? У якой меры сёння патрэбныя такія камунікацыі для студэнтаў і выкладчыкаў?***

— Вельмі неабходныя, бо гэта частка нашай міжнароднай дзейнасці. Для жыцця гэта кардынальна важна, каб адчуваць сябе роўным ў сусветнай супольнасці, а часам і лідарам; каб мець дакладнае ўяўленне, дзе трэба ўдасканальвацца з улікам канкурэнцыі, напрыклад. Гэта адзін момант. Другі — выхаваўчая праца, ідэалагічная. Студэнты павінны ад-

чуваць, што яны далучаныя да вялізнай прасторы, а не абмежаваныя толькі сценамі альма-матэр. Яны, як і выкладчыкі, як і многія свабодныя творчыя людзі, павінны адчуваць сябе супольнасцю. Ёсць навуковыя кантакты для правядзення аналітычнай працы. А каб аналізаваць саміх сябе, заўсёды важны кантэкст, які не замыкаўся б толькі ўнутры мінскай кальцавой дарогі. Падкрэслю яшчэ раз, у нас вельмі шырокія кантакты ў навуковай сферы. Гэта, дарэчы, дапамагае ў адаптацыі і карэкцыі навучальных планаў. Мы пастаянна знаходзімся на сувязі з многімі кіраўнікамі і проста работнікамі ВНУ Усходняй Еўропы. Ды і не толькі гэтага рэгіёну. Гэта заўсёды цікава. Вобразна скажу, што Акадэмія па традыцыі фарміравалася праз палеміку. Напрыклад, у 50–60-ыя гады мінулага стагоддзя ў навучальнай установе, якая тады мела іншы статус, працавалі педагогі, якія прадстаўлялі зусім розныя школы: Кіева, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Львова, Прагі, Варшавы, Вільнюса. І менавіта ў палеміцы фарміравалася ні на што не падобная школа і тэатральнага мастацтва, і выяўленчага. Такая палеміка патрэбна і цяпер. Быць ў палемічным поле вельмі важна для развіцця. Гэта жыццёвая неабходнасць. Калі выкладчык, які атрымаў нейкі міжнародны прыз, пабываў за мяжой з майстар-класам або з выставай, вяртаецца сюды і дзеліцца вопытам са студэнтамі, я бачу бляск у вачах гэтага педагога і жаданне студэнтаў знайсці нейкі фарсаж у сабе.







***— Дарэчы, сёння ў Акадэміі ёсць замежныя студэнты?***

— Так. Іх панарама даволі цікавая. Ёсць студэнты са Злучаных Штатаў Амерыкі, якія навучаюцца на мастака кіно. Ёсць двое датчан. Адзін хлопец вучыцца на жывапісе. А дзяўчына — на графіцы. Гэта Мацільда Лутсан. Яна — адна з лідараў у нас, ведае, што беларуская школа графікі вельмі моцная. І на выставе «Стужка часу» ў Жэневе яна выстаўлялася разам з беларускімі студэнтамі. Я лічу, што гэта абсалютна правільна, калі ў Акадэміі ёсць такі інтэрнацыянальны склад. Вядома, у нас ёсць студэнты з Літвы, Расіі, Кітая. За апошнія дзесяцігоддзі, калі гэтую панараму паглядзець, то былі прадстаўнікі многіх краін.

***— Вы мяркуеце, што для іх гэта быў усвядомлены выбар — паступаць на вучобу менавіта ў Акадэмію мастацтваў у Мінску?***

— Безумоўна. Гэта звязана з тым, што з савецкага часу рэйтынг нашай Акадэміі, тады — тэатральна-мастацкага інстытута, вельмі высокі. І з тых часоў захавалася меркаванне, а хутчэй — перакананне, што тут школа з добрымі традыцыямі і методыкамі. Мы на сайце Акадэміі выкладваем шмат інфармацыі пра падзеі, якія адбываюцца ў нас. І многія бачаць, што гэта — выдатная пляцоўка для атрымання адукацыі. Упэўнены, быў бы ў нас інтэрнат большы — было б значна болей замежных студэнтаў.

***— А як яны зносяцца са сваімі беларускімі аднагодкамі? Камунікацыі ў іх ёсць? Ці замежныя студэнты замкнёна сябе паводзяць?***

— Яны такія ж як і нашы, такія ж таварыскія. Людзі мастацтва, дзе б яны не знаходзіліся, усе падобныя. І мастакі, і акцёры, як правіла, заўсёды таварыскія і шматслоўныя. Як ніхто разумеюць, што працаваць трэба засяроджана і шмат. Гэта, дарэчы, і патрабаванне нашай Акадэміі. Бо мы не дзеля таго, каб рамеснікаў рыхтаваць. Задачы, якія ў нас ставяцца, патрабуюць высокай канцэнтрацыі і сілы, здольнасцяў, часу. А моладзь — аднолькавая. Тым больш, што моўных, лінгвістычных праблем у іх цяпер няма.

***— Ахарактарызуйце выпускнікоў гэтага года?***



***Калі не знаходзішся ў творчым працэсе, цябе не разумее калектыў. Але я займаюся творчасцю не таму, каб дагадзіць свайму калектыву. Гэта мая творчая патрэба.***

— Год на год не падобны. Цудоўны выпуск тэатральнага факультэта. Лічу, што спектакль «А досвіткі тут ціхія» на беларускай мове — значнае дасягненне нашай тэатральнай школы. Цікавыя працы былі на факультэце экранных мастацтваў. Я магу шчыра сказаць, што кожны год праходзіць усё цікавей. Хоць сёлета для ўсіх быў неспакой: як пандэмія паўплывае на выніковасць, ці прынясе нейкі ўрон дыпломным работам… Але хачу сказаць: не, мы гэтага не заўважылі. Наадварот, на кафедры графікі, напрыклад, як ніколі былі проста цудоўныя працы. Што тычыцца манументальнага аддзялення, тут ярка выявілася асаблівасць апошніх гадоў: большасць работ накіраваны на афармленне самой Акадэміі. Мы за апошнія тры гады значна змянілі стэрыльны выгляд галаўнога офіса. Пасля рамонту ператварылі тутэйшае асяроддзе ў тое, што неабходна для выхавання мастакоў, акцёраў, рэжысёраў, аператараў. Мы насыцілі яе эстэтычнымі аб'ектамі — роспісамі, складанымі тэхналагічнымі матэрыяламі. Гэта вітражы, мазаікі. А яшчэ ёсць і інтэрнаты, якія таксама цікава аформленыя. Вазьму на сябе смеласць сказаць, што ні адзін інтэрнат у горадзе не мае такіх артэфактаў як нашы. Зрэшты, у нас ёсць вопыт, калі мы выконвалі заказы і для іншых рэгіёнаў Беларусі. Напрыклад, у адным з храмаў у Быхаўскім раёне Магілёўскай вобласці больш за 800 квадратных метраў роспісу рабіў Антон Бельскі па сваёй дыпломнай працы. У выніку атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта. У Валожынскім раёне Мінскай вобласці мазаічны алтар для праваслаўнага храма выконвала Паліна Амельяновіч. І таксама была адзначана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта. Але апошнія два гады мы сканцэнтраваны больш на самой Акадэміі. Не для рэкламы, хоць ёсць ахвочыя, якія просяць арганізаваць да нас экскурсіі. Але мы робім нешта ў афармленні перш за ўсё для саміх сябе. Бо падрыхтаваць спецыяліста для нас значыць і выхаваць яго. А выхаваць можна якім чынам? На кнігах, уласным прыкладам. Як і паказваць моц духу, рэвалюцыю творчасці, адлюстроўваючы час гэтага пакалення. І сваім стаўленнем да справы нашы студэнты даказваюць, што ім ёсць што абараніць у плане сваёй духоўнасці, свайго развіцця. Іх словы «Гэта мы зрабілі, гэта мы пакінулі!», лічу, лепшы вынік нашай выхаваўчай працы.

***— З сёлетняй уступнай кампаніяй якія надзеі звязваюць у Акадэміі?***

— Дзве важных падзеі каляндарнага года: набор і выпуск. Усё астатняе — штодзённая праца. Выпуск — вынік працы: выхаваўчай, навуковай, вучэбнай, метадычнай, творчай. А вось набор, з ім мы звязваем спадзяванні, што да нас прыйдуць таленавітыя асобы, тыя, хто зазззяе на небасхіле мастацтва і культуры не толькі Беларусі. Ёсць пэўныя ўмовы правядзення ўступнай кампаніі, калі ва ўсіх роўныя правы, дзе нішто нікому не перашкаджае раскрыцца. Ведаеце, практычна ўсе, хто сюды падае заяву, перакананыя, што гэта іх шлях у жыцці. А далей — як будзе…

***— Час на сваю творчасць у Вас застаецца?***

— Застаецца, вечарамі. У сутках жа 24 гадзіны. На працы я займаюся працай і думаю пра творчасць у долі секунды, хвіліны, у абедзенны час… Жыццё змушае больш актыўна займацца творчасцю ў адпачынку, у выхадны дзень ці ў позні час. А без гэтага, лічу, кіраўніку ў Акадэміі рабіць няма чаго. Калі не знаходзішся ў творчым працэсе, цябе не разумее калектыў. Але я займаюся творчасцю не таму, каб дагадзіць свайму калектыву. Гэта мая творчая патрэба.

***— Калі не сакрэт, цяпер над нейкім мастацтвазнаўчым праектам працуеце?***

— Так, над тэарэтычным праектам. Апошнія два гады працую над рукапісам, які тэарэтычны па сваім характары. Спадзяюся, што да канца года ён будзе завершаны. Гэта вельмі вялікі, 300-старонкавы ці больш, рукапіс. Напэўна, я ўжо падыйшоў да ўзросту, калі можна сабе дазволіць нешта «вяшчаць». Цікава, як крытыка ацэніць.

***Заканчэнне будзе.***

Веніямін **Міхееў.**

Фота аўтара.

ТАЦЦЯНА СТАРАЖЭНКА



Вераснёвая раніца ў Мінску

# КРАІНА
# У ЦЭНТРЫ ЕЎРОПЫ




**Часопіс для тых, хто жадае ведаць больш**



ISSN 0320-7544